# БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ АДЗЕННЕ

АКАДЭМІЯ НАВУК БССР
ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРУ

# БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ АДЗЕННЕ

Рэдактар
член-карэспандэнт АН БССР
В. К. БАНДАРЧЫК

ВЫДАВЕЦТВА «НАВУКА І ТЭХНІКА»
МІНСК 1975

902.7
Б43

Калектыў аўтараў:

Л. А. МАЛЧАНАВА, Г. М. КУРЫЛОВІЧ, В. М. БЯЛЯВІНА,
Г. І. ДУЛЕБА, Ю. Г. СЯРГЕЕНКА

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук В. У. Чапко,
кандыдат мастацтвазнаўства В. І. Смаль

Б43 **Беларускае** народнае адзенне. Мн., «Навука і тэхніка», 1975.
96 стар. з іл. (АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору). У перапл.

Кніга ўяўляе частку вялікай манаграфічнай працы «Рэгіянальны гісторыка-этнаграфічны атлас Украіны, Беларусі і Малдавіі». У ёй закартаграфаваны і апісаны ўсе асноўныя элементы адзення сельскага насельніцтва Беларусі сярэдзіны XIX — пачатку XX ст. Указаны асноўныя лакальныя асаблівасці. Асобны аглядны раздзел прысвечан сучаснаму адзенню. Кніга багата ілюстравана.— Бібліягр. у падрадк. заўвагах.

Б $\frac{0162\text{-}078}{\text{М}316\text{-}75}$ 51-74 902.7

© Выдавецтва «Навука і тэхніка», 1975.

# УВОДЗІНЫ

Адзенне — адна з важнейшых частак матэрыяльнай культуры, каштоўная крыніца для даследавання этнічнай гісторыі таго ці іншага народа. З'яўляючыся здабыткам агульначалавечай культуры, адзенне заўсёды адлюстроўвае канкрэтнае гісторыка-эканамічнае становішча народа.

Народнае адзенне шчыльна звязана з гісторыяй народа, з укладам яго жыцця, а таксама з прыроднымі і сацыяльнымі ўмовамі. На працягу стагоддзяў выпрацоўваліся найбольш мэтазгодныя тыпы адзення, якія адпавядалі характару заняткаў, быту і эстэтычным схільнасцям той ці іншай супольнасці людзей.

Хаця адзенне ў цэлым і не з'яўляецца застылай катэгорыяй і з развіццём грамадства пастаянна мяняецца, аднак яго крой, характар упрыгожанняў, тэрміналогія вельмі ўстойлівыя. Гэта ўстойлівасць дазваляе выкарыстоўваць адзенне для высвятлення ўзаемаўплываў паміж народамі ад старажытнасці да цяперашняга часу.

Значэнне народнага адзення як крыніцы для вывучэння этнічнай гісторыі і ўзаемасувязей народаў адзначалі шмат даследчыкаў гэтай праблемы ў нашай краіне і за мяжой. Але каб падысці да такога пункту погляду на адзенне, этнаграфічная навука прайшла доўгі і супярэчлівы шлях.

Найбольш грунтоўныя даследаванні па народнаму адзенню пачалі з'яўляцца ў канцы XIX і ў асноўным у XX ст.

Да гэтага часу звесткі аб народным адзенні наогул і аб беларускім у прыватнасці былі раскіданы па шматлікіх артыкулах, зборніках і дакументах.

Найбольш раннія звесткі аб беларускім народным адзенні адносяцца да XVI ст. У «Статуце Літоўскім» (1588) пералічваюцца некаторыя прадметы верхняга адзення (сярмягі, футры), галаўныя ўборы (наміткі) і інш.[1]

[1] Н. Горбачевский. Словарь древнего актового языка Северо-Западного края и царства Польского. Вильна, 1874.

У некаторых судовых актах, актах па падзелу маёмасці, завяшчаннях і іншых дакументах XVI—XVII стст., апублікаваных у шматтомных выданнях Віленскай археаграфічнай камісіі, маюцца звесткі аб асобных прадметах касцюма феадалаў і гараджан, а ў радзе выпадкаў і сялян[2]. Так, напрыклад, у «Перачні» спусташэнняў у маёнтку Давыд-Гарадок у 1665 г. гаворыцца: «Подданным жито на полях жать не допускали, коней, волов, семена жита целиком брали, сошники с сох снимали, сермяги с подданных, на дороге встретивши и в поле заставши, сдирали»[3].

Цікавыя звесткі аб адзенні можна знайсці ў таможных кнігах беларускіх гарадоў: Брэста, Магілёва, Віцебска і інш.[4]

Помнікі беларускай пісьменнасці XVI—XVII стст. таксама з'яўляюцца каштоўнай крыніцай пры вывучэнні адзення, таму што іменна ў гэты перыяд сфарміраваліся многія асаблівасці беларускага народнага адзення.

У канцы XVIII ст. выходзяць у свет спецыяльныя працы, дзе апісваецца быт усіх народаў, якія пражываюць у Расіі. У вялікай працы І. Георгі ёсць малюнак і беларускага касцюма, па якому можна скласці агульнае ўяўленне аб комплексе адзення таго часу на Магілёўшчыне[5].

Значныя матэрыялы па беларускаму адзенню публікаваліся ў розных польскіх выданнях. У сярэдзіне XIX ст. убачыла свет кніга Е. Тышкевіча «Апісанне Барысаўскага павета»[6]. Гэта кніга аказала значны ўплыў на наступныя работы этнаграфічнага плана па Беларусі. У XIX ст.

[2] АВАК, тт. I—XXXIX. Вільна, 1869—1915 гг.

[3] Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов, т. XXXIV. Вільна, 1909, стар. 399.

[4] Н. Н. Улащик. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии. М., 1973; У. Краснянскі. Віцебскі гандаль у 1605 г. Працы клясы гісторыі, т. II. Менск, 1928.

[5] И. Георги. Описание всех обитающих в Российском государстве народов, изд. 2-е. СПб, 1799.

[6] E. Tyszkiewicz. Opisanie powiatu Borisowskiego. Wilno, 1847.

быў сабран значны матэрыял па этнаграфіі наогул і па народнаму адзенню ў прыватнасці.

Сістэматычнае збіранне этнаграфічных матэрыялаў, у тым ліку і па адзенню, пачынаецца з часу заснавання Рускага геаграфічнага таварыства. У 1847 г. таварыства распрацавала спецыяльную праграму і разаслала яе па ўсёй Расіі. Геаграфічнае таварыства ўзяло на сябе таксама навуковую апрацоўку і публікацыю сабраных звестак. Найбольш цікавыя матэрыялы былі змешчаны ў першых трох выпусках «Этнаграфічнага зборніка» — друкаванага органа геаграфічнага таварыства [7]. Тут знаходзяцца цікавыя звесткі аб адзенні многіх беларускіх паветаў. Адказы на анкету, падрыхтаваную і разасланую Рускім геаграфічным таварыствам, захоўваюцца і ў архіве таварыства. У іх таксама змяшчаюцца каштоўныя звесткі, толькі, на жаль, у большасці выпадкаў яны вельмі кароткія і не даюць магчымасці ўявіць крой, расфарбоўку тканіны і характар упрыгожанняў касцюма.

Звесткі па беларускаму адзенню сярэдзіны XIX ст. маюцца ў апісаннях афіцэраў Генеральнага штаба. Цікавыя матэрыялы па адзенню Гродзенскай губерні прыводзяцца П. Баброўскім [8]. Яны адлюстроўваюць мясцовую спецыфіку, а таксама своеасаблівасці ў адзенні розных сацыяльных груп Гродзеншчыны.

Значныя матэрыялы па адзенню былі сабраны ў 60-х гадах XIX ст. для антрапалагічнай выстаўкі (1867), арганізаванай Таварыствам аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі. Апісанні, прысланыя ў гэта таварыства ў адказ на праграму, распрацаваную пад кіраўніцтвам В. Ф. Мілера і разасланую ў 90-х гадах, змяшчаюць карысныя звесткі па агульнай тыпалогіі беларускага народнага адзення.

Шмат звестак пра народнае адзенне змешчана ў радзе этнаграфічных прац другой палавіны XIX і пачатку XX ст., якія ўяўляюць сабой апісанне асобных вёсак, раёнаў, вялікіх абласцей [9]. Цікавыя звесткі па адзенню ў розных месцах Беларусі парэформеннага перыяду абагульнены ў капітальных працах П. В. Шэйна, М. Я. Нікіфароўскага, Е. Р. Раманава [10].

Адзенне рада палескіх вёсак Беларусі апісана ў манаграфіях І. А. Сербава [11] і ў артыкулах, змешчаных на старонках перыядычных польскіх выданняў [12].

У канцы XIX — пачатку XX ст. у Расіі разгарнулася работа па збору музейных экспанатаў. Складаюцца спецыяльныя праграмы, публікуюцца каталогі. Асаблівая цікавасць праяўляецца да народнага адзення. На падставе этнаграфічных экспанатаў выстаўкі 1867 г. у Маскве з'явілася праца В. Ф. Мілера, у якой даецца апісанне адзення ўсходнеславянскіх народаў [13].

Ужо ў перадрэвалюцыйныя гады па народнаму адзенню быў сабран багаты рэчавы матэрыял, які зараз з'яўляецца унікальнай крыніцай для вывучэння народнага адзення. Тут у першую чаргу трэба адзначыць значныя калекцыі па беларускаму народнаму адзенню, сабраныя выдатнымі беларускімі этнографамі Е. Р. Раманавым, А. К. Сержпутоўскім і іншымі збіральнікамі. Большасць гэтых калекцый захоўваецца цяпер у Дзяржаўным музеі этнаграфіі народаў СССР у Ленінградзе — буйнейшым сховішчы прадметаў быту народаў нашай краіны.

Дарэвалюцыйныя калекцыі гэтага музея былі значна папоўнены беларускімі экспанатамі ў савецкі час. Каштоўныя калекцыі па беларускаму традыцыйнаму адзенню сабраны Г. Я. Дуйсбург, А. С. Бяжковічам і інш. Мэтанакіраваны збор рэчавага матэрыялу па народнаму адзенню праводзіўся беларускімі гісторыка-краязнаўчымі музеямі, якія існуюць у многіх гарадах рэспублікі.

Усе сабраныя матэрыялы выкарыстоўваюцца ў дадзеным даследаванні. Выкарыстоўваліся яны і ў буйных даследаваннях, якія ўбачылі

[7] Н. Анимелле. Быт белорусских крестьян. Этнографический сборник, вып. 1. СПб, 1853 і інш.

[8] П. Бобровский. Гродненская губерния. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. СПб, 1862.

[9] И. Эремич. Очерки белорусского Полесья. «Вестник Западной России», кн. 8—11. Вильна, 1867; Н. Янчук. По Минской губернии. Труды этнограф. отд. имп. Общества любителей естествознания, антропологии и этнографии, т. II. М., 1889; С. Карский. Внешний вид белорусов в Виленской губернии. «Виленский вестник», 1891, № 64; Село Ляховцы Брестского уезда. «Гродненские губернские ведомости», 1891, № 73, 75, 77; Краткое описание села Ятвеска Гродненской губ. Волковысского у. «Гродненские губернские ведомости», 1891, № 15—17; С. Л. Шляхта-Мазуры. Этнографический очерк. «Гродненские губернские ведомости», 1892, № 66, 67, 73, 74 і інш.

[10] П. В. Шейн. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. III. СПб, 1902; Н. Я. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии. Витебск, 1895; Е. Р. Романов. Белорусский сборник, вып. 8. Вильна, 1912.

[11] И. А. Сербов. Белорусы-сакуны. Сб. ОРЯС, т. 94, № 1. Пг., 1915; яго ж. Вічынскія паляне. Мінск, 1928.

[12] J. Smoliński. Kaptur i namiotka na Białorusi Litewskiej. «Ziemia», 1911, N 9; E. Jeleńska. Wieś Kamarowicze w powiece Mozyrskim. «Wisła», t. V, ks. I—II інш.

[13] В. Ф. Миллер. Систематическое описание коллекций Дашковского этнографического музея. М., 1890.




Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел БССР

свет у канцы XIX і XX ст. Аднак недастатковая вывучанасць матэрыялаў абумовіла фармалістычны падыход некаторых аўтараў да гэтага пытання. Адзенне разглядалася статычна, без уліку канкрэтных сацыяльна-бытавых умоў і сацыяльнай дыферэнцыяцыі насельніцтва. Нават у працах, у якіх народнае адзенне ацэньвалася як каштоўная крыніца для этнагенетычных вывадаў, яно разглядалася ў адрыве ад рэальнай рэчаіснасці.

У савецкі час была распрацавана адзіная метадалогія вывучэння народнага адзення, якая асноўваецца на прынцыпах гістарычнага матэрыялізму.

Пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі побач з асобнымі апісаннямі адзення ўсходніх славян з'яўляюцца спецыяльныя даследаванні, у якіх адзенне разглядаецца як адна з важнейшых крыніц пры вывучэнні этнічнай гісторыі народа [14].

Д. К. Зяленін адным з першых выкарыстаў матэрыялы па народнаму адзенню ўсходнеславянскіх народаў у якасці крыніцы для даследавання іх этнічнай гісторыі. Д. К. Зяленін у сваіх даследаваннях абапіраўся на канкрэтныя, добра дакументаваныя матэрыялы. Ён распрацаваў падрабязную класіфікацыю адзення, у аснову якой паклаў найбольш тыповыя адзнакі той ці іншай рэчы [15]. Параўнаўча-этнаграфіч-

[14] Б. А. Куфтин. Материальная культура русской мещеры, ч. 1. М., 1926; Н. И. Лебедева. Народный быт в верховьях Десны и верховьях Оки. М., 1927 і інш.

[15] Д. Зеленин. Женские головные уборы восточных (русских) славян. «Slavia», 1926, № 2; яго ж. Об исторической общности культуры русского и украинского народов. «Советская этнография», 1940, № 3 і інш.

ная методыка Д. К. Зяленіна ў далейшым развівалася і ўдасканальвалася ў працах сучасных даследчыкаў народнага адзення [16].

Акрамя Д. К. Зяленіна, беларускія матэрыялы па адзенню выкарыстоўваліся для параўнанняў у працах іншых савецкіх даследчыкаў. Шмат увагі беларускаму адзенню адведзена ў грунтоўнай манаграфіі Г. С. Маславай, прысвечанай адзенню ўсходнеславянскіх народаў [17].

У Беларусі ў даваенныя гады вялася вялікая збіральніцкая праца па матэрыяльнай культуры. І. А. Сербавым была падрыхтавана грунтоўная манаграфія па народнаму адзенню. Але ў гады Вялікай Айчыннай вайны і варожай акупацыі яна была страчана, як і іншыя этнаграфічныя матэрыялы. Захаваўся толькі альбом, які перад вайной быў здадзен у друкарню імя І. Фёдарава, што знаходзіцца ў Ленінградзе [18].

Спатрэбілася шмат гадоў напружанай збіральніцкай працы для аднаўлення страчанага. Толькі з сярэдзіны 50-х гадоў з'явілася рэальная магчымасць абагульніць сабраныя матэрыялы. У беларускіх, рускіх, украінскіх перыядычных выданнях было апублікавана некалькі артыкулаў па беларускаму народнаму адзенню наогул і па асобных састаўных частках комплексу народнага адзення (галаўныя ўборы, паясы і інш.) [19]. Значнае месца характарыстыцы народнага адзення адводзілася і ў манаграфічных даследаваннях па быту беларусаў, якія выходзяць ў пасляваенныя гады [20].

[16] Г. С. Маслова. Историко-культурные связи русских и украинцев по данным народной одежды. «Советская этнография», 1954, № 2; Н. И. Лебедева, Г. С. Маслова. Русская крестьянская одежда XIX — начала XX в. У кн.: Русские. Историко-этнографический атлас. М., 1968 і інш.

[17] Г. С. Маслова. Народная одежда русских, украинцев и белорусов в XIX — начале XX в. У кн.: Восточнославянский этнографический сборник. М., 1956.

[18] Беларускае народнае мастацтва. Л., 1951.

[19] Л. А. Молчанова. Комплекс женской одежды белорусских крестьян в XIX в. В сб. «Вопросы этнографии Белоруссии». Минск, 1964; я е ж. Характэрныя асаблівасці сучаснага сялянскага адзення ў Беларусі. «Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук», 1965, № 3; я е ж. Некаторыя вынікі работы комплекснай этнаграфічнай экспедыцыі 1963 г. па Беларускаму і Украінскаму Палессю. «Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук». Мінск, 1964. № 4; я е ж. Пояс у беларускай народнай вопратцы. «Беларусь», 1959, № 7; я е ж. Головні убори білоруських селян (XIX — пач. XX ст.). «Народна творчість та етнографія», 1969, № 6.

[20] М. Я. Грынблат, Л. А. Малчанава. Новыя з'явы ў быце калгаснай вёскі. «Беларускі этнаграфічны зборнік». Мінск, 1958; Белорусы. Историко-этнографический очерк. М., 1964; М. Я. Грынблат. Белорусы. Очерки происхождения и этнической истории. Минск, 1968; Л. А. Молчанова. Материальная культура белорусов. Минск, 1968; я е ж. Производственная деятельность и материальная культура белорусского крестьянства XIX — нач. XX в. Минск, 1969; я е ж. Материальная культура белорусского колхозного села. Минск, 1969.

З 1965 г. сектар этнаграфіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР сумесна з акадэміямі навук Украінскай і Малдаўскай ССР распачаў вялікую працу па стварэнню рэгіянальнага гісторыка-этнаграфічнага атласа. На працягу пяці гадоў супрацоўнікі сектара этнаграфіі з дапамогаю студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта праводзілі работу па збору матэрыялаў для атласа Украіны, Беларусі і Малдавіі. Збор матэрыялаў праводзіўся па дакладна распрацаванай тыпалогіі і методыцы, што дало плённыя вынікі. На працягу рада гадоў праводзіліся спецыяльныя маршрутныя экспедыцыі па збору апісальнага і ілюстрацыйнага матэрыялу. У выніку было даследавана звыш за 100 населеных пунктаў па 2—3 у кожным раёне рэспублікі.

Збор палявога матэрыялу быў звязан з вялікімі цяжкасцямі. Традыцыйнае адзенне ў асноўным выйшла з жывога штодзённага ўжытку. Характар традыцыйнага адзення часта даводзілася ўстанаўліваць па расказах.

Матэрыялы, якія былі сабраны для атласа, ляглі ў аснову гэтай манаграфіі.

Асноўнай задачай дадзенай работы з'яўляецца разгорнутая характарыстыка беларускага сялянскага адзення і яго асобных састаўных частак на працягу дзвюх сацыяльна-эканамічных фармацый: капіталізму і сацыялізма. Другая, блізкая да першай задача — паказ тэрытарыяльнага распаўсюджання асаблівасцей традыцыйнага народнага касцюма ў Беларусі і за яе межамі. Рашэнне гэтых задач дапаможа паказаць эвалюцыю народнага адзення і высветліць шляхі пранікнення пэўнай культурнай з'явы, час і месца яе фарміравання і далейшага развіцця ва ўмовах сацыялістычнай рэчаіснасці. Гістарычны аспект даследавання ўжо даў шмат каштоўных вынікаў у рашэнні складаных праблем гісторыка-грамадскіх працэсаў. Паказ жа культурных паралелей з суседзямі славянскага і неславянскага паходжання адкрывае шырокія магчымасці для рашэння праблем этнагенетычнага плана. Вялікую актуальнасць вывучэнне традыцыйнага адзення набывае ў сувязі з перспектывамі далейшага развіцця сучаснага адзення. Таму ў манаграфіі даецца характарыстыка сучаснага адзення ў плане выкарыстання народных традыцый.

Падзел матэрыялаў па раздзелах робіцца па прынцыпу дыферэнцыяцыі адзення па полу. Гэта дае магчымасць прадставіць народны касцюм у больш поўным выглядзе. Аўтары, кіруючыся палажэннямі ленінізма, стараліся пазбегнуць «аб'ектыўнай» фіксацыі фактаў і падрабязнае апісанне той ці іншай з'явы звязвалі з вырашэннем тэарэтычных пытанняў гісторыка-культурнага плана.

# ЖАНОЧЫ КАСЦЮМ

## ХАРАКТАРЫСТЫКА АГУЛЬНАГА КОМПЛЕКСУ І ЯГО САСТАЎНЫХ ЧАСТАК

Адзенне з'яўляецца адной з важнейшых састаўных частак матэрыяльнай культуры народа і цесна звязана з умовамі яго жыцця.

У беларусаў, якія з даўніх часоў займаюцца земляробствам і развядзеннем хатняй жывёлы, асноўнай сыравінай для адзення са старажытнасці і амаль да нашага часу былі валокны ільну, канапель, скура і воўна жывёл.

На сваіх палосах сяляне вырошчвалі лён, каноплі, апрацоўвалі іх: рвалі, мачылі, мялі, трапалі, ачышчалі ад кастрыцы, часалі, пралі, ткалі. Увесь працэс апрацоўкі сыравіны ад пачатковых стадый да вырабу гатовых прадметаў адзення праходзіў у хатніх умовах. У хатніх умовах афарбоўвалі ніткі і тканіны, а таксама апрацоўвалі воўну і скуру, з якіх шылі верхняе адзенне, галаўныя ўборы, некаторыя віды скуранога абутку. Толькі для вырабу верхняга адзення і галаўных убораў прыбягалі да краўцоў-спецыялістаў, якія вандравалі ад вёскі да вёскі ў вольную ад сельскагаспадарчай працы пару года. Усё астатняе адзенне, жаночае і мужчынскае, шылі самі сялянкі — вялікія майстрыхі ў гэтай справе. У наш час даводзіцца здзіўляцца майстэрству і вытрымцы беларускіх жанчын, якія рабілі ўсё ўручную.

У парэформенны перыяд значная частка сялянскіх гаспадарак захавала паўнатуральны характар і працягвала вырабляць даматканіну. Ужыванне ж даматканіны ў сваю чаргу садзейнічала захаванню традыцыйных відаў і крою народнага адзення.

У канцы XIX — пачатку XX ст. у сувязі з развіццём капіталізму і пранікненнем яго ў гаспадарчую вытворчасць і сялянскі побыт адбыліся значныя змены ў народным адзенні. Адыходніцтва, рост класавай дыферэнцыяцыі сялянства ў вялікай ступені садзейнічалі гэтаму. У заможных сялян паяўляецца адзенне з куплёных тканін, пашытае па гарадскому ўзору. Куплёныя галаўныя ўборы і абутак таксама змянілі агульны выгляд традыцыйнага касцюма. М. В. Доўнар-Запольскі, які наведаў у канцы XIX ст. Дзярновіцкую воласць Рэчыцкага павета, быў вельмі здзіўлены тымі вялікімі зменамі, якія ён убачыў у адзенні насельніцтва гэтага параўнальна глухога кутка Беларусі. Ён пісаў: «Але ў Дзярновіцкай воласці жаночае ўбранне зусім такое, якое носяць у гарадах жанчыны рабочага класа: паркалёвая спадніца і кофта, на галаве паркалёвыя хусткі з бледнымі дробнымі кветкамі, павязаныя пад падбародак. Лапцей жанчыны не носяць зусім» [1].

Змянілася не толькі якасць тканіны, але і яе расфарбоўка. У каляровай гаме традыцыйнага народнага беларускага адзення здаўна пераважаў белы колер (белае палатно, белае сукно). У другой палавіне XIX ст. тканіны хатняга выбару сталі афарбоўваць у розныя колеры — жоўты, карычневы, ружовы. Каляровым рабіўся толькі ўток, тады як аснова заставалася часцей белай, таму тканіна чыстага тону не атрымлівала.

З 30-х гадоў XIX ст. сталі ўжываць набойкі і сіненне палотнаў і хатняга сукна. К сярэдзіне XIX ст. сіненне ў радзе месц паўночна-ўсходняй Беларусі стала ўжо шырока вядомай з'явай. Сіненнем і набойкай займаліся спецыяльныя сінільшчыкі, якія вандравалі па вёсках з неабходнымі прыладамі вытворчасці. Куплёныя тканіны — папяровы міткаль, паркаль, кашамір і інш.— былі часцей за ўсё чырвонага колеру розных адценняў.

З афарбаваных дамаканых каляровых тканін выраблялі звычайна толькі спадніцы і безрукаўкі, тады як кашулі заўсёды былі белага

[1] М. Запольский. Заметки из путешествия по Белоруссии. «Виленский вестник», 1890, № 217.

колеру — колеру натуральнага палатна. Гэта асаблівасць адрознівала беларускі жаночы касцюм ад рускага, у якім кофты шылі з куплёнага кумачу або афарбаваных тканін хатняга вырабу.

Змяненні ў матэрыяле і крої найбольш шырока адбіліся на адзенні моладзі, у той час як у касцюме старэйшага пакалення доўга захоўваліся архаічныя рысы.

На фарміраванне тыпалогіі адзення ўплываюць самыя розныя фактары: навакольная прырода і клімат, эканамічныя ўмовы грамадства ў цэлым і сацыяльнае становішча пэўнага класа ў гэтым грамадстве. Акрамя таго, уплываюць такія фактары, як палавая прыналежнасць, узрост. Гэтыя апошнія найбольш выразна прасочваюцца ў нацельным аддзенні і галаўных уборах, тады як у абутку і верхнім адзенні намнога пазней пачала праяўляцца спецыфіка ў залежнасці ад полава-ўзроставых асаблівасцей.

Важнае месца ва ўтварэнні пэўных тыпаў адзення належыць нацыянальнаму фактару. Нацыянальная своеасаблівасць праяўляецца ў тыпе крою, форме галаўных убораў, у характары ўпрыгожанняў, у расфарбоўцы тканін, г. зн. у характарыстыках, у аснове якіх ляжаць даўнія вытворчыя традыцыі і пэўныя рэлігійныя ўяўленні, таму што адзенне з даўніх часоў успрымалася як «оберег», які ахоўвае чалавека не толькі ад шкодных атмасферных уплываў, але і злых духаў. Таму асобныя часткі адзення (пояс, чапец, кажух) адыгрывалі важную ролю ў розных абрадах: вясельным, хрэсьбінным і інш.

Умерана кантынентальны клімат у шыротах, дзе здаўна жывуць усходнеславянскія народы, у тым ліку і беларусы, адыграў важную ролю ў паяўленні разнастайнага адзення, якое прынята падраздзяляць на так званае нацельнае, што надзяваецца непасрэдна на цела, і набедранае, якое прыкрывае бёдры. Спалучэнне таго і другога складала летняе (або пакаёвае, хатняе) адзенне абодвух полаў (рыс. 1). Паверх гэтага лёгкага адзення апраналі кароткую безрукаўку або таксама кароткае адзенне з рукавамі на падкладцы, а ў халады — даўгаполае — суконнае і футравае. Цёплае верхняе адзенне, як і нацельнае, з'яўляецца абавязковым для абодвух полаў і ўсіх узростаў, тады як кароткае безрукаўнае і з рукавамі вядома было не ўсюды і далёка не ва ўсіх. У беларусаў нацельнае і верхняе адзенне абавязкова дапаўнялася поясам (плеценым, тканым, вязаным).

Ва ўсіх усходнеславянскіх народаў і іх суседзяў комплекс адзення складаецца з аналагічных састаўных частак, таму такая этнаграфічная класіфікацыя адзення ў значнай меры аблягчае вызначэнне тыпалагічнай блізкасці або адрозненняў у адзенні многіх народаў, этнічна родных і няродных.

Найважнейшай адзнакай, па якой вызначаецца этнаграфічны тып народнага адзення, з'яўляецца крой асобных састаўных частак касцюма. Аналіз тыпалогіі крою ў асобнага народа і параўнанне гэтых матэрыялаў з аналагічнымі ў суседзяў складае аснову этнаграфічнага аналізу народнага адзення.

Крой — гэта пэўнае злучэнне ў адно цэлае асобных канструктыўных дэталей з расчлененага на часткі рознай формы і памеру матэрыялу. У крої кожнага прадмета касцюма можна вылучыць асноўную частку, каля якой збіраюцца астатнія кампаненты.

У мужчынскіх і жаночых кашулях аснову складае «станіна» (суцэльная або з подтачкай). Разнастайнасць спосабаў злучэння пярэдняй і задняй палавін «станіны» на плячах (тунікападобнае, паліковае, простае шво) уяўляе сабой своеасаблівасць этнічнага і часавага характару. І іменна характар злучэння палотнішчаў на плячах лічыцца тыпалагічным вызначальнікам нацельнага плечавога адзення і надае яму пэўны каларыт.

У беларускай жаночай кашулі ў XIX — пачатку XX ст. пярэдняе і задняе палотнішчы на плячах злучаліся з дапамогай палікаў — прамавугольных уставак. Гэтыя ўстаўкі былі звычайна з таго ж самага палатна і прышываліся адным вузкім канцом у прызбораным выглядзе да каўняра, а другім, процілеглым — да верхняй часткі рукава. Палікі ў беларускіх кашулях, як у паўночнарускіх і часткова ўкраінскіх, да полак кашулі прышываліся па ўтку (рыс. 2).

Жаночая кашуля з палікамі ва ўсіх трох усходнеславянскіх народаў з'яўляецца старажытнай формай адзення. Па сцвярджэнню даследчыкаў, устаўкі на плячах і сабраны ў шыі каўнер адрознівалі славянскія кашулі ад кашуль фіна- і цюркаязычных народаў [2].

Кашуля з палікамі шылася з хатняга палатна з дзвюх, трох, чатырох полак. Колькасць полак вызначалася шырынёй палатна, якая на Беларусі вагалася ад 38—40 да 62—70 см. Пры крої ў тры полкі трэцяя звычайна прыходзілася на адзін з бакоў. У кашулі з чатырох полак дзве ішлі пасярэдзіне — адна ззаду, другая спераду, а дзве — па баках. Часцей за ўсё кашулі шыліся з дзвюх шырокіх полак, а на баках устаўляліся нешырокія кліны (рыс. 3).

Вельмі распаўсюджаным тыпам жаночай кашулі ў канцы XIX — пачатку XX ст. становіц-

[2] Г. С. Маслова. Историко-культурные связи русских и украинцев. «Советская этнография», 1954, № 2, стар. 44.




Рыс. 1. Тыпы жаночага касцюма Магілёўшчыны

ца кашуля з гесткай, або на гестцы. У такіх кашулях асноўны матэрыял — «станіна» прышываўся ўверсе да нешырокай какеткі-гесткі. Палотнішчы «станіны» пры сшыванні з гесткай збіраліся ў зборку спераду і ззаду, а іншы раз толькі спераду. Гестка мела плечавыя швы, але часта шво не рабілі; тады матэрыял на плячах проста перагінаўся. Кашулі з гесткамі ў XIX— пачатку XX ст. часцей сустракаліся на Віцебшчыне, на поўначы Магілёўшчыны і спарадычна ў іншых раёнах Беларусі, а таксама за яе межамі.

Найбольш просты тып крою — тунікападобны для жаночай беларускай кашулі другой палавіны XIX — пачатку XX ст. не быў характэрны. Па сцвярджэнню беларускіх сялянак, гэты тып крою ў некаторых месцах паявіўся толькі тады, калі кашуля стала сподняй бялізнай. Але ў радзе месц паўночна-заходняй Беларусі (Астравецкі, Ашмянскі, Навагрудскі, Лідскі, Ваўкавыскі раёны Гродзенскай вобласці, Мядзельскі, Вілейскі Мінскай, Полацкі, Верхнядзвінскі, Расонскі раёны Віцебскай вобласці) тунікападобная кашуля не мела ў мінулым паліковых папярэднікаў (карта 1). Гэту з'яву часткова можна растлумачыць тым, што тут кашуля вельмі даўно стала споднім адзеннем. Пэўную ролю ў гэтым адыгралі пазнейшыя ўзаемасувязі культуры беларусаў з культурай суседніх народаў Прыбалтыкі. Магчыма, уплывам прыбалтыйскіх народаў (латышоў, літоўцаў) тлумачыцца і шырокае распаўсюджанне ў паўночнай Беларусі (на Віцебшчыне) жаночай




Рыс. 2. Тыпы жаночых кашуль:

*а* — в. Мальковічы Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл.; *б* — в. Азярніца Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.; *в, г* — в. Юндзілавічы Пружанскага р-на Брэсцкай вобл.




Рыс. 3. Тыпы жаночых кашуль:

*а* — в. Брадок Магілёўскай губ.; *б* — в. Тонеж Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.; *в* — в. Каровіна Аршанскага р-на Віцебскай вобл.; *г* — в. Ялаўка Чырванагорскага р-на Бранскай вобл.




Карта 1. Тыпы крою жаночай кашулі (канец XIX — пачатак XX ст.):

*1* — тунікападобная; *2* — на гестцы; *3* — з прамымі палікамі, прышытымі па ўтку (*а* — пераважае, *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

кашулі з «прырамкамі», г. зн. з прамавугольнымі палатнянымі нашыўкамі на тунікападобнай аснове. Па сцвярджэнню даследчыка латышскага народнага адзення М. Славы, «тунікападобная кашуля з нашытымі наплечнікамі з'яўляецца самым распаўсюджаным у Прыбалтыцы відам кашулі» [3].

Станіна, палікі, гесткі з'яўляюцца асноўнымі канструктыўнымі часткамі кашулі, якія аб'ядноўваюць у адно цэлае ўсе астатнія і вызначаюць тып адзення. Але, апрача асноўных, у кашулі ёсць цэлы рад дэталей, якія і надаюць адзенню пэўны закончаны вобраз.

Неабходнай часткай не толькі беларускіх кашуль, але і кашуль іншых усходнеславянскіх і прыбалтыйскіх народаў з'яўляецца не вельмі шырокі, даўжынёю да кісці рукаў. Пры сшыванні яго са «станінай» для расшырэння праймы амаль заўсёды ўстаўляліся квадратныя кавалкі тканіны (цвікля, падпашнік, падручнік, ластавіца і інш.).

Найбольш характэрнымі для беларусаў былі рукавы з манжэтамі — каўнерцамі, чэхлікамі — вузкімі двайнымі палоскамі з той жа тканіны або шырокай «манкетай», «брызуляй», да якой часта прышываліся карункі. Рукавы без манжэт характэрныя для паўночных раёнаў Мінскай вобласці; у іншых жа месцах толькі рабочыя кашулі шылі без манжэт.

У беларускай жаночай кашулі пераважаючым тыпам каўняра быў стаячы нешырокі (2—3 см). Такі каўнер зашпільваўся на 2 гузікі спераду

[3] M. Slava. Latviesu tautu terpi. Riga, 1966, стар. 154.




Карта 2. Віды каўняра ў жаночых кашулях (канец XIX — пачатак XX ст.):

*1* — адкладны з разрэзам па цэнтру; *2* — стаячы з разрэзам па цэнтру; *3* — без каўняра з разрэзам па цэнтру (*а* — пераважае, *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

або збоку. Адкладныя каўняры былі шырокія і часцей за ўсё зашпільваліся на запінку-шпонку або сцягваліся стужкай — «спулечкай», «жычкай» — з каляровай тканіны. Жычка прадзявалася ў дзіркі, якія праразаліся на абедзвюх полках ля шыі.

Распаўсюджанне розных тыпаў каўняра ў Беларусі было нераўнамерным. У Брэсцкай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях пераважаў адкладны каўнер. Вузкі стаячы каўнер панаваў у Гомельскай і Мінскай абласцях. У іншых месцах сустракаліся абодва тыпы (карта 2).

Кашулі са стаячым каўнярам, акрамя беларусаў, вядомы былі рускім, украінцам, а таксама латышам, літоўцам і эстонцам [4].

[4] Народы Европейской части СССР, т. I. М., 1964, стар. 667.

Кашулі з адкладным каўнярам сустракаліся ў разанскіх, тамбоўскіх, варонежскіх аднадворцаў, дзе іх, па назіраннях Н. І. Лебедзевай, заўсёды насілі з паласатай спадніцай тыпу беларускага андарака. Гэтыя абставіны прывялі Лебедзеву да вываду, што шырокі адкладны каўнер паявіўся пад польскім уплывам, таму што аднадворцы (дробная шляхта) успрынялі шмат чаго з польска-літоўскай культуры. Яна пісала: «Наяўнасць андарака і адкладны каўнер я лічу адной з груп гэтага ўплыву» [5]. У карысць польскага паходжання адкладнога каўняра выказваўся таксама і Д. К. Зяленін [6].

[5] Н. И. Лебедева. Народный быт в верховьях Десны и в верховьях Оки, ч. 1. М., 1927, стар. 14.

[6] D. Zelenin. Russische (Ostslavische) Yolkskunde. Leipzig, 1927.

З іх меркаваннямі, відаць, трэба згадзіцца, таму што адкладны каўнер сустракаўся і ў іншых народаў — украінцаў, літоўцаў, палякаў, якія разам з беларусамі ў пэўны час уваходзілі ў адзіную дзяржаву — Рэч Паспалітую і знаходзіліся пад уплывам агульных культурных плыней.

Трэба адзначыць таксама, што ў беларусаў шырокі адкладны каўнер часцей за ўсё сустракаўся ў тых раёнах, дзе панаваў тэрмін «кашуля», а не «сарочка», а, як вядома, тэрмін «кашуля» здаўна засвоен беларусамі ад палякаў.

М. Я. Нікіфароўскі адзначаў узаемасувязь паміж фасонам каўняра і рукава, што назіралася на Віцебшчыне. У кашулях з каўняром на канцах рукавоў часта прышываліся шырокія звонападобныя манжэты [7]. Такая ўзаемасувязь, за нямногімі выключэннямі, назіралася і ў іншых месцах Беларусі. Гэта дае падставу меркаваць, што шырокая ў выглядзе званочка манжэта з'явілася таксама пад польскім уплывам.

Пэўны від каўняра ў значнай ступені ўзаемазвязан з асноўным кроем кашулі і ўплывае на афармленне нагруднага разрэзу-пазухі.

Пры тунікападобным крої звычайна не было каўняра, а паліковыя кашулі заўсёды мелі стаячы або адкладны каўнер. Тут нярэдка замест вузкай абшыўкі на грудны разрэз нашывалася планачка-манішка, якая закрывала разрэз і мастацкі ўпрыгожвалася натыканнем ці вышыўкай (дадатак, IX, X).

[7] Н. Я. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии. Витебск, 1895, стар. 112.

Кашуля на гестцы звычайна шылася без каўняра, і вузкая абшыўка вакол шыі зашпільвалася на адзін гузік. Упрыгожанні тут размяшчаліся па краю гесткі (рыс. 4).

Кароткія кашулі, якія пачалі насіць у канцы XIX — пачатку XX ст., шыліся часцей за ўсё на гестцы з чатырохвугольным выразам вакол шыі. Яны таксама не мелі каўняра.

Кашулі такога крою, шырока вядомыя ў паўднёвых раёнах Магілёўшчыны і Гомельшчыны, нярэдка называліся «маларoскамі», што наводзіць на думку аб іх украінскім паходжанні.

Не толькі беларусы, але і іншыя ўсходнеславянскія народы шылі кашулі з разнаякаснага матэрыялу: верх — з больш тонкага, кужэльнага палатна, а ніз — «подтачку», «портачку» — з грубога, «зрэбнага». Выключэнне складаюць толькі паўднёва-заходнія раёны Брэсцкай вобласці, дзе і святочныя, і штодзённыя кашулі шылі з аднаякаснага палатна. Такія кашулі панавалі таксама ў заходнеўкраінскіх абласцях. Наогул жа суцэльныя кашулі з'яўляліся святочным і абрадавым адзеннем (карта 3).

Даўнія жаночыя кашулі, па агульнаму сведчанню жанчын старэйшага пакалення, або зусім не ўпрыгожваліся, або ўпрыгожваліся вельмі сціпла. Разнастайныя тканыя і вышытыя ўзоры ў адзенні беларускіх сялян сталі распаўсюджвацца з другой палавіны XIX ст. Упрыгожанні ў жаночай кашулі звычайна размяшчаліся ў верхняй частцы рукава, на паліках, каўняры, грудзях і абшлагах (карта 4). Асабліва разнастайныя ўпрыгожанні на рукавах і каўняры можна растлумачыць тым, што беларусы зверху кашулі насілі безрукаўнае адзенне.





Рыс. 4. Тыпы жаночых кашуль:
*а* — в. Мілаславічы Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.; *б* — в. Навалессе Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл.




Карта 3. Адразныя і суцэльныя жаночыя кашулі (канец XIX — пачатак XX ст.):

*1* — суцэльная; *2* — з адразным нізам (з подтачкай) (*а* — пераважае, *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

Па ўсталяванаму звычаю ў беларускіх жанчын кашулі заўсёды былі карацей за спадніцу, таму ў рэдкіх выпадках сустракаліся ўпрыгожанні па яе падолу.

Яшчэ ў XIX ст. назіраліся выпадкі, калі жанчыны ў спякотныя летнія дні на жніво апраналіся толькі ў адну сарочку. Але гэта былі рэдкія выпадкі.

У пачатку XX ст. з пранікненнем у вёску гарадскіх відаў адзення зверху кашулі ў многіх месцах сталі надзяваць пашытыя з куплёных фабрычных тканін кофты-«каптаны», «блузкі», «нажуткі» (дадатак, II). Гэта прывяло да змянення традыцыйнага крою кашуль: знікаюць палікі, доўгія рукавы, каўняры, а таксама вытканыя і вышытыя ўпрыгожанні.

Жаночая кашуля на Беларусі мае некалькі назваў: сарочка, кашуля, рубаха. Тэрмін «сарочка», які пераважаў на ўсёй тэрыторыі Беларусі, агульнаславянскі, прычым ва ўсіх славян абазначае адзін і той жа прадмет касцюма. Раён распаўсюджання тэрміна «кашуля» займае даволі шырокую паласу цэнтральнай Беларусі ад літоўскай мяжы на поўначы да басейна р. Прыпяці на поўдні. У старажытных беларускіх помніках пісьменнасці «сарочка» і «кашуля» ўжываюцца як сінонімы ў адным і тым жа помніку. Таксама і ў пазнейшы час у народным ужытку ў раёне распаўсюджання тэрміна «кашуля» на аднолькавых правах бытаваў і тэрмін «сарочка».

Тэрмін «рубаха» найбольш часта ўжываўся ў паўночных (Віцебшчына) і цэнтральных (Міншчына) раёнах. Часам яго можна пачуць і ў іншых абласцях у дастасаванні да адзення тунікападобнага крою.




Карта 4. Размяшчэнне арнаменту на жаночых кашулях (канец XIX — пачатак XX ст.):

*I* — неарнаментаваная; *1* — на рукавах і грудзях; *2* — на рукавах; *3* — на рукавах, грудзях, паліках і каўняры; *4* — на рукавах, грудзях, каўняры, паліках і падоле; *5* — на паліках і рукавах; *6* — на паліках, рукавах і каўняры; *7* — на гестцы, рукавах і грудзях; *8* — на гестцы і рукавах; *9* — на рукавах і каўняры (*а* — аднаколерная арнаментыка; *б* — двухколерная: чырвоны, чорны; *в* — паліхромная)

Другой найважнейшай састаўной часткай беларускага жаночага комплексу з'яўляецца спадніца.

Гаворачы аб тыпе жаночага паяснога адзення наогул, перш за ўсё падзяляюць яго на дзве групы: сшытае (глухое) і расхіннае.

Паколькі для беларусаў з параўнальна даўніх часоў і ў вывучаемы перыяд характэрна была сшытая спадніца, для вызначэння яе своеасаблівасцей прыцягваюцца іншыя дадатковыя характарыстыкі: матэрыял, колькасць і размяшчэнне палотнішчаў, тэрміналагічныя даныя, нарэшце, расфарбоўка тканін, што ідуць на пашыў спадніц.

Амаль да XX ст. беларускія сялянкі шылі спадніцы пераважна з даматканіны — палатна, сукна, паўсукна; найбольш заможныя на свята — з купленых тканін (карта 5).

Шыліся спадніцы звычайна з трох, чатырох, шасці падоўжных полак, якія сшываліся разам і ля пояса збіраліся ў зборкі або складкі. Шырыня полак раўнялася шырыні вытканага матэрыялу.

Радзей шылі спадніцы з папярочнага кавалка тканіны — так званыя папярэчкі. Абшыўка, або пояс, спераду ці трошкі збоку зашпільвалася, але часцей завязвалася тасёмкамі з палатна ці паяском, сплеценым з хатніх нітак (дадатак, XII—XVI). Унізе з ісподняга боку спадніца падшывалася «падпадолкам» з хатняга палатна шырынёй каля 4—5 см або з сукна цёмнага колеру.




Карта 5. Тыпы жаночага паяснога адзення (канец XIX — пачатак XX ст.):

*1* — саматканая спадніца на поясе; *2* — саматканая спадніца з прышыўным кабатам; *3* — панёва; *4* — плахта; *5* — запаска (*а* — пераважае, *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

У суконных спадніцах, якія часцей за ўсё шыліся з падоўжных полак, верхняя частка пярэдняй полкі часам рабілася або з матэрыялу іншай якасці (напрыклад, з палатна), або з таго ж матэрыялу, але вытканага больш простым узорам і часам нават іншай расфарбоўкі. У спадніцах-«папярэчках» такая ўстаўка сустракалася толькі ў выключных выпадках (напрыклад, вёска Юндзілавічы Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці). Больш таго, у тых раёнах, дзе бытавалі спадніцы-«папярэчкі», нават у спадніцах з падоўжных полак устаўка іншай якасці і колеру не рабілася.

У некаторых месцах Беларусі сустракаліся спадніцы з прышытым ліфам. Ліф шыўся або з таго ж матэрыялу, што і спадніца, або (і гэта часцей) з матэрыялу іншай якасці і афарбоўкі (часам з дарагога атласу). Сабраная ў дробныя зборкі каля ліфа такая спадніца абавязкова зашпільвалася, а не завязвалася. Ліф шыўся на падкладцы з хатняга палатна (дадатак, XVII).

Мясцовыя назвы касцюма ў цэлым і яго асобных састаўных частак часта праліваюць святло на паходжанне таго ці іншага віду адзення, на яго першапачатковае прызначэнне. На аснове тэрміналагічнага матэрыялу з пэўнай доляй верагоднасці можна гаварыць аб гісторыі адзення, аб культурных узаемасувязях народаў у далёкім мінулым. Тэрміналагічныя даныя па беларускаму паясному адзенню раскрываюць нам многа цікавага, не зафіксаванага пісьмовымі крыніцамі.

Сшытая спадніца ў беларусаў мела шмат розных назваў, адны з якіх былі вузкалакальнага

распаўсюджання, іншыя вядомы амаль паўсюдна. Назва нярэдка вызначалася матэрыялам (палатно, сукно), якасцю і тэхнікай вырабу матэрыялу, з якога яна шылася, а таксама і расфарбоўкай.

Пашытае з даматканага палатна паясное адзенне паўсюдна на Беларусі называлася спадніцай. Палатняная спадніца ў залежнасці ад расфарбоўкі мела назвы: «бяляк» — зусім белая; «сінька», «самасінька», «сіняк» — афарбаваная ў сіні колер; «набойка» — з набіўной тканіны; «рабушка», «рабан», «шарачок» — з палатна, тканага ў клетку. У залежнасці ад якасці матэрыялу ўзніклі асобныя назвы паўсуконных спадніц: «палавіннік», «дрыліх», або «дрылішка».

З пранікненнем у вёску фабрычных тканін у радзе месц Магілёўскай губерні з'явіліся назвы «мультоўка», «мультаноўка». У процілегласць ім у гэтай жа губерні сталі ўжывацца назвы «саматканка», «саматканік», «парцянік», «палатнянік», у якіх адлюстравана іх «даматканае паходжанне».

Спадніцы, якія шыліся з шарсцяной або паўшарсцяной хатняга вырабу тканіны, на Беларусі называліся часцей за ўсё андаракамі. Гэта назва вядома амаль паўсюдна, за выключэннем паўночна-заходніх раёнаў. Тэрмін «андарак» большасць вучоных не без падстаў звязваюць з нямецкім словам «Unterrock» [8]. У працы В. Лазінскага ёсць прамое ўказанне на нямецкае паходжанне гэтага тэрміна. Лазінскі адзначаў, што недастаткова быць знаўцам усходніх і заходніх моў, таму што вельмі часта назва матэрыялаў і сукенак непазнавальна змяняецца ў польскай мове. «Хто ж, напрыклад, лёгка адгадвае, што польскі «індэрак» гэта нямецкі «Unterrock» [9].

Найбольш верагодным будзе меркаванне, што нямецкае слова «Unterrock» пранікла і ўмацавалася ў Польшчы, а затым праз польскае асяроддзе прыйшло на Беларусь. Гэта меркаванне пацвярджаецца тым, што ў старажытных беларускіх помніках пісьменнасці, як правіла, шарсцяныя спадніцы называліся, як і ў палякаў, індэрак: «Индерак адамашки чирвоное» або «индерак бархановый, брушками лисими подшитый» [10]. Можна меркаваць што «індэрак» з'яўляўся адзеннем забяспечаных класаў і служыў верхняй спадніцай, у той час як нямецкі «Unterrock» — гэта ніжняя сукенка. Ад пануючых саслоўяў, магчыма, праз краўцоў яўрэяў тэрмін «індэрак», у беларускім вымаўленні «андарак», перайшоў да простага саслоўя. Не выпадкова тэрмін гэты быў засвоен для суконнай спадніцы як больш прыгожага святочнага адзення, якое, магчыма, і шылі спецыяльныя майстры, а не самі сяляне.

Ужо як пэўны тып суконнага адзення андарак распаўсюдзіўся за межы Беларусі. З умацаваннем руска-польскіх сувязей у XVI—XVII стст. андарак укараніўся ў Смаленскай губерні, а затым праз служылую вярхушку пранік у паўднёварускія губерні (асобныя пасяленні або раёны Разанскай, Курскай, Арлоўскай губерняў) [11].

У пазнейшы час, у XIX—XX стст., беларускія сяляне шылі андаракі пераважна з даматканага сукна.

Спадніца, пашытая з куплёнай шарсцяной тканіны або тонкага крамнага сукна, аднатоннага па колеру — сіняга, зялёнага, часцей вішнёвага,— у сялянскім асяроддзі ў XIX ст. называлася часцей за ўсё саянам. Э. А. Вальтэр адзначаў, што ўпершыню тэрмін «саян» у беларускіх пісьмовых крыніцах з'яўляецца ў XVI ст. У актах Упіцкага і Мінскага гарадскога суда саянам называецца адзенне літоўскай шляхты, пашытае з дарагога сукна зялёнага, чорнага, сіняга колеру, а таксама белай, зялёнай, сіняй, чырвонай пурпурнай адамашкі і аксаміту [12]. Тэрмін «саян» сустракаецца ў помніках старажытнабеларускай пісьменнасці ў дастасаванні да жаночага адзення, што сведчыць аб яго шырокім бытаванні ў XVI—XVII стст. Саян, як і старажытны андарак,— вельмі дарагое адзенне. «...Саянъ жоноцкий каразыевый з оксамитомъ за чотыры копы грошей справленый, другой саянъ люнский синий з пасаманиками за полтрети копы справленый» [13].

Адметнай асаблівасцю саяна быў прышыўны ліф. Спадніцы з ліфам вядомы рускі этнограф Б. А. Куфцін генетычна звязвае з заходнееўрапейскімі касцюмамі, якія зацвердзіліся ў Еўропе з XV ст.[14]

[8] Б. А. Куфтин. Материальная культура русской мещеры, ч. 1. М., 1926, стар. 116; Г. С. Маслова. Народная одежда русских, украинцев и белорусов, стар. 683.

[9] Wł. Łozyński. Życie polskie w dawnich wiekach. Lwów, 1911, стар. 94.

[10] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, т. 4. Вильно, 1867, стар. 228, 230.

[11] Русские. Историко-этнографический атлас. М., 1967, стар. 201.

[12] Э. А. Вольтер. К вопросу о «саянах». Из истории литовско-русского костюма. «Известия отделения русского языка и словесности Российской академии наук», т. XXII, кн. 1, 1917.

[13] АВАК, т. XXXI. Вільна, 1902, стар. 154.

[14] Б. А. Куфтин. Материальная культура русской мещеры, стар. 116.

Саяны з куплёнай шарсцяной тканіны былі здабыткам толькі заможнай часткі сялянства, у той час як бедныя сяляне іх шылі з сукна хатняга вырабу, пры гэтым не толькі аднатоннага, але і ўзорных расфарбовак, аб чым можна меркаваць з паведамлення М. Я. Нікіфароўскага: «У Лявоніхі сыян з пылысам», і далей ён адзначае, што саян ткаўся з узорамі: «у мачынкі», «у кукушкі», «ялушкі» [15]. Побач з суконнымі шылі саяны з парцяной, больш лёгкай тканіны. Такія саяны, па сведчанню П. В. Шэйна, на Віцебшчыне насілі дзяўчаты і маладыя замужнія жанчыны пераважна летам.

Пад уплывам саянаў ліф сталі прышываць і да андаракаў. Спадніцы ж, якія называлі саянам, часам не мелі ліфа.

Тэрмін «саян» у дастасаванні да шарсцяной спадніцы ў XIX — пачатку XX ст. панаваў у паўночна-ўсходніх раёнах Віцебшчыны (Гарадоцкі, Віцебскі). Так тут называлі спадніцы з куплёнага і хатняга сукна. У іншых абласцях Беларусі тэрмін «саян» суіснаваў з іншымі назвамі толькі для спадніц з куплёнай шэрсці.

Тэрмін «саян» быў шырока вядомы ў літоўцаў, дзе ён з'яўляўся агульным паняццем, як у беларусаў спадніца. Саянам (літ. *sijonas*) у Літве называюць спадніцу любой расфарбоўкі, пашытую па тыпу беларускага андарака без ліфа. У сувязі з тым што сшытая спадніца ў Літве, як даказваюць літоўскія этнографы, з'явілася не раней XVII ст.[16], тэрмін «саян» пранік сюды некалькі пазней, чым на Беларусь. У Літве назва «саян», відаць, была першай для сшытай спадніцы і стала пануючай. На Беларусі ж тэрмін «саян» адносіўся толькі да пэўнага тыпу сшытай спадніцы. Гэта дае падставу сцвярджаць, што тэрмін «андарак» пранік на Беларусь значна раней, чым тэрмін «саян», які вядомы быў толькі ва ўскраінных раёнах Беларусі, пры гэтым нярэдка суіснуючы з тэрмінам «андарак».

Шарсцяную спадніцу з ліфам Б. А. Куфцін зближае з велікарускім сарафанам на лямках. Трэба адзначыць, што ў радзе раёнаў Расіі касаклінавая спадніца на лямках называлася саянам. Вядомыя даследчыкі рускага народнага адзення Г. С. Маслава і Н. І. Лебедзева распаўсюджанне тэрміна «саян» у дастасаванні да касаклінавага сарафана ў паўднёва-ўсходняй частцы Тзярской і паўночнай частцы Маскоўскай губерняў, а таксама ў Курскай губерні тлумачаць беларуска-літоўскім уплывам. У XVI—XVII стст. у сувязі са спусташэннем і запусценнем у гэтыя вобласці перасялілася шмат насельніцтва, асабліва служылага з заходніх абласцей [17].

У XIX — пачатку XX ст. у Беларусі быў вядомы тэрмін «панёва», якім часцей называлі доўгія да пят спадніцы, сшытыя ў 4—5 полак з сукна хатняга вырабу. Панёвамі называлі сшытую спадніцу тыпу андарака ў вёсцы Новая Ёлча Брагінскага раёна [18]. У І. А. Сербава адзначаецца, што жанчыны з вёсак, размешчаных па р. Пціча (прыток Прыпяці) насілі панёвы — шарсцяныя доўгія спадніцы [19].

Літаратурныя і экспедыцыйныя крыніцы сведчаць, што ў другой палавіне XIX — пачатку XX ст. у радзе вёсак усходняй Беларусі было вядома і своеасаблівае нясшытае адзенне, якое называлі панёвай.

Расхінная панёва была апісана В. Ф. Мілерам у адной з вёсак Гомельскага павета. Яе насілі жанчыны замест андарака. Чатыры чатырохвугольныя кускі грубой шарсцяной даматканай матэрыі даўжынёй 1 1/4 аршына і шырынёю 3/4 аршына прышывалі да пояса [20]. Па расказах старых жанчын, «нясшытыя» андаракі насілі ў былыя часы ў вёсцы Лавы Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці.

У час этнаграфічнай экспедыцыі 1955 г. расказы пра панёву былі запісаны ў вёсцы Следзюкі Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці, дзе раней (у XIX ст.) былі вядомы панёвы з чатырох палотнішчаў, якія па баках не сшывалі, «так і хадзілі з крыллямі» [21]. Полкі нясшытай панёвы замацоўвалі ўверсе на матузу. Нясшытая панёва была зафіксавана ў 1955 г. у вёсцы Неглюбка Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці [22] (дадатак, VII).

Усе гэтыя звесткі дазваляюць сцвярджаць, што ў беларусаў папярэдніцай сшытага андарака была расхінная панёва, бо няма ніякіх падстаў лічыць панёву занесенай звонку, хаця такое меркаванне вельмі спакуслівае, таму што расхінныя панёвы знойдзены ў месцах з моцна развітым адыходніцтвам у паўднёварускія і ўкраінскія вобласці, дзе гэты від адзення шырока бытаваў у XIX ст. У той жа час спадчыннае бытаванне нясшытай панёвы не дазваляе зусім упэўнена меркаваць аб межах яе распаў-

[15] Н. Я. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья..., стар. 118.

[16] М. Мастоните. Литовская народная женская одежда в XIX — начале XX в. Автореф. канд. дисс. Вильнюс, 1967, стар. 15.

[17] Русские. Историко-этнографический атлас, стар. 211.

[18] Архіў ІМЭФ, ф. 6, воп. 11, стар. 2а.

[19] И. А. Сербов. Белорусы-сакуны, стар. 30.

[20] В. Ф. Миллер. Систематическое описание коллекций Дашковского этнографического музея, вып. 1. СПб, 1867, стар. 147.

[21] Архіў ІМЭФ, ф. 6, воп. 3, спр. 91.

[22] Там жа, спр. 68.

сюджання на Беларусі і крої беларускай панёвы. Неправамерна распаўсюджваць на ўсю Беларусь крой неглюбскай панёвы, як гэта робіць М. Я. Грынблат [23]. Тут трэба мець на ўвазе, што Неглюбка да рэвалюцыі знаходзілася ў Суражскім павеце Чарнігаўскай губерні і ў сярэднія вякі была за мяжой беларускіх зямель, якія адышлі да Вялікага княства Літоўскага. Неглюбская панёва вельмі блізкая да ўкраінскай плахты, якая ўяўляе сабой два сшытыя да палавіны ўздоўж платы клятчатай шарсцяной тканіны. Да своеасаблівага плахтавага крою Б. А. Куфцін адносіць і крой панёвы Вылеўскай воласці [24].

Аб бытаванні панёвы на Беларусі пісаў А. К. Супінскі, які лічыў устаўку з іншага матэрыялу або з таго ж матэрыялу іншай расфарбоўкі ў верхняй частцы пярэдняй полкі андарака перажыткам панёвы [25].

Устаўка сапраўды збліжае беларускі андарак з панёвамі, якія Н. І. Лебедзева адносіць да тыпу сшытых панёў, г. зн. панёў з прошвай. Панёвы гэтага тыпу сшываюцца з трох полак і зверху замацоўваюцца на матузу [26]. Тое ж самае мы бачым і ў андараку з устаўкай, дзе пры трох аднолькавых полках спераду ўстаўляецца полка з матэрыялу іншай якасці. Як і панёва, андарак замацоўваецца зверху пры дапамозе палатняных завязак — матузоў, прышытых да рубца верхняй абшыўкі. Як і панёву гэтага тыпу, беларускі андарак насілі ці распушчаным, ці падтыкалі збоку або спераду за пояс. Першы спосаб нашэння з'яўляецца найбольш характэрным і шырока распаўсюджаным на Беларусі. Магчыма, і старажытныя беларускія панёвы насілі так, хаця не абавязкова межы нашэння такім чынам андарака атаясамліваць з межамі нашэння такім жа чынам панёвы, таму што сшытую спадніцу больш натуральна насіць распусціўшы.

Спосаб нашэння андарака з падтыканнем быў вядомы да XX ст. у радзе раёнаў паўднёвай Беларусі, дакладней ва ўсходніх і цэнтральных раёнах Палесся. Падтыкалі андарак з аднаго або з абодвух бакоў, пры гэтым спераду пад фартухом утвараўся своеасаблівы кашэль. Падтыкалі андарак часцей у час працы, але ў радзе месц, як напрыклад у в. Азярніцы Лунінецкага раёна, Меляшковічах Мазырскага раёна і інш., з падаткнутым андаракам выходзілі нават на гулянне.

Панёвы з прошвай у XIX — пачатку XX ст. насілі на вялікай тэрыторыі паўднёварускага Палесся, і можна меркаваць, што даўняя беларуская панёва, якая растала ў пашытым андараку, блізкая ў асноўным да рускіх панёў, якія шчыльна змыкаюцца з украінскімі.

Беларускі андарак — нацыянальная форма адзення з нямецкай назвай — захаваў таксама матэрыял і расфарбоўку даўняй панёвы. Як і панёвы, андаракі шылі з сукна хатняга вырабу, вытканага ў клетку: белыя, чорныя, зялёныя, фіялетавыя клеткі на чырвоным фоне. Фон мог быць таксама вішнёвым, а часам і чорным. Вядомы андаракі і аднатоннай расфарбоўкі (цёмна-вішнёвыя, цёмна-сінія, фіялетавыя). Калі параўнаць беларускую андарачную тканіну з паўднёварускай панёўнай тканінай, то кідаецца ў вочы іх незвычайнае падабенства, калі не поўная тоеснасць.

Панёва, на наш погляд, як характэрны для ўсходнеславянскіх народаў тып паяснога жаночага адзення была вядома ў старажытнасці і беларусам. Знікнуўшы як пэўны своеасаблівы від адзення, яна захавала некаторыя характэрныя асаблівасці ў новай форме адзення. Перажытачныя рысы яе знаходзім у крої і спосабе нашэння сшытага андарака. Найбольш устойлівым аказаўся спосаб вырабу тканіны і характар малюнка, абумоўленыя ў значнай ступені старажытнай ткацкай традыцыяй.

Неабходнай часткай беларускага касцюма жанчын усіх узростаў у святочныя і штодзённыя дні быў фартух.

У дастасаванні да гэтай часткі касцюма на Беларусі паўсюдна існаваў тэрмін «хвартух», а таксама старажытны ўсходнеславянскі тэрмін «пярэднік», які да гэтага часу сустракаецца таксама паўсюдна, за выключэннем рада раёнаў паўднёва-заходняй Беларусі. Тэрмін «запон» у дастасаванні да фартуха сустракаўся на параўнальна невялікай тэрыторыі паўднёва-ўсходняй Гомельшчыны [27].

Пры тыпалагічнай характарыстыцы фартухоў таксама перш за ўсё звяртаюць увагу на крой.

Для Беларусі характэрны палатняныя фартухі, замацаваныя на таліі з дапамогай завязак. У залежнасці ад шырыні палатна і старадаўняй народнай традыцыі яны шыліся з адной, дзвюх, дзвюх з палавінай, а часам з трох полак (карта 6). Зверху матэрыял фартуха дробна прызбораўся на вузенькім паяску часцей з

[23] М. Я. Гринблат. Белорусы. Минск, 1968, стар. 234.

[24] Б. А. Куфтин. Крестьянская одежда русской мещеры, стар. 50.

[25] А. К. Супинский. «Понева» и «вставка» в белорусской женской одежде. «Советская этнография», 1932, № 2, стар. 102—136.

[26] Н. И. Лебедева. Народный быт в верховьях Десны и в верховьях Оки, стар. 34.

[27] Дыялекталагічны атлас беларускай мовы. Мінск, 1963, карта 330.




Карта 6. Тыпы жаночых паясных фартухоў (канец XIX — пачатак XX ст.):

*1* — палатняны ў адну полку; *2* — палатняны ў дзве полкі; *3* — палатняны ў тры полкі; *4* — палатняны ў паўтары полкі; *5* — палатняны ў чатыры полкі; *6* — з фабрычнага матэрыялу; *7* — з фабрычнага ці самаробнага матэрыялу з фальбонай (*а* — пераважае, *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

гэтага ж матэрыялу, радзей на паўшарсцяной або шарсцяной «крайцы» (дадатак, XVIII—XX). Канцы паяска часта ўпрыгожваліся. Фартух надзяваўся зверху спадніцы. Верх яго хаваўся пад безрукаўку.

У канцы XIX — пачатку XX ст. фартухі, асабліва святочныя, шылі нярэдка з куплёнага каленкору. Шылі іх часцей за ўсё з даволі шырокай фальбонай (брыжамі) унізе. Па ўзору гэтых фартухоў шылі часам і палатняныя.

У Брэсцкай вобласці дзе-нідзе сустракаліся суконныя набедраныя фартухі-запаскі, якія ў адрозненне ад палатняных шыліся звычайна з адной полкі без зборак каля пояса. Суконныя фартухі сваёй назвай, яркім колерам і паласатым малюнкам нагадвалі палеска-ўкраінскія тыпы.

Фартухі тыпу тунікападобнага нагрудніка з кароткімі рукавамі адзначаны крыніцамі толькі ў Суражскім павеце Віцебшчыны. Тунікападобныя палатняныя нагруднікі, якія па крою нагадвалі мужчынскія кашулі мары, мардвы, чувашоў і ўдмуртаў [28], не былі характэрны для беларускага жаночага комплексу. На нашу думку, гэты тып адзення прыйшоў на Беларусь з рускімі перасяленцамі з Калужскай губерні, дзе такія пярэднікі пад той жа назвай «шушман» былі шырока распаўсюджаны ў XIX ст.

Беларускія палатняныя фартухі па агульнаму выгляду і па крою вельмі нагадвалі латышскія,

[28] Н. И. Лебедева, Г. С. Маслова. Русская крестьянская одежда XIX — начала XX в.; Русские. Историко-этнографический атлас, стар. 221—222.

эстонскія, асабліва літоўскія і польскія, ад якіх адрозніваліся другараднымі дэталямі — характарам і расфарбоўкай арнаменту, а таксама даўжынёй і шырынёй. (У адрозненне ад польскіх даўжыня беларускіх фартухоў амаль заўсёды супадала з даўжынёй спадніцы).

Тыпалагічная блізкасць беларускіх фартухоў да фартухоў заходніх суседзяў дае падставу меркаваць аб іх паходжанні ад агульнага прататыпа.

У паўднёва-ўсходняй частцы Беларусі белыя палатняныя або з куплёных тканін фартухі заўсёды ўпрыгожваліся тканым ці вышытым арнаментам. Асабліва разнастайна аздабліваліся фартухі на Палессі. У паўночна-заходніх раёнах фартухі звычайна насілі толькі на працу, таму ўпрыгожваліся яны не так старанна.

Характэрнай састаўной часткай беларускага жаночага комплексу з'яўлялася безрукаўка, якая, як і сшытая спадніца, збліжала беларускі касцюм з касцюмам заходнееўрапейскіх народаў.

У нас няма даных, якія дазволілі б устанавіць дакладна, калі з'явіліся ў касцюме беларускіх сялянак безрукаўкі. На думку Б. А. Куфціна, комплекс, які зацвердзіўся з XV ст. у заходнееўрапеўскіх краінах і складаўся са спадніцы і ліфа, далёка распаўсюдзіўся на ўсход, пранікнуўшы на ўсходняе ўзбярэжжа Балтыйскага мора і ў Польшчу [29]. Комплекс з безрукаўкай даволі рана і ў больш тыповым еўрапейскім выглядзе пранікнуў у Літву. У пісьмовых літоўскіх крыніцах ён упершыню ўпамінаецца ў XVII ст. У іншых прыбалтыйскіх народаў (латышоў, эстонцаў) безрукаўка з'явілася значна пазней, ужо ў XIX ст. У Літву безрукаўкі трапілі хутчэй за ўсё праз Польшчу; праз Польшчу ж, відавочна, прыйшлі яны і на Беларусь, якая разам з Літвой у гэты перыяд уваходзіла ў Рэч Паспалітую.

На Беларусі комплекс жаночага касцюма з безрукаўкай з'явіўся, магчыма, таксама як і ў Літве, у XVII ст., таму што ў XVIII ст. ён ужо быў шырока вядомы ў гарадскім касцюме мяшчан. На працягу XVIII—XIX стст. комплекс з безрукаўкай распаўсюдзіўся і ў сялянскім асяроддзі, хаця трэба адзначыць, што паўсямеснага распаўсюджання на Беларусі ён не атрымаў. Зусім не насілі безрукавак у радзе вёсак Віцебшчыны, Магілёўшчыны, Гомельшчыны, Брэстчыны. У адных месцах безрукаўкі насілі толькі пажылыя жанчыны, у іншых яны ўваходзілі ў дзявочы касцюм і былі абавязковай прыналежнасцю пасагу, а пасля выхаду замуж толькі даношваліся. У паведамленні з паўночна-ўсходніх паветаў Віцебскай губерні (Суражскага, Полацкага, Дрысенскага, Лепельскага і Гарадоцкага) П. В. Шэйн пісаў: «Бачыць новы кітлік на старой было таксама дзівосна, як бачыць шапку на галаве жанчыны» [30]. У паўночна-заходніх раёнах Беларусі безрукаўкі, пашытыя з даматкнага палатна, у канцы XIX — пачатку XX ст. насілі звычайна пад кофтай, як ніжнюю бялізну.

Як ніводная частка касцюма, безрукаўка на Беларусі мела шматлікія назвы: «кабат», «гарсэт», «шнуроўка», «лейбік», «кітлік», «нагруднік», «каптан», «безрукаўка», «станік» і інш. Найбольш шырокае распаўсюджанне меў тэрмін «кабат». Ён панаваў у Магілёўскай, заходняй частцы Гомельскай вобласці і спарадычна ў іншых месцах Беларусі.

На Беларусь, верагодней за ўсё, гэты тэрмін прыйшоў з Польшчы (польск. *kabat* — кафтан, камзол, кофта). Турэцка-персідскі тэрмін «каба» — кафтан у сярэднія стагоддзі шырока ўкараніўся ў мовах многіх славянскіх народаў (сербаў, чэхаў, балгар). Вядомы гэты тэрмін быў і на Украіне. Ён адзначан таксама ў рускіх, як у пісьмовых крыніцах XVII ст. (у дастасаванні да царскага адзення), так і ў народным ужытку ў Архангельскай, Валагодскай, Смаленскай губернях.

Ва ўсіх народаў, акрамя беларусаў і часткова ўкраінцаў, кабатам называлася верхняя сукенка з рукавамі (балг.), кофта (серб.-харв.), сурдут (чэш.), рабочая рубаха, якая надзявалася зверху кафтана (руск.), кафтан (польск.), салдацкі мундзір (укр.), г. зн. тып адзення, у нейкай меры аналагічны турэцкай кабе. Трэба адзначыць, што і ў беларусаў у асобных вёсках Віцебшчыны, па сведчанню М. Каспяровіча, кабатам называлі сукенку [31]. На Магілёўшчыне тэрмін «кабат» ужывалі звычайна да безрукаўкі, якая прышывалася да андарака і складала з ім нібы адно цэлае — сукенку без рукавоў. У пераважнай большасці выпадкаў у беларусаў кабатам называлася адзенне без рукавоў, якое насілася асобна. У значэнні жаночага камзола без рукавоў тэрмін «кабат» сустракаецца ў старажытных беларускіх актах. Такім чынам, запазычаны тэрмін «кабат» на Беларусі з даўніх часоў абазначаў своеасаблівае безрукаўнае адзенне.

Амаль ва ўсіх раёнах Беларусі былі вядомы тэрміны «гарсэт» і «шнуроўка» ў розных фане-

[29] Б. А. Куфтин. Материальная культура русской мещеры, ч. 1, стар. 47.

[30] П. В. Шейн. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. III. СПб, 1902, стар. 48.

[31] М. І. Каспяровіч. Віцебскі краёвы слоўнік. Віцебск, 1927, стар. 147.




Рыс. 5. Тыпы жаночых безрукавак:

*а* — гарсэт (выгляд сперадў і ззаду), в. Ветчына Пінскага п. Мінскай губ.; *б* — кабат (выгляд спераду і ззаду), в. Гарадзішча Быхаўскага п. Магілёўскай губ.; *в* — кабат (выгляд спераду і ззаду), Ігуменскі п. Мінскай губ.; *г* — гарсэт (выгляд спераду і ззаду), в. Обрава Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл.; *д*, *е* — гарсэт (выгляд спераду і ззаду), Ігуменскі п. Мінскай губ.




Карта 7. Тыпы крою жаночай безрукаўкі (канец XIX — пачатак XX ст.):

*1* — з адразной спінкай і прамымі суцэльнымі полкамі; *2* — з прамой цэльнай спінкай (доўгія); *3* — з адразной спінкай са складкамі ці зборкамі па ўсяму нізу; *4* — з адразной ці суцэльнай прыталенай спінкай з разрэзамі ці ўстаўнымі клінамі ўнізе; *5* — суцэльныя доўгія з разрэзамі ўнізе; *6* — кароткія, прышытыя да спадніцы; *7* — споднія з дамотканага палатна; *8* — безрукавак не насілі (*а* — пераважае, *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

тычных варыянтах. Іншыя назвы сустракаюцца спарадычна ў розных месцах Беларусі.

Некаторыя назвы безрукаўкі лёгка тлумачацца яе прызначэннем. Так, «станік», «нагруднік», «безрукаўка», «шнуроўка» адлюстроўваюць характэрныя асаблівасці гэтага віду адзення, якое прыкрывала верхнюю частку цела — грудзі, стан. Паколькі безрукаўка сцягвала верхнюю частку цела, яна служыла адначасова ліфам і гарсэтам. Вельмі рэдкія тэрміны «лейбік», «кітлік» перайшлі да беларусаў, верагодна, ад яўрэйскага насельніцтва.

Характэрна, што розныя назвы безрукавак не звязаны ні з нейкімі пэўнымі тыпамі крою, ні з характарам упрыгожанняў, ні з якасцю матэрыялу. Безрукаўка любога крою называлася кабатам, гарсэтам і г. д. У той жа час аднолькавыя па крою безрукаўкі называліся таксама па-рознаму ў розных месцах (рыс. 5).

У нагрудным плечавым безрукаўным адзенні асноўная тыпалагічная асаблівасць вызначаецца даўжынёй, кроем спінкі і афармленнем набедранай часткі.

У беларусаў былі распаўсюджаны кароткія безрукаўкі — да таліі і доўгія — ніжэй таліі (карта 7).

Кароткія безрукаўкі шыліся звычайна з прамой спінкай. Яны нярэдка не даходзілі да верхняга краю спадніцы, і паміж спадніцай і безрукаўкай была відаць кашуля. Доўгія безрукаўкі сваім ніжнім краем закрывалі верхнюю частку спадніцы (дадатак, XXI—XXIII). Даўжыня

іх ніжэй таліі была прыкладна роўнай шырыні далоні, у радзе месц (Слуцкі і Мінскі паветы Мінскай губерні) яна дасягала 1/4 аршына (каля 20 см).

Найбольш просты крой доўгіх безрукавак — прамы, калі спінка кроілася з суцэльнага куска матэрыялу. Пры найбольш складаным крої спінка мела адзін шоў пасярэдзіне або два бліжэй да бакоў. У доўгіх безрукаўках, падагнаных па фігуры з дапамогай швоў або вытачак, з'явілася неабходнасць неяк расшырыць ніжнюю частку, якая клалася на бёдры. У неадразных безрукаўках матэрыял, які ляжаў на бёдрах, разразаўся. Разрэзы, або падрэзы, часам рабіліся толькі ў двух месцах — на баках. Але часцей разрэзы — «распорышкі» ішлі вакол усёй безрукаўкі праз 10—15 см адзін ад аднаго. Чатырохвугольныя ласкуты: «крысы» (Слуцкі раён), «каліткі» (Лунінецкі раён), «кідзеры», «кудзеры» (Ашмянскі раён), якія ўтвараліся ў выніку гэтага, абшываліся або тым самым матэрыялам, або тасьмой у тон вышыўкі. Доўгія безрукаўкі з суцэльнай спінкай, з клінамі або разрэзамі па нізу нагадваюць безрукаўку татар і іншых цюркскіх народаў.

Для цэнтральнай Беларусі (Случчына, Міншчына) характэрны былі доўгія безрукаўкі, якія сваім свабодным кроем больш нагадвалі жакет без рукавоў, чым тыповы гарсэцік. Агульны крой безрукавак, на думку некаторых даследчыкаў, нагадваў сербскае верхняе адзенне.

Ва ўсіх відах безрукавак быў разрэз спераду, які ішоў пасярэдзіне або трошкі збоку. Толькі ў радзе месц Віцебшчыны безрукаўкі падобна сапраўднаму гарсэту сцягваліся шнуроўкай не спераду, а ззаду. На грудзях такая безрукаўка ляжала роўна і не мела глыбокага выразу. У адрозненне ад сапраўднага гарсэта гэта безрукаўка была без цвёрдых пласцін. Вакол таліі да безрукаўкі прышывалася апаяска з тканіны хатняга вырабу, але добра падабраная да матэрыялу безрукаўкі [32]. Спераду безрукаўка зашпільвалася на гузікі («гафтыкі») або на гаплікі, зашнуроўвалася матузом або стужкай, для чаго па краях разрэзу прышываліся або прамётваліся прарэшкі. Гузікі былі і купленыя і хатняга вырабу, абцягнутыя тым жа матэрыялам, з якога шылася безрукаўка. На грудзях у безрукаўках рабіўся выраз круглай, трохвугольнай або чатырохвугольнай формы. Ззаду спінка даходзіла прама да шыі і яе верхні край хаваўся пад каўнер кашулі. Часам пярэдні выраз безрукаўкі ад каўняра да стану закладваўся цвёрдай «закладкай» з матэрыялу таго ж колеру, што і безрукаўка. На закладцы залатымі ніткамі вышываліся кветкі [33]. Кароткія безрукаўкі часцей за ўсё былі аднабортнымі, але сустракаліся і такія, у якіх для больш шчыльнага аблягання фігуры накладвалася полка на полку.

Безрукаўкі шыліся часцей за ўсё з куплёных тканін: сукна, паркалю, танных гатункаў парчы і аксаміту. Для безрукавак падбіраліся даволі яркія расфарбоўкі: аднатонныя — пунсовыя, зялёныя, чырвоныя, бардовыя, сінія і ўзорныя — з вялікімі яркімі набіўнымі або ціснёнымі кветкамі. Шыліся яны звычайна на падкладцы з хатняга палатна.

Своеасаблівасць беларускім безрукаўкам надавалі дадатковыя ўпрыгожанні. Рабіліся яны часцей за ўсё на грудзях па краях разрэзу, вакол каўняра, вакол рукаўных проймаў і радзей па ніжняму краю і на спіне. Упрыгожваліся безрукаўкі нашыўкай парчовых стужак і тасьмы, а часцей вышыўкай любой тэхнікі. Вышывалі звычайна бавоўнянымі ніткамі, а больш заможныя сяляне — шоўкам, сярэбранай або залатой ніткай. Шырока была вядома аплікацыя: стужкі нашываліся ў некалькі вертыкальных радоў або ў выглядзе хвалістай лініі, зубчыкаў ці шашачак (рыс. 6).

Вышыўка была больш светлых таноў, чым матэрыял безрукаўкі, і адлюстроўвала звычайна раслінныя формы — кветкі і галінкі, якія размяшчаліся сіметрычна.

Акрамя безрукавак, якія з'яўляліся самастойнай часткай касцюма, на Беларусі былі вядомы безрукаўкі, якія прышываліся да спадніцы, часцей да шарсцянога саяна-андарака. Яны мелі выгляд ліфа з шырокімі праймамі і шыліся з тканіны іншай якасці і іншай расфарбоўкі, чым спадніца.

Як паказвае прыведзены матэрыял, фарміраванне тыпаў плечавога адзення без рукавоў — вельмі складаны працэс і не зусім высветлены да гэтага часу. Несумненна толькі тое, што ўсю разнастайнасць назваў і відаў крою безрукавак нельга звязваць з нейкім адным прататыпам. Безрукаўкі ў сельскую мясцовасць прыйшлі, відавочна, рознымі шляхамі.

Нацыянальная своеасаблівасць беларускага народнага адзення, апрача матэрыялу і крою, праяўляецца таксама ў характары расфарбоўкі тканін, характары арнаменту і каляровай гаме. І калі па матэрыялу, асобных прадметах адзення або дэталях крою беларускі касцюм мае аналогіі, як ужо адзначалася, з рускім, украінскім, польскім, літоўскім, то ў агульным

[32] Н. Я. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья..., стар. 120.

[33] А. Бульба. Некалькі слоў аб дзявочай вопратцы на Беларусі. Вільна, 1911, стар. 12.




Рыс. 6. Тыпы жаночых безрукавак:

*а* — кабат (выгляд спераду і ззаду), в. Кушня Слуцкага п. Мінскай губ.; *б* — гарсэт (выгляд спераду і ззаду), в. Убібацькі Любанскага р-на Мінскай вобл.; *в* — карсэтка (выгляд спераду і ззаду), в. Парэчча Ігуменскага п. Мінскай губ.; *г* — кабат (выгляд спераду і ззаду), в. Чучавічы Мазырскага п. Мінскай губ.

комплексе ўсіх пералічаных вышэй кампанентаў, у каляровых спалучэннях беларускі касцюм уяўляе своеасаблівую культурную з'яву.

Універсальным для беларускага народнага адзення было ільняное, зрэдку пяньковае палатно. З яго шылі плечавое (кашулі, кофты, безрукаўкі), паясное (фартухі, спадніцы) і ў радзе месц верхняе адзенне.

У адзенні, пашытым з палатняных тканін, нават і тады, калі ва ўжытак увайшла афарбоўка хатніх тканін, пераважаў белы колер. Як сведчаць археолагі, адзенне з адбеленых ільняных палотнаў было ў шырокім ужытку ў старажытных славян.

Шарсцяныя і паўшарсцяныя тканіны, з якіх шылася верхняе адзенне, былі заўсёды натуральнага колеру — колеру сыравіны, якая ўжывалася для іх вырабу. Гэта было карычневае, чорнае, шэрае, радзей белае сукно. Шарсцяная тканіна для беларускага жаночага (спадніцы) і мужчынскага паяснога (штаны) і плечавога адзення (безрукаўкі) заўсёды афарбоўвалася.

У Беларусі ў XIX — пачатку XX ст. было распаўсюджана тканнё каляровых і ўзорных шарсцяных і паўшарсцяных тканін. Для аднатонных шарсцяных спадніц пераважным з'яўляўся сіні, зялёны, вішнёвы і асабліва чырвоны колер.

Шматлікія спосабы перапляцення нітак пры тканні размяркоўваюцца па асобных лакальных і нацыянальных групах і побач з тыпамі адзення з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для ўстанаўлення гісторыка-культурных сувязей паміж народамі.

Узорная шарсцяная тканіна для андаракаў па тэхніцы ткання і па агульнаму малюнку (аднатонная і клетка рознага памеру і выгляду) вельмі блізкая да рускай панёўнай тканіны.

У другой палавіне XIX ст. у сялян у шырокі ўжытак уваходзіць узорнае тканнё бранай тэхнікай. Спосаб мастацкага ткання бранай тэхнікай быў шырока распаўсюджан таксама ў рускіх у паўночных і цэнтральных абласцях і ў літоўцаў. Браная тэхніка атрымала назву ад слоў «браць», «выбіраць». Заключаецца яна ў тым, што ззаду за нітамі ніткі асновы выбіраюцца па ліку, перакладваюцца прутком або перавязваюцца дадатковымі петлямі з нітак. Ткуць пры дапамозе двух уткоў. Націскаюць падножку, утвараецца зеў — прапускаюць белы ўток, пасля таго пад частку перавязаных нітак падкладваюць дошчачку на кант; група выбраных нітак паднімаецца, прапускаюць другі ўток — чырвоны, прыбіваюць бёрдам. Пасля гэтага апускаюць дошчачку, кладуць яе плазам і націскаюць другую падножку — прапускаюць белы ўток, дошчачку падкладваюць пад наступную частку выбраных нітак, ставяць на кант і г. д.[34] З-за таго, што дадатковы зеў утвараецца пры дапамозе дошчачкі, часта і спосаб ткання называецца тканнём «на дошчачцы». У залежнасці ад таго, колькі разоў даводзіцца падкладваць дошчачку, каб утварыць поўны ўзор, гавораць: «узор у 3 дошчачкі», «узор у 5, 7, 10, 20 і г. д. дошчачак», прычым гэта назва адносіцца толькі да палавіны ўзору, таму што другая палавіна яго з'яўляецца заўсёды адваротным паўтарэннем першай. Мастацкае ткацтва выконвалася ў Беларусі на звычайных сялянскіх кроснах, у якіх для атрымання неабходнага малюнка рабілі некаторыя прыстасаванні: дадатковыя ніты, дошчачкі, пруткі і г. д.

У арнаментальна затканых узорах паўсюдна вядомай у беларусаў з'яўляецца аднаколерная (чырвоная), а ў вышыўцы двухколерная (чырвоная і чорная) каляровая гама. Тканы арнамент упрыгожвае спадніцы, пашытыя з хатняга непафарбаванага палатна, палатняныя сарочкі (мужчынскія і жаночыя), фартухі і старажытны галаўны ручніковы ўбор — намітку.

Тканы ўзор чырвонай «забалоццю» (баваўняныя ніткі, якія яшчэ называюцца гарынем) у спадніцах складаўся з простага набору палос, размешчаных у адзін або ў некалькі радоў па нізу спадніцы, крыху вышэй ад ніжняга краю. Нескладаныя тканыя ўзоры чырвонай «забалоццю» ўпрыгожвалі таксама канцы намітак. Падобныя палосы сустракаюцца ў фартухах больш даўняга вырабу.

У канцы XIX — пачатку XX ст. тканая арнаментыка адзення ўзбагацілася новымі, больш ускладненымі матывамі, аднак захавалася яе традыцыйная геаметрычная аснова. Асабліва шырока новыя матывы ў арнаментыцы ўжываліся ў кашулях і фартухах, г. зн. у рэчах, якія доўга захоўвалі дамінуючую ролю ў комплексе народнага адзення.

Вельмі разнастайны ўзор «затыкання» назіраецца на фартухах. Размяшчаўся ён часцей гарызантальнымі палосамі па 2—3 і больш у ніжняй частцы рэчы. Узор з вертыкальнымі палосамі сустракаўся радзей, пры гэтым палосы ўпрыгожвалі ўсю паверхню фартуха.

Затканы арнамент фартухоў быў звычайна геаметрычнага характару: рысачкі, ромбікі, квадрацікі розных памераў, крыжыкі, зорачкі і іншыя геаметрычныя фігуры размяшчаліся ў разнастайнай камбінацыі і чаргаванні.

Аналагічны строгі геаметрычны тканы ўзор упрыгожваў і традыцыйную палатняную жано-

[34] Н. И. Лебедева. Прядение и ткачество восточных славян. У кн.: Восточнославянский этнографический сборник. М., 1956, стар. 527—528.

чую кашулю. Размяшчаўся ён у верхняй частцы рукавоў, на паліках, каўняры, манішцы, абшлагах. Упрыгожанні па нізу (2—3 палоскі з прапушчаных ва ўток чырвоных нітак) у жаночых кашулях сустракаліся вельмі рэдка, пераважна ў паўднёвых раёнах.

На рукаве звычайна ўпрыгожвалася верхняя частка бліжэй да шва, а таксама манжэта, а калі яе не было, упрыгожваўся ніжні пруг. У паўднёва-заходніх раёнах іншы раз упрыгожвалі ўсю вонкавую частку рукава ад верху да нізу падоўжнымі або папярочнымі палосамі рознай шырыні і арнаменту, часцей за ўсё геаметрычнага. Палікі ўпрыгожваліся або цалкам, або вузкай палоскай ля месца сшывання іх з рукавом. Малюнак на паліках у большасці выпадкаў гарманіраваў па колеру і арнаменту з малюнкам на рукавах, тады як арнамент на іншых упрыгожаных частках кашулі мог і адрознівацца.

Упрыгожанні на каўняры размяшчаліся або па ўсім каўняры, або толькі па вонкаваму краю ці на ражках. На грудзях упрыгожвалася прышыўная манішка.

Арнаментальныя матывы геаметрычнага характару ва ўпрыгожаннях — ромбы, разеткі і інш.— бяруць свой пачатак з глыбокай старажытнасці і з'яўляюцца характэрнымі не толькі для беларусаў, але і для іншых усходнеславянскіх народаў. Аднак своеасаблівае спалучэнне фігур, размяшчэнне іх на рэчы складае нацыянальную асаблівасць беларускага адзення.

У канцы XIX ст. ткацкі арнамент пачалі замяняць вышытым узорам, які накладваўся з дапамогай іголкі. У пачатку XX ст. вышыўка становіцца адным з папулярных відаў народнага прыкладнога мастацтва. Найбольш ранні вышыты арнамент па малюнку мала чым адрозніваўся ад тканага: тут таксама найбольш распаўсюджанымі з'яўляліся геаметрычныя формы. Раслінныя формы сустракаліся галоўным чынам у контурных лінейных вышыўках пры ўпрыгожванні аддзення з аўчыны, а таксама ў вышыўцы на палатне, выкананай па графічнаму малюнку. Нярэдка можна было сустрэць адначасова і тканы, і вышыты ўзор. Вышыўка часцей за ўсё размяшчалася ў выглядзе бардзюра, дзе рытмічнае чаргаванне матываў стварала ўражанне бясконцай паласы.

Спалучэнне геаметрычнага ўзору з раслінным, затыкання з вышыўкай — адна з характэрных рыс мастацкага ўпрыгожання беларускага народнага адзення XIX—пачатку XX ст.

У беларусаў былі шырока вядомы агульныя для ўсіх усходнеславянскіх народаў прыёмы вышыўкі: набор, браннё, якое нагадвала тканую браную тэхніку з характэрным негатыўным адлюстраваннем на адвароце; строчка, выраз, выкананыя на тканіне з выцягнутымі ніткамі; насціланне, калі ніткі вышыўкі клаліся па ўтку, аснове або па дыяганалі перапляцення нітак тканіны. Вельмі даўнім спосабам вышывання з'яўляецца крыж.

Вышыўка, як і тканнё, выконвалася пераважна фабрычнымі баваўнянымі ніткамі — «забалоцію», але ў адрозненне ад затыкання ў вышыўцы пераважала двухколерная гама — адна з характэрных рыс беларускага народнага арнаменту. Паліхромная расфарбоўка, тыповая для заходніх абласцей Украіны (Гуцульшчына), у беларусаў сустракалася даволі рэдка і з'явілася ў народнай вышыўцы значна пазней — ужо ў савецкі час, калі побач з баваўнянымі шырока пачалі выкарыстоўвацца шаўковыя ніткі.

Даволі даўнім відам упрыгожання беларускага народнага адзення, галоўным чынам жаночага, з'яўляюцца мярэжка, а таксама вязаныя вырабы.

Нягледзячы на тое што выраб карункаў у Беларусі не вырас у спецыяльны промысел, як у рускіх, карункі шырока выкарыстоўваліся для ўпрыгожвання жаночага адзення. Карункі прышывалі да кашулі з каўняром, да фартухоў, блузак і нават да спадніц. Узоры карункаў шмат у чым нагадвалі мастацкае ткацтва і вышыўку, толькі тут было больш крывых і звілістых ліній. У залежнасці ад гнуткасці самой тэхнікі вязання, карункавая арнаментыка была больш разнастайнай у параўнанні з ткацкай.

З пранікненнем у вёску фабрычных матэрыялаў — сітцу і каленкору распаўсюдзілася аплікацыя — нашыўка рознакаляровых стужак і галуноў. Нашыўныя ўзоры сустракаюцца на фартухах, безрукаўках, спадніцах (палатняных і шарсцяных) і нават на кашулях. Нашывалі часцей чырвоныя палоскі, зубчыкі, ромбікі, якія часта спалучаліся ў адзінай кампазіцыі.

Спадніцы ўпрыгожваліся нашыўкай шаўковых стужак, тасьмы, махроў або вузкіх карункаў. Нашыўкі, як і тканыя арнаментаваныя палосы, ішлі або ў некалькі радоў па ніжняму краю, або ў пэўным чаргаванні па ўсёй спадніцы. Найбольш заможныя сяляне спадніцы і безрукаўкі ўпрыгожвалі парчовым галуном — «галёнамі». Парчовым галуном упрыгожвалі іншы раз станік саянаў, нашываючы яго вакол рукаўнага і шыйнага выразаў, а таксама каля груднога разрэзу.

Варта, аднак, адзначыць, што для беларускага народнага касцюма, як жаночага, так і мужчынскага, не характэрны бліскучыя галунныя ўпрыгожанні і вышыўка сярэбранай і шаўковай ніткай. Уся прыгажосць, усё багацце беларускай арнаментыкі складаў пяшчотны строгі ўзор, выкананы двухкаляровымі або ад-

накаляровымі баваўнянымі ніткамі. Умелае вар'іраванне розных геаметрычных і раслінных фігур, увязка колеру малюнка з агульным каларытам касцюма складаюць нацыянальную своеасаблівасць беларускага адзення.

Не выбіваліся з агульнага каларыту і дадатковыя здымныя ўпрыгожанні, якія беларусы ўжывалі з даўніх часоў: пацеркі, завушніцы, пярсцёнкі і да т. п. Усе яны толькі падкрэслівалі прастату і арыгінальнасць беларускага народнага касцюма.

Комплекс беларускага адзення канца XIX— пачатку XX ст., як паказваюць прыведзеныя матэрыялы, складаўся з кашулі, пашытай з даматканага палатна, спадніцы — палатнянага або шарсцянога андарака, палатнянага фартуха і безрукаўкі, пашытай звычайна з куплёных тканін.

Абавязковым дадаткам да гэтага касцюма былі верхняе (суконнае і футравае) адзенне, своеасаблівыя галаўныя ўборы і абутак (лыкавы або скураны).

Тыпалогія верхняга адзення абумоўліваецца таксама раскроем спінкі і спосабам сшывання верху з нізам у адрозных яе формах. Іменна па гэтых прыкметах вызначаецца этнічная і лакальная своеасаблівасць гэтай часткі касцюма.

Этнаграфічная тыпалагізацыя ў галаўных уборах і абутку хоць і грунтуецца на тых жа прынцыпах, што і ў адзенні, аднак мае і свае адметныя рысы, выкліканыя своеасаблівасцю прызначэння гэтых прадметаў.

Прыведзены матэрыял паказвае, што на працягу стагоддзяў у беларускага сялянства склаўся даволі ўстойлівы і характэрны комплекс жаночага адзення, які фарміраваўся пад уплывам кліматычных, гістарычных і сацыяльна-эканамічных умоў жыцця. Асобныя часткі і элементы яго ўзыходзяць да розных гістарычных эпох.

## ГАЛАЎНЫЯ ЎБОРЫ

Галаўныя ўборы складалі самую каларытную і маляўнічую частку беларускай жаночай вопраткі, якая прыдавала ўсяму народнаму касцюму завершанасць і святочнасць. Галаўны ўбор падкрэсліваў рысы твару жанчыны, упрыгожваў яе. Таму з даўніх часоў галаўным уборам жанчыны надавалі вялікае значэнне. Кожны галаўны ўбор формай і спосабам нашэння строга адпавядаў прынятаму ў дадзенай мясцовасці стандарту, а матэрыял, з якога ён рабіўся, яго ўпрыгожанні залежалі ад фантазіі, густу і ступені заможнасці жанчыны. Для традыцыйных галаўных убораў выкарыстоўвалася заўсёды самае тонкае палатно і тыя куплёныя фабрычныя тканіны, якія толькі былі даступны вясковай жанчыне. Разнастайнасць, маляўнічасць і яркасць галаўных убораў беларускіх жанчын адзначалі многія аўтары [35]. Разам з тым галаўныя ўборы, як ні адна іншая частка жаночай вопраткі, заўсёды строга адпавядалі ўзросту жанчыны. Так, галаўныя ўборы пажылых жанчын, хоць і захоўвалі заўсёды традыцыйную форму і колер, былі вельмі сціплымі, без упрыгожанняў.

Галаўныя ўборы беларускіх жанчын заўсёды адпавядалі іх сямейнаму становішчу. «Як вянок быў прыкметай дзявоцтва і мог насіцца толькі дзяўчынай, так і чапец быў прыкметай замужжа» [36].

Традыцыйныя беларускія жаночыя галаўныя ўборы, спосабы іх нашэння і неразрыўна звязаныя з імі прычоскі, нягледзячы на нацыянальную спецыфіку, маюць шмат агульнаславянскіх рыс. Так, як адзначалі многія даследчыкі, беларускім дзяўчатам была ўласціва агульная ўсходнеславянская прычоска [37], пры якой валасы зачэсвалі гладка на прамы прабор і на патыліцы запляталі ў 1—2 касы. Прычым трэба адзначыць, што на большай частцы тэрыторыі Беларусі для дзяўчат не мела ніякай розніцы і значэння пляценне валасоў у 1 ці ў 2 касы. Толькі ў прыгранічных з Расіяй паветах паўночнай Беларусі (Полацкі, Верхнядзвінскі і Лепельскі) у дзяўчат пераважала прычоска ў адну касу, а на поўдні Палесся — у дзве касы. Заплеценыя ў косы валасы пакідалі звычайна свабодна звісаючымі ўздоўж спіны або абкручвалі вакол галавы ў выглядзе вянка.

Жаночыя галаўныя ўборы канца XIX — пачатку XX ст. шыліся ў асноўным з фабрычных тканін з шырокім выкарыстаннем для іх аздобы стужак, тасьмы, вышыўкі. У святы дзяўчаты ў косы ўпляталі стужкі фабрычнага вырабу — «каснікі», «укоснікі», «закоснікі», «стужкі», а ў штодзённым абыходзе проста акройкі каляровай матэрыі — «плёткі»,

[35] И. Эремич. Очерки белорусского Полесья. Вильна, 1868, стар. 7; Живописный альбом «Народы России». СПб, 1880, стар. 46; Россия. Полное географическое описание нашего Отечества, т. 9. СПб, 1905, стар. 146 і інш.

[36] J. Smoliński. Kaptur i namiotka na Białorusi Litewskiej. «Ziemia», 1911, № 9, стар. 136.

[37] Г. С. Маслова. Народная одежда русских, украинцев и белорусов, стар. 656; Д. К. Зеленин. Женские головные уборы..., стар. 304—305; Л. А. Молчанова. Материальная культура белорусов, стар. 165 і інш.

«уплёткі», «стужкі», «пахісткі» [38]. Звычайна ў касу ўплятталі па адной стужцы-касніку і толькі на Палессі па святах — адначасова па 3—5 рознакаляровых стужак. Часам касу заплятталі не да канца, а пакідалі амаль напалавіну расплеценай. Відаць, гэта агульнаславянская рыса ў беларускай дзявочай прычосцы, таму што ў балгар існуе звычай таксама недаплятаць касу [39].

Галаўныя ўборы і прычоскі раней за ўсё падвергліся ўздзеянню гарадской моды. У пачатку XX ст. у блізка размешчаных ад гарадоў вёсках Віцебшчыны і раёнах, дзе было найбольш развіта адыходніцтва, многія дзяўчаты кос па святах не заплятталі, а на гарадскі лад закручвалі валасы на патыліцы ў пучок («куклу», «куксу», «гулу») і замацоўвалі іх шпількамі або драўлянымі грэбенямі. Аднак штодзённай прычоскай і ў гэтых месцах заставалася ўсё-такі заплятанне валасоў у косы.

У цёплую пару года і ў хаце дзяўчаты не насілі ніякіх галаўных убораў. Непакрытыя валасы лічыліся ў беларусаў, як і ва ўсіх усходніх славян, адзнакай дзявоцтва. Таму такія старажытныя дзявочыя галаўныя ўборы, як вянкі, не мелі верху, а галаўныя павязкі («шырынкі», «ручнікі», «скіндачкі») у выглядзе вузкага ручніка з арнаментаванымі канцамі або налобнікам павязваліся такім чынам, што не закрывалі валасоў на макушцы [40]. Шырыня дзявочых галаўных павязак была каля 30 см, даўжыня — 1—1,2 м. Пры павязванні яны заўжды складваліся ўдвая і завязваліся вузлом на патыліцы. У вёсцы Славань Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці «скіндачка» рабілася звычайна з кавалка белай куплёнай тканіны, да канцоў якога прышываліся рознакаляровыя стужкі [41].

У сярэдзіне XIX ст. дзявочыя галаўныя павязкі былі шырока распаўсюджаны на ўсёй Беларусі [42], аднак к канцу XIX ст. амаль поўнасцю былі выцеснены хусткамі.

У Гомельскім павеце Магілёўскай губерні ў канцы XIX ст. паверх заплеценых у косы валасоў дзяўчаты насілі складзеную па дыяганалі палоскай хустку, якую завязвалі ў выглядзе вянка з вісячымі ззаду канцамі [43]. Такім жа чынам павязвалі дзяўчаты хусткі ў канцы XIX — пачатку XX ст. і ў Клімавіцкім павеце Магілёўскай губерні. Толькі ў некаторых вёсках гэтага павета дзяўчаты ў складзеную палоскай па дыяганалі хустку ўкладалі яшчэ кавалкі кардона або лубу шырынёй 10—15 см і памерам па аб'ёму галавы. Канцы хусткі завязвалі ззаду на вузел [44].

У пачатку XX ст. дзявочыя галаўныя павязкі (па даных экспедыцый ІМЭФ АН БССР) былі распаўсюджаны толькі ў Клімавіцкім павеце Магілёўскай губерні і Бабруйскім павеце Мінскай губерні. Нашэнне «шырынак» у гэты час на поўдні Мінскай губерні адзначаў і І. А. Сербаў [45].

У вёсцы Узлогі Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні (на мяжы з Расіяй) на святы дзяўчаты павязвалі «бахмару» (відаць, ад слова «бахрама») — нешырокую павязку з тонкага адбеленага палатна. «Бахмара» ўпрыгожвалася кругом невялічкімі кутасікамі («пуклямі») з чырвоных і чорных бумажных нітак і моцна крухмалілася. Яна складвалася па даўжыні ў два разы і завязвалася вакол галавы вузлом на патыліцы [46].

У канцы XIX — пачатку XX ст. у летнюю пару дзяўчаты хадзілі звычайна з непакрытай галавой. Хусткі завязвалі толькі ў час палявых работ, каб прыкрыць галаву ад сонца, на святы і ў дарогу. У такіх выпадках складзеныя па дыяганалі хусткі павязвалі пад падбародак або вакол галавы, завязваючы канцы зверху задняга касячка хусткі (рыс. 9, г). У святы яркія каляровыя хусткі павязвалі пад падбародак, пакідаючы спераду частку валасоў адкрытай. У Гродзенскай губерні да павязаных святочных хустак дзяўчаты прымацоўвалі па 2 букеты жывых або штучных кветак [47].

Другі традыцыйны дзявочы галаўны ўбор — вянок. Аснова вянка рабілася з цвёрдага матэрыялу — лубу, бяросты, палоскі кардону звычайна шырынёй 10—15 см, сагнутай па аб'ёму галавы і абшытай палатном. Вышыня вянка была аднолькавая вакол усёй галавы, верх — заўсёды адкрытым. Паверх палатна з вонкавага боку вянок абшываўся яркай ткані-

[38] П. В. Шейн. Материалы для изучения быта и языка..., т. III, стар. 51.

[39] М. Г. Велева, Е. И. Лепавцова. Народная одежда болгар в Северной Болгарии в XIX и начале XX вв. София, 1961, стр. 16.

[40] Д. К. Зеленин. Женские головные уборы..., стар. 305—306; И. А. Сербов. Белорусы-сакуны, стар. 24.

[41] Архіў ІМЭФ, ф. 6, воп. 6, спр. 1, лл. 27, 33.

[42] Белоруссия. (Этнографический очерк). «Московские губернские ведомости», 1854, № 148; Быт белорусских крестьян. «Вестник РГО», ч. IX, кн. 5, 1853, стар. 45.

[43] В. Ф. Миллер. Систематическое описание коллекций Дашковского этнографического музея, вып. III. М., 1893, стар. 146—147.

[44] Архіў ІМЭФ АН БССР, ф. 6, воп. 11, спр. 558, л. 10.

[45] И. А. Сербов. Белорусы-сакуны, стар. 24.

[46] Архіў ІМЭФ АН БССР, ф. 6, воп. 11, спр. 557, л. 8.

[47] П. В. Шэйн. Материалы для изучения быта и языка..., т. III, стар. 74—75.




Карта 8. Тыпы вясельных галаўных убораў (канец XIX — пачатак XX ст.):

*1* — вянок на цвёрдай аснове+стужкі; *2* — штучныя кветкі на дроціку+стужкі; *3* — штучныя кветкі на дроціку+фата; *4* — штучныя кветкі на дроціку+фата+стужкі; *5* — хустка+вянок са штучных кветак на дроціку+стужкі; *6* — вянок з жывых кветак+стужкі; *7* — вянок з жывых кветак+фата; *8* — хустка (*а* — пераважае, *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

най, звычайна фабрычнага вырабу. Такія вянкі сустракаліся таксама і ў некаторых груп рускіх [48]. Прызначаныя для штодзённага нашэння вянкі нічым не ўпрыгожваліся. Такія вянкі дзяўчаты пачыналі насіць з дзесяцігадовага ўзросту [49]. Для вяселля гэты вянок з вонкавага боку шчодра ўпрыгожвалі жывымі або штучнымі кветкамі, фарбаваным пер'ем, а ззаду да ніжняга краю вянка чапляліся рознакаляровыя стужкі [50].

У канцы XIX ст. вянкі на цвёрдай аснове ўжываліся толькі як вясельны галаўны ўбор і то далёка не на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Раён бытавання такіх вянкоў ахопліваў Магілёўскую губерню, паўднёвыя паветы Мінскай губерні, Ваўкавыскі, Брэсцкі і Кобрынскі паветы Гродзенскай губерні (карта 8). Летам вянкі на цвёрдай аснове ў Магілёўскай губерні часта замяняліся вянкамі з жывых кветак. Бытаванне іх тут адзначаў і А. С. Дэмбавецкі [51].

У Віцебскай, на большай частцы Гродзенскай і Мінскай губерняў пераважалі ў гэты час

[48] Н. И. Лебедева. Народный быт в верховьях Десны и верховьях Оки, стар. 71.

[49] Н. Я. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья..., стар. 120.

[50] Там жа.

[51] А. С. Дембовецкий. Опыт описания Могилевской губернии..., кн. 1. Могилев, 1882, стар. 486.

купленыя або самаробныя вясельныя вянкі са штучных вашчаных або проста папяровых кветак, умацаваных у адзін рад на дроціку, сагнутым па аб'ёму галавы. Ззаду да вянкоў такога тыпу прымацоўвалася белая фата («валь», «туль», «павуцінне», «кісея», «маслёна», «фата») — лёгкае белае пакрывала з тонкага паркалю, марлі, якое спускалася па плячах і спіне і па даўжыні было роўна са спадніцай нявесты. Але ў некаторых мясцовасцях Магілёўскай і Лепельскім павеце Віцебскай губерняў да вясельных вянкоў на дроціку па традыцыі яшчэ прымацоўвалі замест фаты стужкі. У вёсках Суражскага, Невельскага паветаў Віцебскай губерні склаўся звычай, калі нявеста да купленага вянка разам з фатой прымацоўвала таксама і featureрознакаляровыя стужкі.

Вянкі са штучных кветак на дроціку са стужкамі ззаду былі пашыраны на тэрыторыі Палесся, частцы Гродзенскай і ў некаторых паветах Віленскай губерні.

Разам з вясельнымі вянкамі са штучных кветак у Кобрынскім і Брэсцкім паветах Гродзенскай губерні, Лідскім, Свянцянскім і Дзісенскім Віленскай губерні, Мазырскім павеце Мінскай губерні і на тэрыторыі сучаснага Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці бытавалі вянкі з жывой зелені руты ці барвенка (часам у спалучэнні са штучнымі кветкамі) з прымацаванымі ззаду рознакаляровымі стужкамі або фатой.

Руту і барвенак у гэтых мясцовасцях спецыяльна вырошчвалі на агародах і захоўвалі зялёнымі круглы год. Для гэтага жанчыны позняй восенню накрывалі расліны гліпянымі гаршкамі або гарлачамі і каля нізу крыху прысыпалі зямлёй. Пад такім пакрыццём расліны былі зялёнымі ўсю зіму.

Неабходна, аднак, адзначыць, што, нягледзячы на прыналежнасць да пэўнага тыпу, ні адзін вясельны вянок у дакладнасці не паўтараў іншыя. Атрымоўвалася гэта таму, што кожная жанчына, хоць і захоўвала заўсёды традыцыйную для дадзенай мясцовасці форму вянка, рабіла яго з даступных ёй матэрыялаў, аздабляючы ў адпаведнасці са сваім густам і мастацкімі здольнасцямі.

У гэты час у некаторых мясцовасцях Беларусі было прынята адзначаць у вясельных галаўных уборах або прычосках сіроцтва нявесты. У такіх выпадках вясельныя вянкі павінны былі адпавядаць пэўным традыцыйным патрабаванням. Так, у вёсцы Бараўцы Бабруйскага павета Мінскай губерні нявесце-сіраце вясельны вянок рабілі толькі з белых і чорных штучных кветак у суадносінах 3 : 1, а ў вёсцы Стасеўка таго ж павета — з белых і зялёных. У Ваўкавыскім павеце Гродзенскай губерні нявесце, калі ў яе не было аднаго з бацькоў, пад вянец запляталі касу толькі да палавіны [52].

Часам у адной і той жа мясцовасці ў канцы XIX — пачатку XX ст. бытавалі вянкі на цвёрдай аснове або вянкі з руты і барвенка разам з купленымі на дроціку. Куплялі вянкі больш заможныя сяляне.

Да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі звычайнай з'явай на беларускай вёсцы было калектыўнае карыстанне вясельнымі вянкамі. Часта на ўсю вёску было 1—2 вясельныя вянкі, якія беражліва захоўвалі гаспадыні ў куце пад іконай. Гэтымі вянкамі карысталіся пры выхадзе замуж усе вясковыя дзяўчаты, толькі стужкі для вянка нявеста сама збірала ў сваіх сяброўак.

Спрадычна ў радзе месц Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай губерняў у якасці вясельнага галаўнога ўбору выкарыстоўвалася хустка. Хустку, складзеную па дыяганалі, павязвалі пад падбародкам або вакол галавы такім чынам, што два канцы яе перакрыжоўваліся на патыліцы пад заднім касячком хусткі і завязваліся спераду над ілбом. Часам спераду і па баках галавы хустка нявесты ўпрыгожвалася кветкамі і зеленню, а ззаду да валасоў прымацоўваліся рознакаляровыя стужкі, якія звісалі з-пад хусткі ўздоўж спіны.

Вельмі цікава ўпрыгожвалі вясельную хустку у в. Аляксейкі Слонімскага павета Гродзенскай губерні: бралі 6 рознакаляровых стужак, складалі іх па дзве, скручвалі і прышывалі ў тры паласы па налобнай частцы складзенай па дыяганалі белай хусткі. Павязвалі яе не пад падбародак, а вакол галавы [53].

Валасы нявесце пад вянец звычайна заплягалі ў 1—2 касы або незаплеценыя перавязвалі на патыліцы каляровай стужкай.

На Палессі маладой пасля вянчання ў царкве надзявалі намітку, і яна насіла яе цэлы дзень. Па прыездзе нявесты ў хату жаніха свёкар здымаў намітку і сяброўкі расчэсвалі нявесце валасы, закручвалі іх на тканку і надзявалі чапец і хустку [54].

Прычоска і галаўныя ўборы рэзка змяняліся з выхадам дзяўчыны замуж. У канцы XIX — пачатку XX ст. у Беларусі ў рознай ступені бытавання існаваў складаны жаночы галаўны ўбор, які складаўся з наступных частак: 1) цвёрдай асновы, якая прыдавала форму ўсяму галаўному ўбору; 2) мяккага, звычайна

[52] Архіў ІМЭФ АН БССР, ф. 6, воп. 11, спр. 1154, л. 2.

[53] Архіў ІМЭФ АН БССР, ф. 6, воп. 11, спр. 626, л. 3.

[54] Архіў ІМЭФ АН БССР, ф. 6, воп. 6, спр. 3, л. 9; ф. 6, воп. 11, спр. 12, л. 30—31.




Рыс. 7. Традыцыйны галаўны ўбор з «пушанкай» і спосабы павязвання хустак:

*а* — «пушанка», в. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.; *б* — жанчына ў традыцыйным галаўным уборы з «пушанкай», в. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.; *в* — спосаб павязвання хустак, в. Шапілавічы Любанскага р-на Мінскай вобл.; *г* — спосаб павязвання хустак, в. Дарашэвічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.

сшытага з куплёнай тканіны або звязанага з нітак чапца; 3) ручніковага галаўнога ўбору («намітка») або хусткі.

Пасля вяселля маладыя жанчыны амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі кос ужо не плялі, а закручвалі валасы на тонкі абручык з ільняной кудзелі, лісця явара, некалькіх тонкіх гнуткіх галінак дрэва, абшытых палатном. Абручык рабіўся строга па аб'ёму галавы і ззаду завязваўся матузкамі. Гэта частка жаночага галаўнога ўбору ў розных месцах Беларусі называлася па-рознаму: «тканка», «кібалка», «бічайка», «лямец». Часам у тканкі ўшывалі медзякі, каб быць багатымі [55].

Ва ўсходняй частцы Магілёўскай губерні (Мсціслаўскі, Клімавіцкі, Чэрыкаўскі паветы) жанчыны, накруціўшы валасы на «тканку» або жмут кудзелі, часам не ўкладалі іх вакол галавы, а закручвалі па баках галавы над вушамі «ў рогі», або «падкоскі».

У сярэдзіне XIX ст. на Палессі бытаваў складаны рагаты жаночы галаўны ўбор — «галава», які па форме нагадваў ківер улан. Зверху «галава» абвязвалася наміткай — «сарпанкай» [56].

Да ліку рагатых галаўных убораў трэба аднесці і «пушанку», якую яшчэ і зараз носяць некаторыя старыя жанчыны на тэрыторыі былога Пінскага павета Мінскай губерні (рыс. 7).

Закручванне валасоў на тканку або на жмут кудзелі ў канцы XIX — пачатку XX ст. ужо не лічылася абавязковым на ўсёй тэрыторыі Беларусі. У некаторых паветах Магілёўскай і Віцебскай губерняў жанчыны запляталі валасы ў дзве касы, а на большай частцы цэнтральнай і заходняй Беларусі заплятанне валасоў у косы было адзінай жаночай прычоскай.

Абавязковым элементам складанага жаночага галаўнога ўбору канца XIX — пачатку XX ст. быў чапец. Шылі чапцы звычайна з тонкай, мяккай, часцей фабрычнай матэрыі.

У залежнасці ад крою чапцы можна падзяліць на два асноўныя тыпы: шытыя або вязаныя з нітак з круглым або авальным верхам і вузкім аколышам з прышытымі ззаду завязкамі і глыбокія чапцы з завязкамі пад падбародкам.

Чапцы першага тыпу былі распаўсюджаны на большай частцы тэрыторыі сучаснай Беларусі і вядомы пад тэрмінам «чапец» у розных фанетычных варыянтах, а ў Гомельскім павеце Магілёўскай губерні — пад тэрмінамі «павойнік», «зборнік». Такі чапец меў выгляд неглыбокай круглай шапачкі, якая, не закрываючы вушэй, шчыльна аблягала галаву. Круглае або авальнае донца такіх чапцоў спераду і ззаду звычайна дробна прызборвалася каля аколыша. Нешырокі аколыш браўся ззаду на рызінку або не сшываўся, і тады да яго канцоў прышываліся завязкі. Часам шнурок прапускаўся праз ніжні край усяго аколыша, і канцы яго завязваліся ззаду (рыс. 8, *а*).

Святочныя чапцы шылі звычайна з яркіх, тонкіх фабрычных тканін: паркалю, шоўку, атласу, кумачу, тонкага сукна, кашаміру. Найбольш пашыранымі былі чапцы чырвонага колеру. Налобная частка такіх чапцоў упрыгожвалася самым разнастайным чынам: фальбоначкамі, «грыбочкамі» са стужак, карункаў або з той жа матэрыі, што і чапец, каляровай тасьмой, шнуркамі, вышыўкай, пацеркамі.

[55] Архіў ІМЭФ, ф. 6, воп. 6, спр. 1, л. 30.

[56] Живописный альбом «Народы России», стар. 46; И. Эремич. Очерки Белорусского Полесья, стар. 7.




Карта 9. Тыпы складаных жаночых галаўных убораў (канец XIX — пачатак XX ст.):

*1* — чапец+хустка; *2* — чапец+тканка+хустка; *3* — чапец+намітка; *4* — чапец+тканка+падбічка+хустка; *5* — дзве хусткі; *6* — пушанка+чапец+хустка; *7* — тканка+дзве хусткі (*а* — пераважае, *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

На тэрыторыі сучаснай Брэсцкай вобласці ў канцы XIX — пачатку XX ст. па аколышу павязвалася суконная стужка часцей за ўсё чырвонага колеру («падбічка», «гічка», «куснак»). Некаторыя старыя жанчыны рабілі яе чорнай.

У паўднёвых паветах Гродзенскай губерні над шытымі чапцамі пераважалі вязаныя з баваўняных белых або чырвоных ніток. Радзей іх вязалі з адбеленых суровых ніток. Вязаліся чапцы сеткай і па форме нагадвалі шытыя (рыс. 8, *б*). Вязаныя з ніток чапцы сустракаліся побач з шытымі на поўдні Мінскай і Магілёўскай губерняў, але не мелі там шырокага распаўсюджання. Чапец жанчына надзявала ў першы дзень замужжа і не здымала яго да самай смерці.

Глыбокія жаночыя чапцы з завязкамі пад падбародкам бытавалі ў Беларусі звычайна пад тэрмінам «каптур». Каптур шчыльна аблягаў галаву і закрываў вушы, нагадваючы па форме дзіцячы чэпчык. Завязваўся ён пад падбародкам доўгімі, даволі шырокімі завязкамі (рыс. 8, *г*, *д*, *е*).

Каптуры былі пераважна чырвонага або чорнага колеру і шыліся з тонкага сукна часта ў спалучэнні з іншымі фабрычнымі тканінамі. У адрозненне ад чапцоў, якія насілі толькі разам з наміткай або хусткай, каптуры ў штодзённай носцы звычайна з'яўляліся самастойным галаўным уборам. Таму яны ўпрыгожваліся не толькі па налобнай частцы, як чапцы, а цалкам. Упрыгожваліся яны тымі ж матэрыяламі, што і чапцы. Часта каптуры шыліся з

матэрый некалькіх колераў [57] і яшчэ аздабляліся стужкамі або бліскучай тасьмой, пазументам, брыжыкамі.

Выходзячы з дому «на людзі», жанчыны надзявалі на каптур хустку і завязвалі яе пад падбародкам або вакол галавы такім чынам, што з-пад яе былі відаць толькі канцы каптура і яго завязкі («вушкі»). У канцы XIX — пачатку XX ст. у Віленскім і Вілейскім паветах Віленскай губерні поруч з каптурамі насілі і круглыя чапцы. У гэтай мясцовасці каптуры былі прыналежнасцю толькі пажылых жанчын, а больш маладыя насілі ўжо чапцы. А ў вёсцы Баброві́чы Ашмянскага павета Віленскай губерні каптурамі звалі па традыцыі круглыя чапцы з завязкамі ззаду.

Разнавіднасцю каптуроў былі «шапкі» — чапцы з меншымі, чым у каптуроў, вушамі (рыс. 8, *в*). Шапка не закрывала вушэй і завязвалася шырокімі завязкамі пад падбародкам. Разам з каптурамі і чапцамі шапкі бытавалі ў Слуцкім павеце Мінскай губерні. Насілі іх звычайна ў спалучэнні з хусткай або наміткай.

Гаворачы аб спосабах нашэння чапцоў і шапак, трэба адзначыць яшчэ адну асаблівасць. Пад чапец тканка рабілася па аб'ёму галавы, накручаныя на яе валасы ўкладваліся валікам вакол галавы крыху вышэй вушэй, а пад шапку тканка рабілася значна меншай, і накручаныя на яе валасы ўкладваліся венчыкам ужо толькі на цемені.

У пачатку XX ст. многія маладыя жанчыны ўжо не насілі чапцоў і тканак, а шчыльна завязвалі вакол галавы невялікую хустачку, паверх якой павязвалі другую.

Трэцім элементам складанага жаночага галаўнога ўбору з'яўлялася намітка.

Намітка — ручніковы галаўны ўбор замужніх жанчын, шырока вядомы ўсім славянам [58], балтам і некаторым іншым народам [59]. У старажытнасці яе насілі ўсе жанчыны незалежна ад саслоўнай прыналежнасці. Таму наміткі сустракаюцца на рускіх царкоўных фрэсках XII ст. і старажытных партрэтах.

У Беларусі ўпершыню мы сустракаем намітку на партрэце княгіні Кацярыны Алелькавіч-Слуцкай (першая палавіна XVI ст.) [60]. Наміткі і чапцы часта ўпамінаюцца ў матэрыялах Гродзенскага земскага суда сярэдзіны XVI ст.[61]

Намітка («намётка», «павівала», «плат») уяўляла сабою доўгі (2,5—3,5 м) ручнік з тонкага палатна шырынёй 40—60 см з затканымі звычайна чырвонымі баваўнянымі ніткамі канцамі. Ткалі намітку з самых тонкіх кужэльных нітак, стараючыся, каб яна была як мага танчэйшай. Каб зрабіць намітку больш тонкай, у Пінскім павеце Мінскай губерні яе мачылі ў вадзе, клалі на камень, а другім цёрлі зверху да таго часу, пакуль палатно не станавілася падобным на марлю. Затым намітку мылі, жлукцілі і крухмалілі. Такая намітка была вельмі тонкай і ў той жа час добра трымала форму.

Намітку звычайна павязвалі на чапец. «Завіванне» наміткі было даволі складаным і патрабавала значнага часу і пэўнага ўмення. Таму ў некаторых вёсках Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губерняў на чапец пад намітку падкладвалі шырокі цвёрды абруч — «лубачку», «каробачку». Гэта давала магчымасць замацаваную такім чынам намітку здымаць і надзяваць, як шапку, не трацячы часу на яе павязванне (рыс. 8, *з*, *і*).

На Беларусі існавалі самыя разнастайныя спосабы павязвання намітак. Кожны спосаб адпавядаў пэўнай мясцовасці [62]. Але нярэдка і ў адной вёсцы завівалі яе рознымі спосабамі.

На наш погляд, самым пашыраным быў спосаб павязвання, пры якім сярэдзіна наміткі накладвалася на галаву, затым адзін канец яе складваўся ў 4—6 разоў, агінаў галаву ў выглядзе круглай шапачкі, прапускаўся пад падбародкам і ўмацоўваўся справа або ззаду на макушцы. Другі шырокі канец свабодна звісаў ззаду да паясніцы (рыс. 8, *і*).

Часам намітка павязвалася такім чынам, што абодва складзеныя ў 4—6 разоў канцы праходзілі пад падбародкам і замацаваныя тырчалі па баках главы ў выглядзе рагоў, а затым свабодна звешваліся на плечы, даходзячы да пояса.

У Рэчыцкім павеце Магілёўскай губерні намітку павязвалі па-ўкраінску вузлом на патыліцы, прычым абодва канцы яе свабодна звісалі па спіне [63]. Часам намітка павязвалася такім чынам, што адзін яе вельмі доўгі спушчаны па спіне канец краем прымацоўваўся на патыліцы, ствараючы такім чынам ззаду доўгую, ніжэй пояса пятлю (рыс. 8, *к*).

[57] ДМЭН СССР, інв. № $\frac{7583—66}{\text{мф. кар. 15}}$. «Каптур» з в. Лебедзева Маладзечанскага р-на Мінскай вобл.

[58] Г. С. Маслова. Народная одежда русских, украинцев и белорусов, стар. 660.

[59] М. Мастоните. Литовская народная одежда в XIX — начале XX в., стар. 19.

[60] J. Smoliński. Kaptur i namiotka..., стар. 137.

[61] АВАК, т. XVII; Акты Гродненского земского суда. Вільна, 1890, стар. 84, 287, 317, 375, 416 і інш.

[62] Россия. Полное географическое описание нашего Отечества, стар. 146.

[63] Архіў ІМЭФ, ф. 6, воп. 11, спр. 978, л. 6.




Рыс. 8. Тыпы чапцоў і спосабы павязвання намітак:

*а* — шыты чапец, в. Морач Клецкага р-на Мінскай вобл.; *б* — вязаны чапец, в. Юндзілавічы Пружанскага р-на Брэсцкай вобл.; *в* — шапка, в. Морач Клецкага р-на Мінскай вобл.; *г*, *д*—*е* — каптуры, в. Падліпцы Слуцкага п. Мінскай губ.; *ж* — в. Лінова Кобрынскага п. Гродзенскай губ.; *з* — в. Бярэзна Пінскага п. Мінскай губ.; *і* — мяст. Любашоў Пінскага п. Мінскай губ.; *к* — в. Мохра Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл.; *л* — в. Вялікія Захады Горацкага п. Магілёўскай губ.; *м* — в. Залужжа Кобрынскага п. Гродзенскай губ.




Рыс. 9. Спосабы павязвання хустак:

*а* — в. Чашнікі Горацкага р-на Магілёўскай вобл.; *б*, *в* — Ігуменскі п. Мінскай губ.; *г* — в. Даманавічы Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.; *д* — в. Міластаў Ігуменскага п. Мінскай губ.; *е* — в. Завішанская Рудня Лагойскага р-на Мінскай вобл.; *ж* — в. Васькавічы Чавускага р-на Магілёўскай вобл.; *в* — в. Рамезы Ельскага р-на Гомельскай вобл.; *і* — в. Замасточча Слуцкага р-на Мінскай вобл.

У Віцебскай губерні намітка была выцеснена хусткай яшчэ ў сярэдзіне XIX ст.[64], а ў канцы XIX ст. яна бытавала на асноўнай тэрыторыі Беларусі толькі як святочны галаўны ўбор некаторых старых жанчын (карта 9) і абрадавы галаўны ўбор на вяселлі і пры пачатку ўборкі зернявых.

У другой палавіне XIX ст. на тэрыторыі Беларусі шырока распаўсюджваецца хустка, якая замяняе намітку ў штодзённым нашэнні. Хусткі былі самага разнастайнага памеру і якасці, квадратнай формы. Летнія даматканыя або фабрычнага вырабу хусткі на ўсёй тэрыторыі Беларусі бытавалі пад тэрмінамі «хустка», «хусцінка», «хуста», а ва ўсходніх раёнах гэтыя тэрміны існавалі разам з рускай назвай «платок».

Фабрычныя хусткі атрымалі розныя назвы. Так, паркалёвыя хусткі ў кветкі называлі «парыськавымі», «парысьскімі» (ад «парыжскі паркаль»); хусткі з шоўку і атласу — «шаля-

[64] Белоруссия. (Этнографический очерк). «Московские губернские ведомости», 1854, № 148.

ноўкамі», «атласкамі»; кашаміравыя з махрамі хусткі — «тараноўкамі», «кашміроўкамі»; цёплыя суконныя хусткі — «вянгрэнамі».

Вялікія святочныя суконныя хусткі, якія насілі зімой паверх звычайных хустак, а ідучы ў царкву, госці або на кірмаш, накідвалі на плечы, называліся ў Віцебскай і Магілёўскай губернях «накрыўнымі» або «накіднымі» хусткамі, а на Палессі — «апіналкамі», «апынкамі». Такая хустка насілася толькі ўнакідку, замяняючы жанчыне верхнюю вопратку, прычым канцы яе, перакінутыя на грудзях крыжападобна, падтрымліваліся свабодна рукой [65] (рыс. 9, *е*). Жанчыны з бедных сямей насілі зімой вялікія паўсуконныя саматканыя хусткі «абвязкі».

Павязванне хустак, таксама як і павязванне намітак, было вельмі разнастайным. Аднак амаль заўсёды для павязвання хусткі складалі па дыяганалі.

У канцы XIX — пачатку XX ст. распаўсюджаным быў спосаб павязвання хусткі вакол галавы «ў рогі». Пры гэтым хустка складвалася па дыяганалі і павязвалася вакол галавы, а па баках з канцоў хусткі рабіліся «рогі» (рыс. 9, *б*, *в*). «У рогі» завязвалі звычайна шаўковыя, кашаміравыя або паркалёвыя хусткі з махрамі — «атласкі», «тарноўкі», «парыськавыя хусткі». Часам на такім чынам павязаную хустку павязвалі яшчэ адну дадатковую. Для гэтага дадатковая хустка («падвязка») складалася па дыяганалі вузкай палоскай, прапускалася пад падбародак і завязвалася на цемені (рыс. 7, *в*).

Распаўсюджаным на Беларусі быў і такі спосаб павязвання, калі канцы хусткі, перакрыжаваныя пад падбародкам, завязваліся вузлом на цемені. Па азначэнню балгарскай даследчыцы адзення М. Г. Велевай, гэты спосаб павязвання хусткі з'яўляецца для ўсходніх славян найбольш старажытным [66] (рыс. 7, *г*).

Павязванне хусткі вузлом пад падбародкам — найбольш позні спосаб, таму што ў канцы XIX ст. ён лічыўся дзявоцкім.

Інтэнсіўнае развіццё капіталізму і звязанае з гэтым пранікненне ў вёску гарадской культуры падарвалі ў канцы XIX ст. патрыярхальнасць. К пачатку першай сусветнай вайны асноўная маса маладых жанчын ужо перастала насіць чапцы і старанна закрываць валасы. Звычайным стала карыстанне адной хусткай, якая завязвалася паверх заплеценых у косы валасоў пад падбародкам або вакол галавы.

[65] Н. Я. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья..., стар. 119.

[66] М. Г. Велева, Е. И. Лепавцова. Народная одежда болгар..., стар. 16.

# АСНОЎНЫЯ ЛАКАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЖАНОЧАГА АДЗЕННЯ

Жаночае традыцыйнае адзенне, як ужо адзначалася, мае шмат агульных рыс на ўсёй тэрыторыі рассялення беларускага народа. Яны вызначаюць самабытнасць беларускага жаночага комплексу, які сфарміраваўся пад уплывам агульнасці гаспадарчага, сацыяльна-грамадскага і духоўнага жыцця народа, а таксама фізіка-геаграфічных умоў краіны.

Аднак беларускі жаночы касцюм не быў паўсюдна абсалютна аднародным. Гэта зусім натуральна. Культура кожнага народа развіваецца не ізалявана ад культуры іншых народаў, якая прама ці ўскосна ўздзейнічае на яе. Памылкова лічыць, што іншаземныя нашэсці не наклалі адбітку на культуру беларусаў, у тым ліку і на іх адзенне. Ужо той факт, што сацыяльна-рэлігійная палітыка Рэчы Паспалітай раскалола адзіны па паходжанню народ на католікаў, якія часта лічылі сябе палякамі, і праваслаўных (якія лічылі сябе рускімі), гаворыць не ў карысць такіх меркаванняў.

Дастаткова працяглае жыццё сярод беларусаў іншых нацыянальнасцей таксама не магло прайсці бясследна, і, безумоўна, яны аказалі ўплыў на адзенне карэннага насельніцтва.

Картаграфаванне агульнага комплексу жаночага адзення беларусаў, асобных прадметаў гэтага комплексу, а таксама састаўных частак гэтых прадметаў дазваляе выдзеліць лакальныя асаблівасці адзення, паяўленне якіх звязана з рознымі абставінамі народнага жыцця.

Па сукупнасці цэлага рада асаблівасцей жаночага адзення ў Беларусі можна выдзеліць тры раёны: Палессе, паўночны захад і Падняпроўе. Насельніцтва гэтых вялізных раёнаў канцэнтравалася ў басейнах рэк Дняпра, Прыпяці, Дзвіны і Нёмана — галоўных водных магістралей, якія са старажытнасці і да XX ст. служылі асноўнымі шляхамі зносін паміж асобнымі раёнамі краіны і з суседзямі беларусаў славянскага і неславянскага паходжання. Яны адыгрывалі важную ролю ў развіцці эканамічных сувязей і ў фарміраванні культуры насельніцтва. На гэтых рэках і іх прытоках складваліся племянныя саюзы дрыгавічоў, крывічоў, палачан і радзімічаў — асноўных старажытных продкаў сучасных беларусаў. Было б, зразумела, памылковым тлумачыць своеасаблівасць у народным адзенні беларусаў XIX — пачатку XX ст. прыналежнасцю да розных плямёнаў. Шмат розных падзей адбылося на гэтых землях з той далёкай пары. Зніклі ста-

ражытныя формы адзення, але засталіся старажытныя рэкі і гарады, якія, як і ў тыя далёкія часы, з'яўляліся асноўнымі магістралямі і культурнымі цэнтрамі, што шмат у чым вызначыла эканоміку, культуру і быт той ці іншай вобласці. У межах гэтых абласцей распаўсюджвалася тая ці іншая з'ява, што фарміравалася тут пад уплывам пэўных акалічнасцей.

Кожная з гэтых абласцей мела свае асобныя культурныя цэнтры і сувязі з іншымі краінамі, якія склаліся вельмі даўно. Культура Падняпроўя, напрыклад, цесна звязана з культурай рускай Смаленшчыны, а Палесся — з культурай пагранічных раёнаў Украіны. Аб гэтым вельмі яскрава сведчыць тэрміналагічны матэрыял. Так, пры аднолькавым паліковым кроі кашулі назвы плечавых уставак былі рознымі. На Палессі, як і на паўночнай Украіне, яны называліся ўстаўкамі (з рознымі фанетычнымі варыянтамі), а ў Падняпроўі, як у рускіх,— палікамі.

Лыкавы абутак у паўночна-ўсходніх абласцях называўся «лапці», а ў паўднёва-заходняй частцы Палесся — «пастолы», нягледзячы на тое што тып прамога пляцення гэтага абутку быў аднолькавы. Вяровачныя прывязі ў лапцей ва ўсходняй Беларусі, як і ў Расіі, называліся аборамі, а на Палессі — валокамі. Можна прывесці шмат такіх прыкладаў.

Адрозненні, якія надаюць своеасаблівасць адзенню вышэйназваных этнаграфічных абласцей, з'явіліся ў розны час. Адны з іх — перажыткі глыбокай старажытнасці, другія паявіліся ў больш позні час, галоўным чынам у другой палавіне XIX ст. у сувязі з развіццём капіталізму.

Больш архаічных рыс захавалася ў адзенні насельніцтва Палесся (Брэсцкая, Гомельская, значная частка Мінскай і Гродзенскай абласцей). Многія месцы гэтай велізарнай тэрыторыі ў XIX ст. уяўлялі сабой найбольш глухія раёны Беларусі. Таму тут даўжэй захаваліся старажытныя элементы адзення: ручніковыя галаўныя ўборы, архаічныя ўпрыгожанні з пер'я, жывых і штучных кветак і г. д. Цэлы рад асаблівасцей палескага жаночага адзення зусім невядомы ў адзенні жанчын іншых абласцей Беларусі.

Палешукоў заўсёды можна было пазнаць па своеасабліваму крою верхняга, амаль выключна суконнага адзення. Крой палескай світкі з бакавымі ўшыўнымі клінамі — «з вусам» знаходзіць сабе аналогію толькі на сумежнай тэрыторыі Украінскага Палесся. Палескія жанчыны, напрыклад, са старажытнасці насілі рагатыя галаўныя ўборы, невядомыя ў іншых раёнах Беларусі. Гэтыя ўборы мелі некаторае падабенства з галаўнымі ўборамі насельніцтва паўднёварускіх абласцей. На Палессі здаўна была вядома паліковая суцэльная жаночая кашуля, падобная да кашуль, распаўсюджаных у некаторых украінскіх раёнах.

Характэрнай асаблівасцю палескага жаночага касцюма з'яўляецца разнастайнасць і багацце ўпрыгожанняў — тканых, вышытых, нашыўных і дадатковых здымных (пацеркі, завушніцы, пярсцёнкі, стужкі).

Такім чынам, палескі жаночы касцюм па цэламу раду істотных асаблівасцей адрозніваецца ад касцюма іншых раёнаў Беларусі, але ў межах Палесся ёсць рад комплексаў, блізкіх у аснове, але розных у дэталях. Своеасаблівасць гэтых комплексаў праяўляецца галоўным чынам у манеры нашэння адных і тых жа частак касцюма, у расфарбоўцы тканін і аддзелачных матэрыялаў, у колькасці ўпрыгожанняў і месцаразмяшчэнні іх, у спосабах нашэння галаўных убораў і абутку, у крої і ўпрыгожаннях безрукавак і да т. п.

Па сукупнасці рада вышэйпералічаных асаблівасцей вылучаюцца чатыры комплексы палескага касцюма: заходнепалескі комплекс, раён распаўсюджання якога абмяжоўваецца рэкамі Заходні Буг на захадзе і Ясельдай на ўсходзе; пінскі — паміж Ясельдай і рэкамі Случчу і Гарынню; давыд-гарадоцкі — далей на ўсход да рэк Пцічы і Убарці; усходні, або мазырскі, комплекс, распаўсюджаны ад Турава амаль да руска-беларускай мяжы. Натуральна, размежаванне гэта праведзена чыста ўмоўна — няма рэзкіх пераходаў ад аднаго комплексу да другога, і раёны вылучаны па перавазе той або іншай характэрнай прыкметы пры адным агульным тыпе касцюма.

Вельмі цікавым з'яўляецца заходнепалескі комплекс, які распаўсюджан у паўднёва-заходняй частцы сучаснай Брэсцкай вобласці. На працягу многіх стагоддзяў насельніцтва гэтага краю не падзялялася дзяржаўнымі межамі. Гэта тэрыторыя ў складзе Старажытнарускай дзяржавы ўваходзіла ў Берасцейскую зямлю, у Вялікім княстве Літоўскім — Берасцейскае ваяводства, у Расійскай імперыі — Гродзенскую губерню (Брэст-Літоўскі, Кобрынскі і Пружанскі паветы). Палітыка-адміністрацыйнае адзінства садзейнічала фарміраванню і распаўсюджанню па ўсёй гэтай тэрыторыі вельмі блізкіх характэрных асаблівасцей адзення.

Заходнепалескі комплекс спалучае ў адным гарманічным цэлым элементы старажытныя і больш познія. Яшчэ ў пачатку XX ст. у жанчын старэйшага пакалення шырока бытаваў старажытны ручніковы галаўны ўбор намітка, які тут часцей называўся платам-убрусам. Своеасаблівасць гэтаму комплексу надае таксама паясное адзенне. Тут шырока бытавалі буркі і летнікі,

якія адрозніваліся паміж сабой якасцю тканіны, а ад андаракаў — у асноўным характарам арнаменту. Буркі шылі з больш тоўстага сукна, а летнікі — з танейшага. Сукно для бурак і летнікаў ткалася бранай тэхнікай. Вырабы гэтага віду ткацтва ў раёнах Заходняга Палесся вылучаюцца разнастайнасцю малюнка і асаблівым каляровым спалучэннем. Арнамент палос, якія строга чаргуюцца, уяўляе самыя разнастайныя спалучэнні розных геаметрычных фігур: ромбаў, трохвугольнікаў, квадратаў, разетак і г. д. Малюнак арнаментаваных палос выконваўся, як правіла, у паліхромнай каляровай гаме рознакаляровымі ніткамі: чырвонымі, чорнымі, зялёнымі і інш.

Узорныя затканыя палосы ішлі ў некалькі радоў упоперак спадніцы, прычым самая шырокая, багата арнаментаваная паласа размяшчалася ўнізе, крыху вышэй ніжняга пруга. Кожная наступная паласа рабілася вузей, па меры прасоўвання ўверх спрашчаўся і арнамент гэтых палос.

Спадніцы, як і паўсюдна ў Беларусі, шыліся ў 4 падоўжныя палотнішчы, прычым пярэдняе ткалася з вельмі спрошчанай арнаментацыяй, таму што яно закрывалася фартухом, або фартушком, як яго іншы раз называлі ў адрозненне ад палатняных спадніц той жа назвы. У палатняных спадніцах побач з тканнём рознакаляровымі ніткамі разнастайнага малюнка нярэдка дасягалі вар'іраваннем неадбеленых і адбеленых ільняных нітак.

Для заходнепалескага комплексу сялянскага жаночага адзення безрукаўка з'яўлялася неабавязковым кампанентам. У радзе вёсак яе наогул не насілі. Гэтай акалічнасцю, відаць, у нейкай меры можна растлумачыць мноства ўпрыгожанняў не толькі на рукавах, але і на грудзях кашулі.

Найбольш старажытны спосаб упрыгожвання палатнянага адзення (кашулі, фартухі) — затыканне аднатоннымі чырвонымі ніткамі. Гэта асаблівасць захавалася з далёкіх часоў, калі Берасцейская зямля ўваходзіла ў склад Галіцка-Валынскага княства, таму што чырвоная аднаколернасць была характэрна летапісным валынянам.

Кашулі, затканыя чырвонымі ніткамі, у XIX — пачатку XX ст., як правіла, дадаткова ўпрыгожвалі вышыўкай, выкананай чырвонай і чорнай «забалоццю». Тканым і вышытым узорам упрыгожвалі і белыя палатняныя фартухі. Тут арганічна спалучалася геаметрычная і раслінная арнаментыка.

На тэрыторыі распаўсюджання заходнепалескага комплексу адзначаны таксама ўпрыгожанні кашуль вышыўкай, выкананай толькі чорнымі ніткамі. Гэта асаблівасць лакалізуецца толькі ў асобных вёсках (Медна і інш.) і была, відаць, занесена перасяленцамі з заходніх абласцей Украіны. Так, напрыклад, на Сокальшчыне Львоўскай вобласці старажытны вышыты арнамент геаметрычнага малюнка выконваўся таксама выключна чорнымі ніткамі [67].

Наогул трэба адзначыць, што заходнепалескі комплекс па цэламу раду асаблівасцей нагадвае касцюм сумежных раёнаў Украіны, утвараючы разам з ім адзіны этнаграфічна блізкі раён.

Комплекс адзення насельніцтва былога Пінскага павета Мінскай губерні фарміраваўся і развіваўся ва ўмовах параўнальнай ізаляцыі ад іншых абласцей Беларусі.

Вось што паведамляецца ў крыніцах сярэдзіны XIX ст. аб гэтай мясцовасці: «Пінчукі, яны ж і палешукі... адрозніваюцца ад усіх іншых жыхароў гэтай ускраіны сваімі бытавымі асаблівасцямі, а яшчэ больш мовай. Сучасная жывая гаворка пінчукоў і помнікі вуснай творчасці іх старажытнасці сведчаць аб тым, што яны далёка не ў такой ступені падпалі пад уплыў прыйшлых элементаў, як іншыя жыхары Мінскай губерні. Сама мясцовасць іх насялення, акружаная лясамі і непраходнымі балотамі, зрабіла іх нерухомымі і замкнёнымі ў саміх сябе, прывучыла пінчукоў недаверліва адносіцца да ўсяго, што ляжыць за мяжою іх лясоў і балот. Пабываць у павятовым горадзе з'яўляецца вялікай падзеяй. Губеранскі горад Мінск пінчукі лічаць ужо... Літвой» [68].

Пінскі комплекс адзення ў асноўных рысах не мае рэзкіх адрозненняў ад заходнепалескага (брэсцкага). Але тут пры агульнай палескапінскай аснове ёсць многа варыянтаў. У гэтай найбольш забалочанай частцы Палесся нярэдка нават бліжэйшыя вёскі адрозніваліся якойнебудзь асаблівасцю ў касцюме. Так, напрыклад, вёскі Бродніца і Азярніца Лунінецкага раёна, адлеглась паміж якімі каля двух кіламетраў, маюць свае характэрныя асаблівасці ў касцюме. Андаракі ў Азярніцы і ў час працы і ў святы падтыкалі за пояс спераду, таму ніжні край кашулі, які быў, відаць, упрыгожвалі арнаментам. У Бродніцы такі спосаб нашэння андарака ні ў далёкім мінулым, ні ў больш позні час (канец XIX — пачатак XX ст.) не назіраўся [69].

На Піншчыне ў адрозненне ад Брэстчыны ўжо амаль не сустракаліся багата арнаментаваныя суконныя буркі і летнікі. Тып паяснога адзення тут зазнаў істотныя змены пад уплы-

[67] В. А. Маланчук. Некоторые особенности крестьянской одежды, вышивки и художественное ткачество Сокольщины. М., 1964, стар. 3.

[68] Архіў Усесаюзнага геаграфічнага таварыства СССР, разрад 20, воп. 1, спр. 14.

[69] Архіў ІМЭФ, ф. 6, воп. 6, спр. 1.

вам местачковага касцюма. Святочныя спадніцы, нягледзячы на тое што іх называлі даматканам, шылі (зразумела, найбольш заможныя сяляне) з аднатоннай куплёнай, даволі тонкай шэрсці сіняга, чырвонага, карычневага колеру. Па нізу ў адзін, радзей у некалькі радоў нашывалі залацістыя галуны («галёны»). Такімі ж галунамі ўпрыгожвалі безрукаўку — ужо абавязковую састаўную частку комплексу Піншчыны.

Пануючым тыпам крою безрукавак у пінскім комплексе быў доўгі неадразны з падрэзамі па баках на бёдрах. Толькі ва ўсходняй частцы Пінскага павета насілі кароткія да пояса безрукаўкі прамога крою з упрыгожаннямі на грудзях у выглядзе зубчыкаў, хвалістых і прамых нашывак з рознакаляровых тканін. Прамежак паміж безрукаўкай і спадніцай, каб не відаць было кашулі, закрывалі шырокім шарсцяным поясам звычайна чырвонага колеру. Пояс часцей за ўсё ззаду завязвалі бантам.

Палатняныя кашулі, блізкія па крою да заходнепалескіх, упрыгожвалі таксама тканым і вышытым узорам. Шырокі, прамога крою безманжэтны рукаў з вонкавага боку ад верху да нізу «затыкалі» геаметрычным узорам, выкананым чырвонымі ніткамі. Прышыўная на грудзях манішка вышывалася, а на поўначы Піншчыны перад кашулі ўпрыгожваўся папярочнымі паскамі рознай шырыні, затканымі прама па матэрыялу кашулі. Вышыты ўзор, які выцесніў тканы ў пачатку XX ст., размяшчаўся па традыцыі таксама папярочнымі палосамі.

У касцюме Піншчыны даўжэй, чым дзе-небудзь, захаваўся ручнікова галаўны ўбор, пад які надзяваўся часцей за ўсё звязаны з самаробных нітак чапец у выглядзе шапачкі. Ззаду чапец, які шчыльна аблягаў галаву, завязваўся звітым з нітак шнурком (дадатак, VI).

Характэрныя асаблівасці пінскага комплексу не маюць сабе аналогіі за межамі Беларусі і сканцэнтраваны каля горада Пінска і навакольных мястэчак (Пагост-Загародск, Целяханы, Кажан-Гарадок, Лунінец і інш.).

У больш значнай ступені, чым пінскі комплекс, пад местачковым уплывам быў давыд-гарадоцкі комплекс, распаўсюджаны на невялікай тэрыторыі вакол Давыд-Гарадка.

Давыд-гарадоцкі комплекс пры агульным падабенстве з касцюмам іншых палескіх раёнаў вылучаўся перш за ўсё наяўнасцю металічных шыйных упрыгожанняў. На масіўных металічных ланцужках віселі вялікія нагрудныя крыжы або ладанкі. Вешалі гэтыя ланцужкі ў некалькі радоў, амаль цалкам закрываючы грудзі.

Кашулі не ўпрыгожваліся ні тканым, ні вышываным узорам. Але доўгія рукавы амаль заўсёды рабіліся з шырокімі манжэтамі-брыжамі.

У Пінскім краязнаўчым музеі захоўваецца некалькі фатаграфій давыд-гарадоцкіх жыхарак татарскага паходжання. Касцюм іх упрыгожан металічнымі ланцужкамі з буйнымі пацеркамі паміж асобнымі звеннямі і вялікім крыжам унізе ланцужка. Цікавая з'ява: жанчыны татарскага паходжання насілі татарскае па агульнай канфігурацыі і па матэрыялу (метал) упрыгожанне з хрысціянскім крыжам. Гэта акалічнасць дазваляе меркаваць, што падобныя каралі спачатку насілі татаркі, якія прынялі хрысціянства.

Сляды татарскага ўплыву наглядаюцца і ў галаўных уборах давыд-гарадоцкіх жыхарак і жанчын з навакольных вёсак.

У адным апісанні, якое было даслана ў Рускае геаграфічнае таварыства ў сярэдзіне XIX ст., адзначалася надзвычайная розніца паміж галаўнымі ўборамі тураўлянак і давыд-гарадоцкіх жыхарак. Наогул увесь галаўны ўбор давыд-гарадоцкіх жыхарак быў вышэй на 4—5 см, чым у Тураве. Ён уяўляў сабой як бы лапату, якая расшыралася з бакоў. Аўтар паведамлення пісаў: «У кожнай дэталі назіралася як бы наўмысная процілегласць тураўскаму. Калі ў старых тураўлянак галаўны ўбор быў большы, чым у маладых, то ў давыд-гарадоцкіх старых, наадварот, ён быў меншы» [70].

Андаракі шылі звычайна з даматканага сукна чырвонага колеру з вузкімі падоўжнымі палоскамі рознага колеру: белыя, сінія, жоўтыя і інш. Андарачная тканіна таксама нагадвала ўсходнія тканіны.

Безрукаўкі пераважалі кароткія, прамога крою, з характэрнай для ўсходняй Піншчыны аплікацыяй на грудзях.

Мазырскі комплекс (больш дакладна тураўска-мазырскі) быў распаўсюджан на значнай прасторы права- і леваўзбярэжжа Прыпяці. Некаторыя яго асаблівасці адзначаны да самай руска-ўкраінска-беларускай мяжы. Капіталістычныя адносіны пранікалі сюды ў большай ступені дзякуючы чыгунцы і ажыўленаму пасажырскаму руху па Прыпяці і Дняпры. У комплексе Мазыршчыны ў XIX — пачатку XX ст. ужо не было намітак, але ў радзе месц да XX ст. бытаваў яшчэ рагаты галаўны ўбор, які называўся «галава». Гэты галаўны ўбор складаўся з трох асноўных частак — налобніка, рагатага грэбеня і тонкай вуальнай тканіны ззаду. У апісанні, што прыводзілася вышэй, адзначалася, што тураўскі галаўны ўбор у грэбені меў перахват пасярэдзіне, дзякуючы чаму з бакоў утвараліся як бы два паўмесяцы ўвагнутым бокам вонкі [71].

[70] Архіў Усесаюзнага геаграфічнага таварыства СССР, разрад 20, воп. 1, спр. 12.
[71] Там жа.

У паясным адзенні ў гэтым комплексе даволі трывала захоўваліся перажыткі панёвы: звычай насіць два пярэднікі — пярэдні і задні, а таксама затыкаць за пояс падол спадніцы.

У Тураўскім Палессі ў летнюю пару жанчыны часам надзявалі два палатняныя фартухі без спадніцы на кашулю. Адзін фартух падвязваўся спераду, а другі — ззаду. Калі жанчына ішла або нахілялася, яны нагадвалі спадніцу з разрэзамі па баках. Напэўна, гэта таксама адна з перажытачных з'яў нясшытага паяснога адзення. У Тонежскай і Бярозаўскай валасцях насілі толькі адзін фартух, які надзяваўся ззаду. Дзяўчынкі ж наогул нярэдка насілі на кашулі толькі адзін фартух ззаду. У самым Тураве кашулю без фартуха спераду насіць лічылася грахом. Больш таго, калі спадніцу прыходзілася паднімаць з бакоў, то фартух прыпаднімаць або затыкаць за пояс не дазвалялася [72]. Такі ж звычай назіраўся і ў Давыд-Гарадку, дзе жанчыны не мелі права падняць фартух нават у вялікую гразь, нягледзячы на тое што тут прынята было насіць доўгія фартухі.

Побач з лыкавым абуткам, які называўся тут агульнабеларускай назвай «лапці», жанчыны насілі яшчэ чуні, зробленыя з вяровак, а мужчыны — моршні, ці поршні, з сырамятнай скуры.

У Лельчыцкай акрузе пяньковыя прывязі для лапцей — аборы накручвалі шчыльна да самага калена так, што атрымлівалася своеасаблівая вяровачная панчоха.

Па р. Прыпяці праходзіла мяжа паміж двума варыянтамі мазырскага комплексу. Па праваўзбярэжжы Прыпяці насілі кароткія безрукаўкі прамога крою або прыталеныя з фальбонай па ніжняму краю. Яны ўпрыгожваліся і аплікацыяй, і вышыўкай шаўковымі, залатымі ніткамі з дабаўленнем металічных бліскавак. Безрукаўкі гэтага тыпу шыліся з бархату ці сукна яркіх расфарбовак з пераважаннем чырвонага колеру. Па леваўзбярэжжы Прыпяці і далей на ўсход насілі звычайна доўгія безрукаўкі з тоўстага чорнага сукна. Ніжняя частка безрукаўкі ля пояса збіралася ў зборкі або часцей закладвалася ў складкі. Шво ля таліі прыкрывалася прышыўным або здымным поясам з такога ж матэрыялу. На грудзях да пояса і на правай полцы ўнізе вышываліся ніткамі кветкі і хвалістыя лініі.

Розніца ў жаночым касцюме леваўзбярэжжа і праваўзбярэжжа Прыпяці не абмяжоўваецца толькі кроем безрукавак. Яна назіралася і ў характары крою кашуль, і ў іх упрыгожванні. Каўнер кашуль на леваўзбярэжжы, напрыклад, у такой буйной вёсцы, як Даманавічы, і яе наваколлі, часцей за ўсё рабіўся шырокім, з брыжамі. У вышытым узоры, які ў пачатку XX ст. амаль зусім выцесніў узорнае затыканне, на праваўзбярэжжы пераважалі буйныя яркія кветкі — макі, на леваўзбярэжжы — больш дробныя, якія звязваліся ў пэўную кампазіцыю.

Паўночна-заходні этнаграфічны раён ахоплівае большую частку захаду Віцебскай вобласці, паўночную частку Гродзенскай і паўночна-заходнюю Мінскай абласцей, г. зн. большую частку міжрэчча Нёмана і Заходняй Дзвіны. На думку сучасных беларускіх этнографаў, тут з даўніх часоў праходзіў працэс абеларушэння літоўцаў, аб чым сведчаць тапаніміка і іншыя прамыя і ўскосныя факты [73].

Са свайго боку адзначым, што жаночы касцюм паўночна-заходняга раёна рэзка кантрастуе з палескім, хоць і складаецца з адных і тых жа частак. У гэтым комплексе ў канцы XIX — пачатку XX ст. прадметы жаночага касцюма амаль зусім не ўпрыгожваліся ні натыканнем, ні вышыўкай, ні аплікацыяй. Гранічна сціплымі былі і дадатковыя здымныя ўпрыгожанні. Гэта, відаць, нельга растлумачыць толькі раннім пранікненнем у вёску гарадской моды, а трэба звязваць са старажытнымі этнічнымі традыцыямі. Аб гэтым жа сведчыць і бытаванне тут са старажытнасці тунікападобнага крою кашулі і шырокае распаўсюджанне крою кашуль з «прырамкамі», характэрнага для прыбалтыйскіх народаў.

Традыцыйная жаночая кашуля ў канцы XIX — пачатку XX ст. у гэтым комплексе, як правіла, з'яўлялася споднім адзеннем. Яна была тунікападобнага крою, без рукавоў або з кароткімі, да локця, рукавамі. Там, дзе на кашулю не прынята было надзяваць блузку, яе шылі на гестцы, з доўгім прамым рукавом без манжэты. Фартух у гэтым комплексе не з'яўляўся абавязковым. Яго надзявалі толькі ў час працы і шылі звычайна са старога адзення або з кавалкаў грубога палатна, таму фартухі не прынята было ўпрыгожваць.

Ужо ў першай палавіне XIX ст. у паўночна-заходнім раёне не насілі намітак (наміткай тут называлі тонкае палатно, прызначанае для ручнікоў). Звычайна павязвалі галаву дзвюма хусткамі рознай якасці. На Полаччыне зафіксаван своеасаблівы галаўны ўбор, які сумяшчае чэпчык і хустку, для чаго хустка складвалася па памеру галавы ў выглядзе шапачкі і сшывалася. З'явіўся такі ўбор, паводле сцвярджэння Г. С. Маславай, пад уплывам рускага гарадскога

[72] Архіў Усесаюзнага геаграфічнага таварыства СССР, разрад 20, воп. 1, спр. 12.

[73] М. Я. Грынблат. Белорусы, стар. 144—173.

насельніцтва. Падобныя ўборы, якія развіліся з хусткі, пад назвай «наколка», «сколка» ў XIX ст. распаўсюдзіліся ў мяшчанскім асяроддзі ў Расіі [74].

Характэрнай асаблівасцю паўночна-заходняга касцюма было шырокае выкарыстанне для пашыву адзення даматканага палатна або куплёных тканін, з якіх шылі кашулі, безрукаўкі, спадніцы, верхняе адзенне. Паўночная Беларусь здаўна з'яўляецца раёнам развітага ільнаводства. Лён у канцы XIX — пачатку XX ст. становіцца добра аплачваемай таварнай культурай, таму многія сялянскія гаспадаркі пашыралі яго пасяўныя плошчы. Селяніну было выгадна прадаць сваю сыравіну і набыць параўнальна танныя фабрычныя тканіны. Ужыванне ў сялянскім побыце паркалю, каленкору, корту, альпагі дыктавалася, такім чынам, не толькі і не столькі запатрабаваннямі моды, колькі эканамічнымі меркаваннямі.

Для будзённых рабочых спадніц матэрыял часцей за ўсё ткалі з ільняных нітак у чорную і шэрую клетку самых разнастайных памераў і форм. «Шарачковы» колер спадніц (тут і палатняныя, і паўсуконныя называлі спадніцамі) гарманіраваў з кофтамі са стракатага паркалю.

Для паўночна-заходняга касцюма было характэрна верхняе адзенне прамога, халатападобнага крою, пашытае з тоўстага палатна ці паўсукна.

У пачатку XX ст. даволі шырока ўваходзяць ва ўжытак безрукаўкі з адбеленага палатна, якія выконвалі ролю ліфа, таму што насілі іх пад кофтай.

Для касцюма гэтага раёна побач з плеценым з лыкаў абуткам характэрны быў старажытны славянскі абутак з сырамятнай скуры. У некаторых месцах, галоўным чынам у беларускіх паветах Віленскай губерні, ён з'яўляўся асноўным відам абутку.

Касцюм паўночна-заходняга раёна не меў такога багацця відаў і форм, як на Палессі. Ён быў параўнальна аднародным і зазнаў моцны ўплыў гарадской моды.

Падняпроўскі касцюм быў распаўсюджан на ўсёй тэрыторыі сучаснай Магілёўскай вобласці, ва ўсходняй частцы Віцебскай і Мінскай абласцей.

Па раду асаблівасцей ён уяўляе сабой як бы пераходны тып ад палескага да паўночна-заходняга. У гэтым касцюме клятчаты малюнак андаракаў спалучаўся з яркай палескай расфарбоўкай. Звычайна па чырвоным фоне ткаліся клеткі разнастайнага памеру. Характэрнай жа асаблівасцю падняпроўскага касцюма з'яўляецца спадніца з прышыўным кабатам. Суконная, нярэдка аднатоннай расфарбоўкі (зялёная, бардовая і інш.), яна прышывалася да безрукаўкі, часцей палатнянай, радзей з прыгожых куплёных матэрыялаў і ўпрыгожвалася галуном. Ніжняя палавіна пярэдняга палотнішча спадніцы была суконнай, тады як верхняя, што прыкрывалася фартухом,— палатнянай. У радзе вёсак у пачатку XX ст. памяталі яшчэ расхінную панёву і звычайныя андаракі называлі іншы раз панёвамі.

Затканы або вышыты фартух быў абавязковым кампанентам дадзенага касцюма. Тканым і вышытым арнаментам у дастатковай ступені ўпрыгожвалася і кашуля. Для кашуль характэрны і больш старажытны палікавы крой і больш позні — крой з гесткай. У адной і той жа жанчыны можна было знайсці кашулі і таго і другога крою, як у адной і той жа сям'і меліся суконныя армякі прамога крою (у мужчын) і світы (у жанчын), у якіх спінка ў таліі падразалася і збіралася ў зборкі, тады як пярэднія полкі заставаліся цэлымі. Найбольш тыповымі для падняпроўскага касцюма было верхняе адзенне з падразной спінкай.

У канцы XIX — пачатку XX ст. у касцюме Падняпроўя бытавалі ручніковыя галаўныя ўборы, хоць агульны выгляд касцюма ў гэты перыяд характарызавалі не яны, а хусткі самага разнастайнага памеру, расфарбоўкі і спосабаў павязвання.

У жаночым касцюме Падняпроўя не назіралася такога адзінства, як у касцюме паўночна-заходняга раёна. Па роду своеасаблівых адзнак тут некалькі выдзяляюцца паўночныя раёны, што ляжаць бліжэй да Віцебска, і цэнтральна-беларускія (Случчына).

Комплекс жаночага адзення Віцебшчыны адрозніваецца ад уласна падняпроўскага касцюма наяўнасцю палатнянага верхняга адзення пераважна прамога крою і перавагай палатняных і паўсуконных матэрыялаў для вырабу ўсіх відаў адзення.

Цэнтральнабеларускі комплекс характарызуецца своеасаблівым жаночым галаўным уборам — чапцом (каптуром) з вушкамі, які можна было насіць, не надзяваючы зверху наміткі або хусткі. Суконнае верхняе адзенне, якое называлася тут халатам, шылася звычайна з адразной спінкай, ніжняя частка якой ля пояса збіралася ў зборкі або складкі. Жаночы андарак нярэдка шылі з папярочнага палотнішча. Пры падобным кроі да ніжняй часткі ў шырыню палотнішча прышывалася паўпалотнішча. Часцей за ўсё па чырвоным фоне андарака ішлі папярочныя неарнаментаваныя палосы рознага колеру, амаль аднолькавыя па памеру.

[74] Г. С. Маслова. Народная одежда русских, украинцев и белорусов, стар. 666.

Фартухі ў радзе месц былога Слуцкага павета шылі не з белага, а з пафарбаванага палатна або фабрычнага цёмнага паркалю. Для ўпрыгожвання фартухоў, кашуль і спадніц шырока выкарыстоўвалі самаробныя або куплёныя карункі (дадатак, II).

Безрукаўкі шылі звычайна доўгія, неадразныя; ніжняя частка ў іх або закладвалася ў бантовыя складкі ззаду і з бакоў, або разразалася. Безрукаўкі свабоднага крою з чорнага сукна не ўпрыгожваліся, пашытыя ж з каляровых тканін на грудзях расшываліся шаўковымі стужкамі ці ніцямі.

Цэнтральнабеларускі комплекс, як відаць, арганічна блізкі не толькі падняпроўскаму, але мае шмат агульных рыс з палескім.

Як паказвае прыведзены матэрыял, размежаванне розных тыпаў жаночага касцюма праведзена на аснове другарадных паказчыкаў. Гэта выклікана тым, што жаночы касцюм ў цэлым у асноўным аднародны на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

# МУЖЧЫНСКІ КАСЦЮМ

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

Мужчынскі касцюм беларускага сялянства канца XIX — пачатку XX ст. менш разнастайны, чым жаночы. Асноўныя яго формы былі агульнымі для ўсіх усходнеславянскіх народаў, што пацвярджаюць і назвы: сарочка, штаны, пояс, шапка, якія захаваліся ў рускіх, украінцаў і беларусаў да цяперашняга часу.

З цягам часу ў залежнасці ад канкрэтных гістарычных умоў мужчынскі касцюм відазмяняўся, удасканальваўся. Асабліва значныя змены адбыліся ў парэформенны перыяд. Рост капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы, адыходніцтва, якім пераважна займаліся мужчыны, развіццё гандлёвых сувязей паміж горадам і вёскай абумовілі эвалюцыю мужчынскага касцюма. Паступова ў быт сялян пранікае адзенне з фабрычных матэрыялаў, якое спачатку было выхадным. У час вялікіх свят і народных гулянняў вясковыя хлопцы апраналіся часта ў куплёны касцюм, белую накрухмаленую сарочку, картуз ці фетравы капялюш, хромавыя боты і паліто. Аднак ужыванне фабрычных матэрыялаў і ступень забяспечанасці адзеннем знаходзіліся ў прамой залежнасці ад маёмаснага становішча сям'і. Найбольш заможныя сяляне мелі па некалькі штодзённых і святочных касцюмаў з дарагіх матэрыялаў. Бедныя ж толькі ў рэдкіх выпадках куплялі танны паркаль, корт і г. д. Нягледзячы на гэтыя змены, мужчынскі касцюм беларусаў канца XIX — пачатку XX ст. яшчэ шмат у чым захоўваў сваю этнічную спецыфіку.

Аснову традыцыйнага комплексу мужчынскага адзення беларусаў складалі сарочка і штаны, якія дапаўняліся іншымі элементамі. Самы распаўсюджаны на ўсёй тэрыторыі Беларусі комплекс складаецца з сарочкі, штаноў і пояса.

Адным з самых неабходных элементаў мужчынскага касцюма беларусаў з даўніх часоў з'яўляецца сарочка (кашуля, рубаха). У другой палавіне XIX і пачатку XX ст. яе шылі з даматканага палатна і ў рэдкіх выпадках з фабрычных тканін.

Палатно для мужчынскіх сарочак, як і для жаночых, ткалася «ў проста», г. зн. у два ніты. Гэта самы старажытны і найбольш просты спосаб перапляцення нітак асновы і ўтка. Палатно, вытканае ў два ніты, звычайна гладкае і без узораў. У адрозненне ад жаночых для мужчынскіх сарочак часта ўжывалі палатно ніжэйшага гатунку. Нават святочныя сарочкі не заўсёды былі кужэльнымі і, як адзначаюць інфарматары, часцей з'яўляліся прыналежнасцю маладых мужчын і хлопцаў.

Шылі мужчынскія сарочкі ўручную ў дзве ці больш полак у залежнасці ад шырыні палатна. Як паведамляюць інфарматары, сяляне ткалі нешырокае палатно — прыкладна 40—50 см, радзей 60—70 см. Шырыня палатна залежала ад шырыні бёрда, а таксама і ад якасці пражы. Кужэльная пража была тонкай, і таму для ткання кужалю бралі больш шырокае бёрда — у 12, 14 і больш пасмаў. Пража з пачосся (абдзіркі, вяршкі, зрэб'е) была больш тоўстая, і ткалі яе часцей у 8, 10 пасмаў.

Агульным для ўсіх тыпаў мужчынскіх сарочак з'яўляецца наяўнасць рукавоў, каўняра (адкладнога ці стаячага) і падаплёкі (падапліка) — прамавугольнага кавалка палатна, які прышываўся з унутранага боку да каўняра і даходзіў прыкладна да сярэдзіны спіны. Падаплёка ў мужчынскіх сарочках мела чыста практычнае значэнне.

На тэрыторыі Беларусі другой палавіны XIX — пачатку XX ст. можна выдзеліць наступныя тыпы сарочак па крою: тунікападобны, з палікамі, на гестцы і з плечавымі швамі (рыс. 10).

Самай старажытнай з'яўляецца сарочка тунікападобнага крою. Яна была вядома яшчэ старажытным рымлянам, славянам, літоўцам і

іншым народам[1]. Тунікападобная мужчынская сарочка была суцэльнай і без швоў на плячах. Аснову яе, як і жаночай, складала адна полка палатна адпаведнай даўжыні, якая перагібалася па ўтку на дзве роўныя часткі. На лініі перагібу рабілася адтуліна для галавы. Да бакоў на ўзроўні пляча прышываліся рукавы, а ніжэй, паміж асноўных полак, калі яны былі недастатковай шырыні, устаўляліся бакавыя кліны (прамыя ці касыя). Звычайна ў такіх выпадках адна полка палатна разразалася па аснове на дзве роўныя часткі.

Такі тып сарочак у канцы XIX і пачатку XX ст. быў вядомы на ўсёй тэрыторыі Беларусі, а на ўсходзе, асабліва ў Быхаўскім, Чэрыкаўскім, Гомельскім паветах Магілёўскай губерні і Бабруйскім павеце Мінскай губерні, з'яўляўся пераважаючым (карта 10). У многіх месцах тунікападобная сарочка пачала ўжо выходзіць з моды і стала прыналежнасцю старых.

Сарочка з палікамі агульнаславянская. Апрача беларусаў, рускіх і ўкраінцаў, яна вядома таксама і палякам, і чэхам[2]. Палікі ў мужчынскіх сарочках, як і ў жаночых, ушываліся на плячах паміж асноўнымі полкамі, што рабіла сарочку занадта шырокай, таму, як правіла, вакол шыі яна збіралася ў зборку. Палікі прышываліся па ўтку і, як і ў жаночых сарочках, былі двух тыпаў: прамавугольныя і трапецападобныя. На ўсёй тэрыторыі Беларусі пераважалі палікі прамавугольнай формы. Толькі на ўсходзе ў асобных месцах (Мазырскі і Бабруйскі паветы Мінскай губерні) былі вядомы палікі трапецападобнай формы.

Паліковыя сарочкі часцей за ўсё сустракаліся на Палессі. Сам жа тэрмін «палік» меў шырокае распаўсюджанне, але быў больш характэрны для паўднёвых, паўднёва-ўсходніх і цэнтральных раёнаў Беларусі. На Палессі побач з назвай «палік» шырока бытаваў тэрмін «вустаўка». На захадзе (Гродзенская, Віленская губерні), апрача вустаўкі, была пашырана назва

[1] Б. А. Куфтин. Материальная культура русской мещеры, ч. 1. М., 1926, стар. 23; Г. С. Маслова. Народная одежда русских, украинцев и белорусов. У кн.: Восточнославянский сборник. М., 1966, стар. 581—585; М. Г. Велева, Е. И. Лепавцова. Народная одежда болгар в Северной Болгарии в XIX и начале XX вв. София, 1961, стар. 19; М. К. Слава. Культурно-исторические связи прибалтийских народов по данным одежды. М., 1964, стар. 3.

[2] Г. С. Маслова. Народная одежда русских, украинцев и белорусов, стар. 582—586.




Рыс. 10. Тыпы мужчынскіх сарочак:

*а* — тунікападобная з нізкім каўняром, Ігуменскі п. Мінскай губ.; *б* — тунікападобная са стаячым каўняром (косаваротка), Бабруйскі п. Мінскай губ.; *в* — тунікападобная з адкладным каўняром, Быхаўскі п. Магілёўскай губ.; *г* — з палікамі, Віленскі п. Віленскай губ.; *д*, *е* — на гестцы, Мінскі п. Мінскай губ.




Карта 10. Тыпы мужчынскіх сарочак (канец XIX — пачатак XX ст.):

*1* — тунікападобная; *2* — паліковая; *3* — з гесткай; *4* — з плечавымі швамі (*а* — пераважае, *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

«прырамак», відаць, запазычаная ў палякаў, дзе сарочка з прырамкамі (pryramek) была пераважаючай [3].

У другой палавіне XIX — пачатку XX ст. у Беларусі былі вядомы мужчынскія сарочкі, у якіх на плячах нашываліся паскі тканіны прамавугольнай формы. Называліся яны звычайна наплечнікамі [4], на Гродзеншчыне нарамёнамі (польск. na ramiona — наплечнікі). Аднак даволі часта, відаць, па традыцыі, наплечнікі называліся і вустаўкамі, і прырамкамі. Сарочкі такога тыпу мелі ў XIX ст. шырокае распаўсюджанне і ў прыбалтыйскіх народаў [5].

Сарочка на гестцы прыйшла ў беларускую вёску з горада. Такія сарочкі, як сведчаць матэрыялы экспедыцый, насіла пераважна моладзь. Палатняная мужчынская сарочка на гестцы шылася звычайна адразной на спіне. Ніжняя, адразная частка была больш шырокай за кошт бакавых кліноў і таму збіралася ў зборкі, або проста па цэнтру закладвалася ўнутраная складка. Сарочкі з тонкага паркалю шыліся адразнымі на грудзях і спіне.

[3] Franciszek Kłonowski. Strój warmiński. Wrocław, 1960, стар. 21; Janusz Swieży. Strój podlaski. Wrocław, 1958, стар. 12 і інш.

[4] Н. Я. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии. Витебск, 1895, стар. 103.

[5] М. К. Слава. Культурно-исторические связи..., стар. 3—4.

Сарочка з плечавымі швамі была новай з'явай у вёсцы пачатку XX ст. і спарадычна сустракалася на ўсёй тэрыторыі Беларусі. У першыя дзесяцігоддзі XX ст. у вёсцы пачалі ўжывацца сарочкі тыпу гімнасцёрак з нагруднымі кішэнямі (дадатак, XXIV, *в*).

Па форме каўняра мужчынскія сарочкі можна падзяліць на тры тыпы. Першы — сарочкі з акруглым выразам вакол шыі, які абшываўся вузкім паскам матэрыялу шырынёй 1—2 см. З такім каўняром шыліся пераважна тунікападобныя сарочкі. У народзе іх часта называлі «галаплечкі». Каўнер такога тыпу з'яўляецца найбольш старажытным, але ў канцы XIX — пачатку XX ст. сустракаўся яшчэ часта. Пераважна сарочкі з такім каўняром насілі мужчыны пажылога ўзросту.

Другі тып — сарочкі з адкладным каўняром. Як лічаць даследчыкі, гэта таксама старажытны тып.

Трэці тып — сарочкі з высокім стаячым каўняром. Такі каўнер мог мець разрэз ці па цэнтру, ці з левага боку. Апошнія, так званыя касавароткі часта тунікападобнага пакрою, прыйшлі ў Беларусь ад рускіх. У даследуемы перыяд асабліва распаўсюджаны былі касавароткі ў Магілёўскай і Віцебскай губернях.

Усе тыпы сарочак, за выключэннем касавароткі, мелі прамы разрэз (пазуху) па цэнтру, даўжыня якога дасягала часам 35—40 см. Завязваўся каўнер вузкай тасьмой, стужкай або проста невялічкім паскам матэрыялу. Для святочных сарочак ужываліся чырвоныя стужкі. Гэты спосаб завязвання каўняра агульнаславянскі: ён быў вядомы ўкраінцам, палякам, балгарам. Мужчынскія сарочкі зашпільваліся і на гузікі, куплёныя або самаробныя з ільняной пражы.

Рукавы ў сарочак былі двух тыпаў: прамыя («калошкі») і на манжэтах («манкеты», «абшыўкі», «чэхлікі», «каўнерцы», «каўнерыкі»). У вывучаемы перыяд найбольш пашыраны былі рукавы на манжэтах. Ніз рукава збіраўся ў зборкі і прышываўся да манжэты. Прамы рукаў заканчваўся свабодна: ён звычайна ўжываўся ў паўсядзённых і споднiх сарочках. Для ўсіх тыпаў сарочак быў характэрны нешырокі рукаў.

Як паказала картаграфаванне, для адзення беларусаў другой палавіны XIX і пачатку XX ст. былі характэрны доўгія, амаль да каленяў сарочкі. Насілі іх навыпуск, паверх штаноў і абавязкова падпяразвалі поясам. Без пояса сарочкі насілі толькі ў выключных выпадках: звычайна летам у час працы ў полі ці на балоце.

Спосаб нашэння сарочкі навыпуск — з'ява агульнаславянская. Апрача беларусаў, ён вядомы рускім [6], украінцам (поўнач і захад Украіны), балгарам [7], палякам [8]. У радзе месц у Беларусі сарочку ўбіралі ў штаны. Такі спосаб нашэння сарочкі быў характэрны для маладых мужчын і хлопцаў. Як паказалі архіўныя матэрыялы, ён меў неаднолькавае распаўсюджанне на тэрыторыі Беларусі і часцей за ўсё сустракаўся на Захадзе, а ў асобных паветах (Гродзенскі, Ваўкавыскі, Слонімскі Гродзенскай і Лідскі Віленскай губерняў) з'яўляўся нават пераважаючым (карта 11).

Штаны шыліся з палатна, сукна, паўсукна і фабрычных матэрыялаў. Для штаноў ужывалася звычайна тканіна ніжэйшага гатунку (зрэбніна), вытканая ў 8—10, радзей у 12 пасмаў. У асноўным для штаноў ткалі чатырохнітовы матэрыял саржавага перапляцення (у рады і «ёлачку») [9].

У раёнах, пагранічных з Украінай, у прыватнасці на паўднёвым захадзе, матэрыял, вытканы ў чатыры ніты, называлі «чынавацiна», на Віцебшчыне — «рабізна», у паўднёва-ўсходніх раёнах Беларусі — «радавы».

У радзе месц Віцебскай, Магілёўскай, паўночных раёнах Мінскай губерняў побач з чатырохнітовай для штаноў ужывалася і трохнітовая тканіна. У паўднёвых і паўднёва-ўсходніх раёнах Беларусі штаны шыліся з двухнітовага матэрыялу.

Палатно ткалася пераважна белага колеру, але, як сведчаць архіўныя матэрыялы, белыя палатняныя штаны ў пачатку XX ст. у большай ступені былі вядомы на поўдні Мінскай, у Магілёўскай і паўднёва-ўсходніх паветах Віцебскай губерняў. Насілі іх пераважна мужчыны пажылога ўзросту. У гэты перыяд для мужчынскіх штаноў вельмі часта палатно ткалася ў паскі або клеткі, дзе белыя ніткі перамяжаліся з шэрымі, чорнымі. Такія штаны часта называлі шарачковымі. Палатняныя штаны насілі звычайна летам, але вельмі часта, асабліва беднякі, у зімовую пару надзявалі двое палатняных штаноў.

Суконныя штаны насілі пераважна зімой. У летнюю пару іх надзявалі толькі па святах і шылі з больш тонкага сукна. Хатняе сукно было часцей шэрае, але зрэдку для святочных штаноў яго фарбавалі ў карычневы ці чорны колер.

[6] Г. С. Маслова. Народная одежда русских, украинцев и белорусов, стар. 590.

[7] М. Г. Велева, Е. И. Лепавцова. Народная одежда болгар..., стар. 19.

[8] Tadeusz Seweryn. Strój krakowiaków wschodnich. Wrocław, 1960, стар. 49.

[9] Спосаб ткання ў чатыры ніты найбольш распаўсюджаны ў беларусаў. Ім можна было выткаць тканіну розных узораў. Гэта залежала ад спосабу накідання асновы ў ніты.




Карта 11. Спосаб нашэння мужчынскай сарочкі (канец XIX — пачатак XX ст.):

*1* — навыпуск з поясам; *2* — навыпуск без пояса; *3* — увабраныя ў штаны (*а* — пераважае, *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

З фабрычных матэрыялаў штаны шыліся рэдка. Звычайна такія штаны набывалі для свят маладыя хлопцы і мужчыны з багатых сямей.

Для беларускага мужчынскага касцюма канца XIX — пачатку XX ст. былі характэрны штаны, якія складаліся з дзвюх полак палатна ці сукна патрэбнай даўжыні. Кожная полка паасобку перакладвалася на дзве роўныя часткі па аснове, знізу сшывалася, а ўверсе абедзве полкі злучаліся пры дапамозе кліноў («крэсла», «садно», «ластаўка», «гузенне» і інш.), якія ўстаўляліся звычайна для зручнасці руху. Прычым і форма кліноў, і спосабы, якімі яны ўшываліся, былі настолькі разнастайнымі, што ўсе нават цяжка ўлічыць. Таму вылучым тыпы штаноў, найбольш характэрныя для беларусаў: штаны з ромбападобнай (ці квадратнай) устаўкай, з двума трохвугольнымі клінамі, з адной трохвугольнай устаўкай (рыс. 11).

Штаны з ромбападобнай устаўкай былі вядомы амаль паўсямесна (карта 12). Устаўка ўяўляла сабой квадратны кавалак палатна адпаведнай велічыні, які ўшываўся ў штаніны вугламі (рыс. 11, *а*).

Штаны з двума трохвугольнымі клінамі былі таксама распаўсюджаны на ўсёй тэрыторыі Беларусі, але часцей сустракаліся на Магілёўшчыне, а ў некаторых паветах (Магілёўскім, Быхаўскім, Мсціслаўскім) гэты тып мужчынскіх штаноў з'яўляўся пераважаючым (карта 12). Трохвугольныя кліны ўшываліся двума спосабамі. Найбольш архаічны — калі кліны




Карта 12. Тыпы мужчынскіх штаноў (канец XIX — пачатак XX ст.):

*1* — з ромбападобнай ці квадратнай устаўкай; *2* — з двума клінамі; *3* — з адной трохвугольнай устаўкай; *4* — з круглай устаўкай (*а* — пераважае, *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

вострымі вугламі ўшываліся ўверсе і ў некаторых выпадках даходзілі да пояса (рыс. 11, *б*). У пачатку XX ст. шырокае распаўсюджанне атрымаў спосаб, калі трохвугольныя кліны вострымі вугламі ўшываліся ў штаніны (рыс. 11, *в*).

Значна радзей шыліся штаны з адной трохвугольнай устаўкай. Звычайна клін вострым вуглом ушываўся паміж асноўных полак спераду, а ззаду да асновы трохвугольніка прышываўся невялікі кавалак тканіны прамавугольнай формы (рыс. 11, *г*). Раёны распаўсюджання штаноў такога тыпу знаходзіліся пераважна ў Клімавіцкім, Рагачоўскім, Горацкім паветах Магілёўскай губерні, у Пінскім, Мазырскім і Рэчыцкім паветах Мінскай губерні і ў Ваўкавыскім і Кобрынскім паветах Гродзенскай.

Апрача пералічаных, беларусам былі вядомы і іншыя тыпы мужчынскіх штаноў. Так, у паўднёва-ўсходняй частцы Віцебскай губерні сустракаліся штаны з круглай устаўкай. Яны былі вельмі шырокімі ў кроку, і, магчыма, з гэтай прычыны іх называлі «кроклямі», «кроквамі». Як паведамляюць інфарматары, гэты тып штаноў быў характэрны для больш ранняга часу і ў пачатку XX ст. сустракаўся рэдка. Трэба заўважыць, што і наяўнасць кліноў, і велічыня іх вызначаліся шырынёй матэрыялу. Этнаграфічныя даныя сведчаць, што ў тых выпадках, калі матэрыял быў дастаткова шырокім, штаны шыліся без уставак [10].

[10] Архіў ІМЭФ АН БССР, ф. 6, воп. 11, спр. 247, л. 4; спр. 261, л. 4; спр. 406, л. 6; спр. 408, л. 5; спр. 411, л. 6.

У разглядаемы перыяд мужчынскія штаны на Беларусі шыліся пераважна на поясе (каўняры) шырынёй прыкладна 3—4 см, які зашпільваўся на гузікі (касцяныя ці медныя) або на драўляную палачку. Такія штаны, як адзначае Нікіфароўскі, на Віцебшчыне называліся «каўняровымі» [11].

«Бескаўняровыя» штаны, г. зн. тыя, што трымаліся на шнурку, працягнутым у паясьнічную абшыўку, былі характэрны для больш ранняга перыяду і ў канцы XIX — пачатку XX ст. шырокага распаўсюджання не мелі і сустракаліся ў асноўным на Палессі.

У Беларусі мужчынскія штаны называліся па-рознаму: «штаны», «порты», «нагавіцы», «ганавіцы», «суконнікі», «учкуры» і інш. Найбольш характэрны тэрмін «штаны», які быў амаль паўсямесна распаўсюджан на тэрыторыі Беларусі і нярэдка з'яўляўся пераважаючым.

Некаторыя з тэрмінаў мелі лакальнае значэнне. Так, «нагавіцы», ці «ганавіцы», па нашых матэрыялах, бытавалі ў асноўным на тэрыторыі Гродзенскай губерні, у некаторых паветах Віленскай (Віленскі, Ашмянскі, Лідскі) і заходніх паветах Мінскай губерняў. Назва «суконнікі» найбольш характэрна для Магілёўскай і поўдня Мінскай губерняў. Тэрмін «учкуры» сустракаецца ў Бабруйскім, Рэчыцкім, Мазырскім паветах Мінскай губерні і хутчэй за ўсё запазычан ад украінцаў. Цікава адзначыць, што ні адзін з адзначаных тэрмінаў не сустракаецца ў матэрыялах больш ранніх часоў. Выключэннем з'яўляецца толькі назва «порты», але і яна азначае не штаны, а хутчэй за ўсё адзенне наогул. Так, у Ніканаўскім летапісе гаворыцца: «И ездиша порты своя с плеч спущающе» [12].

У дакументах пачынаючы з XVI ст. пры апісанні мужчынскага адзення заможных сустракаецца тэрмін «шаравары» [13], а калі пералічваецца адзенне простага народа, штаны не адзначаюцца [14]. Гэта дае падставу меркаваць, што штаны як адзін з элементаў мужчынскага касцюма з'явіліся пазней, чым сарочка.

Здаўна абавязковай прыналежнасцю мужчынскага касцюма беларусаў з'яўляўся пояс («крайка», «акрайка», «кушак», «каснік» і інш.).

М. Я. Нікіфароўскі пісаў, што з'яўленне на людзях «без шапкі і басаном не здзівіць старонніх так, як з'яўленне без апаяскі» [15]. Поясам падпяразвалі сарочкі, а таксама верхняе адзенне. У адрозненне ад жаночага касцюма, дзе пояс хутчэй за ўсё з'яўляўся адным з элементаў упрыгожання, у мужчынскім касцюме ён перш за ўсё меў практычнае значэнне. Гэта пацвярджае, напрыклад, дакумент першай паловы XVI ст., у якім гаворыцца, што ў выніку няшчаснага выпадку «абарваўся пояс і загінуў мяшок з грашыма» [16]. Відаць, мелася на ўвазе «каліта» (невялікі мяшочак, куды хавалі грошы, тытунь і дробныя рэчы і насілі на поясе яшчэ і ў канцы XIX—пачатку XX ст.). На поясе насілі нож у чахле і іншыя неабходныя прадметы.

У залежнасці ад матэрыялу паясы можна падзяліць на суконныя і паўсуконныя. Суконныя ўжываліся на ўсёй тэрыторыі Беларусі, паўсуконныя (аснова ільняная, уток суконны)

[11] Н. Я. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья..., стар. 106.

[12] Гл. у кн.: Опыт об одежде, оружии, нравах, обычаях и степени просвещения славян. СПб, 1832, стар. 32.

[13] АВАК, т. XVII, 1890, стар. LXVII.

[14] Там жа, т. VI, Вильно, 1872, стар. 43, 65, 66; там жа, т. II, 1867, стар. 266 і інш.

[15] Н. Я. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья..., стар. 107.

[16] АВАК, т. VI, 1872, стар. 60.




Рыс. 11. Тыпы мужчынскіх штаноў:

*а* — з ромбападобнай устаўкай, Пружанскі п. Гродзенскай губ.; *б*, *в* — з двума трохвугольнымі ўстаўкамі, адпаведна Мсціслаўскі і Быхаўскі п. Магілёўскай губ.; *г* — з адной трохвугольнай устаўкай, Рэчыцкі п. Мінскай губ.




Карта 13. Тыпы паясоў па спосабу вырабу (канец XIX — пачатак XX ст.):
*1* — тканыя; *2* — плеценыя; *3* — вязаныя; *4* — скураныя (*а* — пераважае, *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

часцей сустракаліся на тэрыторыі Віцебскай, Магілёўскай і ва ўсходніх раёнах Мінскай губерняў.

Па спосабу вырабу паясы дзеляцца на тры тыпы: плеценыя, тканыя і вязаныя (карта 13; дадатак, XXXII).

Найбольш старажытнымі з'яўляюцца плеценыя паясы. Яны былі вядомы на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Плялі іх рознымі спосабамі: «на назе», «на вілачцы», «на сцяне», пры дапамозе катушкі і інш.[17] Плеценыя паясы былі плоскімі і круглымі. Пры пляценні «на сцяне», «на назе», «на вілачцы» атрымліваліся плоскія паясы шырынёй прыкладна ад 2,5 да 5,5 см. Круглыя пляліся пры дапамозе катушкі (драўляная калодачка цыліндрычнай формы), у адтуліну якой апускалі рознакаляровыя ніткі, а зверху забівалі чатыры тонкія цвічкі ці шпількі, пры дапамозе якіх і плялі паясы. Круглыя паясы часта называлі кручанымі. Такія паясы выяўлены намі на ўсходзе Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Круглыя паясы былі вядомы і рускім [18].

Самымі распаўсюджанымі на ўсёй тэрыторыі Беларусі былі тканыя паясы. Выраблялiся паясы разнастайнымі спосабамі: на дошчачках, на нітах, на бёрдачках і інш.[19] і былі роз-

[17] Н. И. Лебедева. Прядение и ткачество восточных славян. У кн.: Восточнославянский сборник. М., 1956, стар. 499—509.

[18] Русские. Историко-этнографический атлас. М., 1967, стар. 240.

[19] Н. И. Лебедева. Прядение и ткачество..., стар. 504—509.

най шырыні — прыкладна ад 3 см да 20 см і больш.

Вязаныя паясы, як сведчаць этнаграфічныя крыніцы, мелі ў Беларусі лакальнае распаўсюджанне. Яны бытавалі ў асноўным у Мазырскім, Пінскім, Рэчыцкім паветах Мінскай губерні, Клімавіцкім і Сенненскім паветах Магілёўскай губерні. Вязаліся яны заўсёды з аднакаляровых суконных нітак пераважна чырвонага колеру. Шырыня іх дасягала 15—26 см. Даўжыня была прыблізна ад 2 да 3 і больш метраў. Пояс абкручвалі вакол таліі 2—4 разы і завязвалі збоку ці наперадзе бантам, радзей вузлом. Канцы пояса звычайна ўпрыгожвалі рознакаляровымі кутасамі, якія звісалі ўніз і даходзілі да каленяў.

У многіх месцах Беларусі пояс меў абрадавае значэнне, асабліва ў вясельным абрадзе. Са старажытных часоў нявеста ў час вяселля абдорвала паясамі радню жаніха [20]. У Беларусі пояс прыносіўся як ахвяра царкве ці касцёлу [21]. З поясам былі звязаны розныя павер'і, замовы і заклінанні.

Пояс шырока выкарыстоўваўся ў быце беларускага народа, напрыклад пры спавіванні дзяцей. На Беларусі вядомы звычай, калі бабка, першы раз ідучы на адведкі да парадзіхі, апрача апялюшак, несла і пояс. Вялікай роллю, якую ігралі паясы ў народным быце, тлумачыцца іх шырокі выраб і багатае мастацкае афармленне.

Беларускі пояс звычайна ўпрыгожваўся разнастайным арнаментам (ромбы, квадраты, зорачкі, паскі і інш.) у розным каляровым спалучэнні. Як сведчаць этнаграфічныя матэрыялы, побач са шматкаляровымі паясамі беларусы амаль паўсюдна насілі і аднатонныя паясы, пераважна чырвоныя, сінія, зялёныя. Высокімі мастацкімі якасцямі вызначаліся святочныя паясы. Нярэдка адзін святочны пояс служыў некалькім пакаленням і з'яўляўся яркім прыкладам вялікага майстэрства беларускіх жанчын-сялянак.

Акрамя паясоў, беларускія сяляне насілі скураныя рамяні («рэмень», «папруга», «дзяга», «дзяжка»). У бяднейшых сялян гэта часцей былі самаробныя нешырокія рамяні з сырамятнай скуры. Купленыя рамяні, нярэдка шырокія з металічнай спражкай, былі ў асноўным у заможных сялян.

Даволі пашыраным на Беларусі быў комплекс мужчынскага адзення з безрукаўкай («спанцэрка», «жылетка», «чулейка» і інш.). Па нашых матэрыялах, найбольш пашыран ён быў на захадзе Беларусі (Гродзенская, паўднёвы ўсход Віленскай і захад Мінскай губерняў). На астатняй тэрыторыі гэты комплекс быў прадстаўлен некалькі нераўнамерна, а ў асобных паветах (Гарадоцкі, Лепельскі Віцебскай, Барысаўскі Мінскай, Мсціслаўскі і Чэрыкаўскі паветы Магілёўскай губерняў) адсутнічаў увогуле. На ўсходзе Беларусі комплекс з безрукаўкай абавязкова дапаўняў пояс, а ў радзе месц, асабліва на захадзе, пояс адсутнічаў.

Звесткі аб наяўнасці мужчынскага адзення без рукавоў сустракаюцца ў дакументах першай палавіны XVI ст. Так, у Актавай кнізе Гродзенскага земскага суда за 1539—1540 гг., апрача іншых элементаў мужчынскага адзення, называецца «жупіца» і даецца тлумачэнне: «адзенне без рукавоў» [22].

Шыліся безрукаўкі пераважна з матэрыялаў дамашняга вырабу. Толькі ў мужчын з больш заможных сямей былі святочныя безрукаўкі з фабрычных матэрыялаў, але даволі рэдка. Безрукаўкі, як правіла, шыліся з аднакаляровых, звычайна цёмных тканін, і толькі ў некаторых месцах (Магілёўшчына і Палессе) — з узорнай тканіны [23] (звычайна з кавалкаў сукна, не выкарыстаных для андаракаў). Даволі часта шылі камбінаваныя безрукаўкі, у якіх перад быў з больш якаснага матэрыялу, а спінка — з горшага (палатна ці танных фабрычных тканін). Для халоднай пары шылі цёплыя жылеткі з аўчын.

У залежнасці ад крою мужчынскія безрукаўкі былі двух тыпаў: прамыя і ў талію. Як сведчаць этнаграфічныя матэрыялы, на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. пераважалі безрукаўкі прамога крою. Шытыя безрукаўкі абодвух тыпаў былі расхіннымі і складаліся з чатырох полак. Спінка сшывалася з дзвюх полак, а дзве полкі спераду зашпільваліся на гузікі, зрэдку на гаплікі. Іншы раз на спіне прышываўся хлясцік, тады спінка крыху збіралася. Спераду амаль усе безрукаўкі мелі невялічкія кішэні (рыс. 12).

Апрача шытых, былі вядомы і вязаныя безрукаўкі (на спіцах). У большасці выпадкаў яны былі нерасхіннымі. Вязаліся спачатку дзве полкі, якія потым сшываліся па баках. Вязаныя безрукаўкі не мелі шырокага распаўсюджання і сустракаліся ў паўночна-ўсходніх раёнах.

[20] Н. Я. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья..., стар. 108.

[21] Л. И. Якунина. Слуцкие пояса. Минск, 1960, стар. 54.

[22] АВАК, т. XVII, 1890, стар. 57.

[23] Е. Р. Романов. Белорусский сборник, вып. VIII, 1915, стар. 24; Архіў ІМЭФ АН БССР, ф. 6, воп. 11, спр. 122, л. 45; спр. 126, л. 8.




Рыс. 12. Тыпы мужчынскіх безрукавак:
*а, б* — Лепельскі п. Віцебскай губ.; *в, г* — Лідскі п. Віленскай губ.

Своеасаблівым відам безрукаўкі быў нагруднік. Ён уяўляў сабой кавалак сукна ці аўчыны прамавугольнай формы з прышытым стаячым каўняром, які ззаду зашпільваўся. З бакоў прышываліся шнуркі і таксама завязваліся ззаду. Такія нагруднікі насілі ў халодную пагоду на поўначы Беларусі.

А. І. Сербаў таксама ўпамінае нагруднікі, якія шыліся мясцовымі краўцамі з сукна, сцягваліся на сярэдзіне і мелі каўнер [24].

Мужчынскі касцюм у адрозненне ад жаночага не вызначаўся багаццем упрыгожанняў. З усіх састаўных частак, калі не лічыць пояса, упрыгожвалася толькі сарочка і то пераважна святочная. Сарочкі, якія насілі ў будныя дні, ніколі не ўпрыгожваліся. Чыста белай была сарочка, падрыхтаваная на смерць [25].

Упрыгожваліся мужчынскія сарочкі тканым і вышытым арнаментам, які размяшчаўся звычайна на манжэтах, каўняры, пазусе і падоле. У тканым арнаменце пераважаў геаметрычны ўзор, які часцей за ўсё ўяўляў сабою паскі, затканыя чырвонымі ніткамі. У вышытым арнаменце ўзор быў больш разнастайны. Тут часцей ужываліся рознакаляровыя ніткі (чырвоныя ў спалучэнні з чорнымі або сінімі і інш.). Вышываліся сарочкі, як правіла, простым крыжам. Раслінны арнамент на мужчынскіх сарочках часцей за ўсё сустракаўся на Палессі.

Багата ўпрыгожвалася мужчынская сарочка-касаваротка (дадатак, XXV, *а*). Разрэз збоку даваў магчымасць натыкаць або вышываць даволі шырокую манішку — прыкладна 10—15 см. На Палессі (Бабруйскі, Мазырскі паветы і інш.) манішкі («пазухі») натыкаліся або вышываліся асобна, а потым нашываліся на сарочку. Часта для ўпрыгожвання мужчынскай сарочкі каўнер, манжэты і палоску шырынёй 8—10 см, якая нашывалася на грудзях, рабілі з паркалю.

## ГАЛАЎНЫЯ ЎБОРЫ

У агульным комплексе мужчынскага адзення беларусаў важная роля належала галаўным уборам. У сувязі з імі цікавым з'яўляецца і пытанне аб прычосках.

У канцы XIX — пачатку XX ст. беларусы пераважна падразалі валасы ў кружок, даўжыня іх дасягала прыкладна сярэдзіны вуха. Такая прычоска, у прыватнасці, на Палессі называлася «пад гаршчок». Яна характарызавала знешні выгляд маладых і сярэдняга ўзросту мужчын. Мужчыны пажылога ўзросту яшчэ насілі доўгія валасы, толькі спераду падразалі прыкладна да сярэдзіны лба. Але прычоска такога тыпу ў гэты перыяд сустракалася ўжо рэдка. У пачатку XX ст. мужчыны, асабліва моладзь, пачалі насіць кароткую прычоску. Валасы зачэсваліся ўгору, а на патыліцы коратка падстрыгаліся.

Мужчынскія шапкі выраблялі́ся з воўны, футра, сукна, а таксама саломы. Па спосабу вырабу іх можна падзяліць на шытыя, валеныя і плеценыя. Па форме мужчынскія шапкі былі даволі разнастайнымі.

На тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. найбольш пашыраны былі мужчынскія шапкі, якія мелі форму цыліндра з плоскім, паўсферычным, радзей чатырохвугольным верхам, і шапкі конусападобнай формы (конуса ці ўсечанага конуса). Гэтыя тыпы былі вядомы па ўсёй Беларусі (рыс. 13).

Самым старажытным галаўным уборам мужчын, вядомым усходнім славянам яшчэ з XI—XII стст., з'яўлялася зімовая шапка з футра лісы, белкі, зайца і інш. Але ў канцы XIX — пачатку XX ст. такія шапкі ў асяроддзі сялян сустракаліся рэдка. У большасці выпадкаў сяляне шылі зімнія шапкі з аўчыны (звычайна

[24] А. І. Сербаў. Вічынскія паляне. Зборнік артыкулаў Інстытута беларускай культуры. Мінск, 1928, стар. 31—32.

[25] М. Я. Гринблат. Белорусы. Мінск, 1968, стар. 225.




Рыс. 13. Тыпы мужчынскіх галаўных убораў:

*а, б, в* — валеныя магеркі, Магілёўская губ.; *г, д* — аблавухі, Палессе; *е* — малахай, Палессе; *ж, з* — шапкі з чатырохвугольным верхам, Кобрынскі п. Гродзенскай губ.; *і* — шапка з высокім круглым верхам, Ігуменскі п. Мінскай губ.; *к, л* — шапкі з вушамі, Дзісенскі п. Віленскай губ.; *м* — валены брыль, Пінскі п. Мінскай губ.

з аўчынкі ягнят) футрам звонку. Часцей яны мелі паўсферычную форму. Зрэдку сустракаліся шапкі, якія мелі форму высокага цыліндра ці конуса. Такія шапкі называліся «кучма», «кучомка». У некаторых месцах паўднёва-заходняй Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. бытавалі высокія шапкі — «капузы». Насілі іх у гэты перыяд толькі ўжо зусім старыя мужчыны. Капуза была вельмі вялікіх памераў, і ў народзе існаваў нават такі жарт, што гэта шапка ў «паўтара барана». Апрача беларусаў, кучма і капуза былі вядомы таксама і ўкраінцам [26].

На захадзе і ў некаторых месцах на паўднёвым захадзе Беларусі сустракаліся таксама футравыя (зрэдку суконныя) шапкі з высокім чатырохвугольным верхам, якія мелі шырокае распаўсюджанне і ў палякаў.

У беларусаў былі вядомы таксама футравыя шапкі, пацягнутыя зверху сукном, часцей даматканым. Верх у іх быў круглым і складаўся з чатырох частак. Да яго знізу кругом прышываўся даволі шырокі пасак сукна з вушамі па баках. Вушы падбіваліся таксама аўчынкай. Спераду быў футравы казырок, які прышываўся да верху шапкі. У некаторых выпадках такія шапкі мелі і конусападобную форму. Называліся яны «малахай», які ў беларусаў, таксама як і ў рускіх [27], у канцы XIX ст. сустракаўся ўжо рэдка. Але сама назва захавалася ў беларусаў да нашых дзён. На паўднёвым захадзе Беларусі людзі пажылога ўзросту і цяпер звычайную шапку-вушанку часта называюць «малахай».

У другой палавіне XIX — пачатку XX ст. пачала знікаць шырока бытаваўшая раней старадаўняя шапка-«аблавуха». Была яна звычай-

[26] К. І. Матейко. Головні убори українських селян до початку XX ст. «Народна творчість та етнографія», 1973, № 3, стар. 53.

[27] Русские. Историко-этнографический атлас, стар. 239.




Карта 14. Тыпы мужчынскіх шапак па матэрыялу (канец XIX — пачатак XX ст.):
*1* — саламяныя; *2* — футравыя; *3* — валеныя; *4* — з тканіны (*а* — пераважае, *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

на конусападобнай формы. Шылася з аўчыны і ў некаторых выпадках з футра лісы, зайца. Зверху аблавуха пацягвалася сукном. Да асновы шапкі прышываліся вушы: спераду, ззаду і з бакоў. Бакавыя вушы звычайна падвязваліся пад падбародкам, а пярэдняе і задняе завязваліся зверху. «Сапраўдная аблавуха, — пісаў Нікіфароўскі,— пашытая з аўчыны, падбітая кудзеляй, пацягнутая сукном і ўмасціўшая якую-небудзь дарожную паклажу, важыла звыш пяці фунтаў» [28]. Больш прыгожа выглядалі аблавухі, якія шыліся гарадскімі ці местачковымі краўцамі з лісінага ці вавёркавага футра і пацягваліся фабрычным сукном. У пачатку XX ст. амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі сяляне насілі шапкі-вушанкі, па форме падобныя да сучасных.

У канцы XIX — пачатку XX ст. у беларусаў бытавалі валеныя шапкі [29] («магерка», «маргелка», «валёнка», «каўпак», «брыль»). Яны былі вядомы ў большасці паветаў Бела-

[28] Н. Я. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья..., стар. 114.

[29] Н. К. Заметки о г. Борисове и его уезде. «Минские губернские ведомости», 1866, № 23; П. В. Шейн. «Материалы...», т. III, стар. 44; Е. Р. Романов. Белорусский сборник, вып. VIII, стар. 25; И. А. Сербов. Поездки по Полесью 1911 и 1912 гг. Вильна, 1914, стар. 4; Дембовецкий. Опыт описания Могилевской губернии, кн. 1. Могилев, 1882, стар. 476; Н. Я. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья..., стар. 113—114; Архіў ІМЭФ, ф. 6, воп. 11, 1966—1970 гг.

русі (карта 14) і выраблялiся з воўны ў большасці выпадкаў мясцовымі шапаваламі. Колер валеных шапак быў даволі разнастайным: чорны, сівы, карычневы, белы (у залежнасці ад масці авечак). На Магілёўшчыне, ва ўсходніх раёнах Віцебскай губерні часцей сустракаліся белыя магеркі. Тэхналогія вырабу валеных шапак была нескладанай. Старанна расчэсаную воўну клалі на кавалак мокрага палатна, скручвалі ў трубку і качалі рукамі, пакуль не зваліцца лямец. Рабілі звычайна два такіх лямцы і клалі адзін на другі. З аднаго канца лямцы злучалі, надаючы ім патрэбную форму шапкі, а з унутранага боку паміж імі клалі таксама кавалак мокрага палатна, каб лямцы не зваліліся разам. Знізу і зверху таксама клалі палатно і валілі зноў, паліваючы кіпнем. Зваленую такім спосабам шапку нацягвалі на спецыяльнае прыстасаванне (звычайна драўляны манекен) і сушылі.

Валеныя галаўныя ўборы, таксама як і футравыя, былі рознай формы: у выглядзе конуса, усечанага конуса ці цыліндра (звычайна невысокага) з увагнутым або выпуклым верхам. Нярэдка магеркі рабіліся з палямі, якія шчыльна прылягалі да тулы. (Сяляне, адпраўляючыся ў горад, часта хавалі за палямі грошы). Ад вышыні палёў залежала і назва самой шапкі. Так, на Магілёўшчыне і Міншчыне бытавалі валеныя магеркі, у якіх загнутыя палі дасягалі амаль дна шапкі — «двайная магерка». Калі палі даходзілі толькі да палавіны шапкі — «паўдвайная магерка». У Гомельскім і Рагачоўскім паветах Магілёўскай губерні такая шапка была вядома пад назвай «магеркапістон» [30]. Даволі часта валеныя шапкі ўвогуле называлі «валёнка», «каўпак» або проста «шапка». Гэтыя назвы былі шырока вядомы на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

У канцы XIX — пачатку XX ст. валеныя шапкі, хоць і бытавалі шырока ў Беларусі, пераважалі на ўсходзе, асабліва на Магілёўшчыне, дзе быў даволі развіты шапавальны промысел.

Апрача беларусаў, валеныя шапкі былі характэрны для рускіх («шапка-валёнка») [31], украінцаў («шоломок», «магерка») [32]. На тэрыторыі Беларусі найбольш пашырана назва «магерка», якая сустракаецца ў матэрыялах першай палавіны XVII ст. Гэта гаворыць аб тым, што беларусам яна вядома з даўніх часоў. Безумоўна, мы не можам сцвярджаць, што гэта была валеная магерка, тым больш што ў некаторых месцах Беларусі магеркай называлі звычайную шапку, пашытую з сукна. Шапкі з ва-

[30] ДМЭН СССР, калекцыі 351—2, 352—3, 531—4.
[31] Русские. Историко-этнографический атлас, стар. 238.
[32] К. І. Матейко. Головні убори українських селян до початку XX ст. «Народна творчість та етнографія», 1973, № 3, стар. 53.




Рыс. 14. Саламяныя мужчынскія галаўныя ўборы:

*а* — капялюш, Лепельскі п. Віцебскай губ.; *б* — фуражка, Мазырскі п. Мінскай губ.; *в* — спосаб пляцення ў зубчыкі, *г* — спосаб прамога пляцення

ленага сукна або вязаныя з суконных нітак называліся магеркамі і ў палякаў [33].

У адрозненне ад футравых шапак валеныя насілі не толькі зімой, а і восенню і нават у летнюю пару. Як адзначаюць некаторыя даследчыкі, беларус здымаў магерку толькі перад панам або перад сном [34].

На Беларусі бытавалі яшчэ войлачныя шыракаполыя шапкі — «капелюшы», ці «брылі». Войлачны брыль (капялюш) уяўляў сабой каўпак з палямі, якія толькі крыху загіналіся ўгару і не прылягалі да сценак шапкі, як у звычайнай магерцы. Паверх палёў пры самай аснове брыль нярэдка апаясваўся чорнай, а таксама карычневай, зялёнай, сіняй тасьмой шырынёй 2—3 см.

У канцы XIX — пачатку XX ст. паўсюдна ў Беларусі летнім галаўным уборам мужчын становіцца шапка з казырком (фуражка, шапка, картуз), якая ў гэты перыяд была шырока распаўсюджана ў рускіх, украінцаў, балгар, палякаў, літоўцаў і іншых суседніх народаў.

Беларускі селянін насіў куплёную фуражку з каляровым аколышкам і каляным казырком накшталт колішніх ваенных шапак. Фуражкі з саматканага сукна ці палатна сустракаліся рэдка. Намі адзначаны яны ў некаторых месцах Віцебскай і Магілёўскай губерняў (карта 14).

[33] Barbara Kaznowska-Jarecka. Strój biłgorajsko-tarnogrodzki. Wrocław, 1958, стар. 24; О. А. Ганцкая. Народное искусство Польши. М., 1970, стар. 88.

[34] Живописная Россия, т. III, ч. II. СПб.— М., 1882, стар. 454.

Летнім галаўным уборам беларусаў з'яўляліся шыракаполыя капелюшы, якія таксама называлі брылямі (рыс. 14, *а*). Пляліся яны з жытняй, у рэдкіх выпадках з пшанічнай саломы, радзей з чароту, лазы і інш. Капелюшы з чароту і іншых прыгодных для гэтага раслін былі толькі саматробнымі. Насілі іх большай часткай дзеці і пастухі. Саламяныя ж рабілі самі ці куплялі (звычайна святочныя).

Самаробныя саламяныя капелюшы часцей сустракаліся ў паўднёвых раёнах Палесся. На Гродзеншчыне больш насілі куплёныя. Для капелюшоў бралі звычайна сцяблы жыта, калі яно ўжо каласуе і пачынае спець. Са сцябла рвалі апошняе самае доўгае калена, на якім расце колас. Спачатку сцяблінку крыху расплюшчвалі (нават крыху змочвалі вадой для гнуткасці) і плялі паскі. Плялі іх двума спосабамі — у зубчыкі і прамым. Пляценне ў зубчыкі больш складанае, і капялюш такога тыпу выглядаў даволі прыгожа. Плёўся ён з двух сцяблоў, перагнутых пасярэдзіне на дзве роўныя часткі (рыс. 14, *в*). Пляценне прамое нескладанае (звычайна бралася чатыры сцяблы) (рыс. 14, *г*). Гэты спосаб быў больш пашыран у беларусаў. Гатовыя паскі сшываліся ніткамі або конскім воласам. Апрача капелюшоў, некаторыя сяляне плялі з саломы фуражкі (рыс. 14, *б*).

Плеценыя мужчынскія галаўныя ўборы больш характэрны для заходніх і паўночна-заходніх раёнаў Беларусі (Гродзенская, Віленская, Віцебская губерні). Радзей сустракаліся яны ў Мінскай і Магілёўскай губернях.

# ВЕРХНЯЕ АДЗЕННЕ І АБУТАК

Геаграфічнае размяшчэнне і клімат Беларусі абумовілі неабходнасць верхняга адзення ў беларусаў, якое надзявалася ў халодную пару года. Першыя вядомыя нам звесткі аб верхнім адзенні на тэрыторыі Беларусі сустракаюцца ў матэрыялах XVI ст., дзе пералічваюцца назвы, тканіны, у некаторых выпадках колер верхняга адзення розных слаёў насельніцтва. Так, у актах Гродзенскага земскага суда за 1539—1540 гг. даецца апісанне адзення заможных слаёў і простага народа. У багатых, напрыклад, адзначаюцца шуба з футра лісы, пацягнутая дарагім сукном, зіпун з кельцкага палатна, а ў простага народа — кажух, шэрая сярмяга [1].

Найбольш поўныя даныя па верхняму народнаму адзенню беларусаў маюцца ў матэрыялах пачынаючы з другой палавіны XIX ст.

У гэты перыяд беларусы шылі верхняе адзенне ў большасці выпадкаў з матэрыялаў хатняга вырабу: сукна, аўчын, палатна. Але з канца XIX ст. у сувязі з інтэнсіўным развіццём капіталізму і ў выніку ўзросшых сувязей паміж горадам і вёскай у сельскую мясцовасць пачынае пранікаць верхняе адзенне з фабрычных матэрыялаў. З'явілася яно ў першую чаргу ў вёсках, якія знаходзіліся непадалёку ад гарадоў і мястэчак, а таксама ў месцах, звязаных з адыходнымі промысламі. Так, напрыклад, у жыхароў в. Лучын Рагачоўскага павета, дзе большасць мужчын займаліся сплавам лесу, было пашырана верхняе адзенне з купленага чорнага матэрыялу — «ангеркі» [2]. Шыліся яны прамымі, крыху прыталенымі, на падкладцы з кудзелі. Пранікненню ў вёску верхняга адзення з фабрычных матэрыялаў садзейнічала, відаць, і развітая ў той час тэкстыльная прамысловасць Беларусі. Толькі ў Мінскай губерні налічваліся чатыры суконныя фабрыкі, прадукцыя якіх збывалася не толькі ў Беларусі, а ў значнай колькасці пастаўлялася за яе межы: у Кіеў, Маскву, Варшаву і інш.[3] Аднак, нягледзячы на гэта, у канцы XIX і пачатку XX ст. верхняе адзенне з купленых фабрычных матэрыялаў займала параўнаўча нязначнае месца. Асноўная маса сялянства па-ранейшаму шыла адзенне з даматканіны.

Самым пашыраным матэрыялам для вырабу верхняга адзення з'яўлялася сукно. Верхняе адзенне з сукна было распаўсюджана на ўсёй тэрыторыі Беларусі, асабліва ў Гродзенскай і Мінскай губернях, дзе была больш развіта авечкагадоўля [4].

У раёнах ільнаводства [5] (Віцебская, поўнач Віленскай, Магілёўскай губерняў) верхняе адзенне, апрача сукна, шылі з паўсукна і палатна. Сукно і паўсукно выраблялі з воўны нізкай якасці (звычайна веснавой стрыжкі). Стрыглі авечак уручную спружыннымі нажніцамі, якія, калі меркаваць па археалагічных даных, былі вядомы на тэрыторыі Беларусі ў II — V стст. н. э.[6] Воўну абавязкова мылі, сушылі, скублі рукамі, а потым часалі на спецыяльных ваўначосках і пралі пры дапамозе верацяна ці на калаўроце («самапрадка»). Сукно і паўсукно ткалася пераважна ў чатыры ніты. Пры такім спосабе ткання матэрыял набываў яшчэ большую шчыльнасць і моцнасць.

Гатовыя матэрыялы падвяргаліся некаторай дадатковай апрацоўцы. Сукно і паўсукно абавязкова валілі ў спецыяльных майстэрнях — «валюшнях» або ў хатніх умовах.

Сукно часта фарбавалі ў карычневы, зрэдку ў чорны колер. Спосабы фарбавання сукна былі розныя. Напрыклад, у паўднёва-заходніх

[1] АВАК, т. XVII. Вильно, 1890, стар. LXVII, LXX.

[2] Архіў ІМЭФ, ф. 6, воп. 7, спр. 956, л. 3.

[3] И. Зеленский. Минская губерния. Материалы для географии статистики России, собранные офицерами Генерального штаба, ч. 2. СПб, 1864, стар. 258.

[4] Гісторыя Беларускай ССР, т. 1. Мінск, 1972, стар. 474.

[5] Там жа, стар. 473.

[6] Очерки по археологии Белоруссии, ч. 1. Минск, 1970, стар. 174.

раёнах Беларусі для фарбавання сукна ў карычневы колер ужывалі торф. Яго клалі ў чыгун, залівалі вадой і ставілі ў печ, потым у гэту масу клалі сукно і трымалі суткі і нават больш. У некаторых выпадках сукно проста мачылі ў балотнай, «іржавай» вадзе, а потым яшчэ клалі ў настой іржавага жалеза: звычайна бралі стружку, якую ў некаторых месцах, напрыклад у Мінскай губерні, называлі «брусына ад тачыла». Атрымліваўся чорны колер, і, як адзначаюць інфарматары, сукно, пафарбаванае такім спосабам, ніколі не ліняла.

Палатно для верхняга адзення ткалася з валокнаў ільну нізкай якасці. Ткалася яно, як і сукно, пераважна ў чатыры ніты. Сустракалася і двухнітовае, а ў некаторых месцах трох- і нават пяцінітовае. Палатно, прызначанае для верхняга адзення, не заўсёды адбельвалася. Бялілі яго ў тых выпадках, калі трэба было фарбаваць. Фарбавалі ў розныя колеры пры дапамозе кары: альховай, івавай, дубовай і інш.

Для вырабу верхняга адзення ў значнай ступені выкарыстоўваліся і аўчыны, якія ў канцы XIX — пачатку XX ст. у асноўным адбельваліся. Займаліся гэтым спецыяльныя майстры — аўчыннікі [7]. Але працэс адбельвання аўчын не вельмі складаны, і ў радзе выпадкаў гэта рабілася ў хатніх умовах. Для адбельвання аўчын ужывалі жытнюю муку (часам дабаўлялі аўсяную) [8], мел, соль. На вымачаную і ачышчаную ад мязгі аўчыну наносілі слой заваранага прэснага цеста, пасля чаго складвалі аўчыну воўнай наверх і клалі ў ваду на некалькі дзён (старыя аўчыны трымалі да двух тыдняў). Калі аўчына адкісне (тады воўна злёгку вырываецца), яе вымалі з вады і не вельмі вострай прыладай ачышчалі ад цеста. З гэтай мэтай часцей за ўсё ўжывалі старую касу, а ў некаторых месцах (на Брэстчыне) рабілі спецыяльныя драўляныя прылады з металічнай, не вельмі вострай пласцінкай — «клюкі». Такі спосаб адбельвання аўчын быў вядомы на ўсёй тэрыторыі Беларусі, але з некаторымі адрозненнямі. Так, на Магілёўшчыне аўчыну клалі ў кісла-салёны мучны «квас» дзён на 3—5 [9]. У радзе месц Мінскай і Магілёўскай губерняў (Мазырскі, Бабруйскі паветы і інш.) ужывалі яшчэ мел: вымачаную аўчыну некалькі разоў націралі мелам і ачышчалі касой. Прычым гэты працэс паўтараўся, пакуль аўчына не рабілася зусім белай. Але так старанна адбельвалі аўчыны для святочнага адзення (асабліва жаночага). Звычайна ж аўчыны толькі вымочвалі, і яны мелі жоўты колер.

У беларусаў у канцы XIX ст. побач з адбельваннем было вядома і дубленне аўчын. Гэты спосаб даволі прымітыўны. Настойвалі дубовую, яловую, часам лазовую кару (у залежнасці ад пажаданага колеру); калі вада рабілася цёмнай, туды на суткі ці больш клалі аўчыны. Аднак шырокага распаўсюджання ў гэты перыяд дубленне аўчын не мела. Напрыклад, на Магілёўшчыне, як адзначае А. Дэмбавецкі, дубілі аўчыны толькі ў Гомельскім павеце [10].

У адрозненне ад плечавога жаночага і мужчынскага адзення, якое шылі ўручную самі жанчыны, верхняе адзенне шылася толькі спецыяльнымі краўцамі і звычайна без папярэдняй прымеркі. Асноўныя элементы крою як мужчынскага, так і жаночага верхняга адзення беларусаў у большасці выпадкаў былі аднолькавымі. Адрозненні заключаліся ў асобных дэталях неканструктыўнага характару (даўжыня, упрыгожанні). Жаночае верхняе адзенне ў радзе выпадкаў шылася даўжэйшым і больш упрыгожвалася.

Верхняе адзенне ўсіх тыпаў было расхінным і зашпільвалася на гаплікі або драўляныя, абшытыя сукном гузікі, а часта світа або кажух толькі падпяразваліся поясам. Верхняе адзенне шылася, як правіла, без падкладкі. Для ўсіх тыпаў быў характэрны адкладны каўнер, радзей нізкі стаячы. Апошні ў канцы XIX — пачатку XX ст. часцей сустракаўся на поўдні Беларусі. Рукавы былі ўстаўнымі і ўшываліся на ўзроўні пляча, а ў некаторых выпадках — на некалькі сантыметраў ніжэй пляча. Тлумачылася гэта меркаваннямі эканоміі: мясцовыя краўцы выкарыстоўвалі цэлы матэрыял, не рэзалі яго. Спінка, пярэдняе крыссе і проймы для рукавоў не выкройваліся, а проста сшываліся на плячах па ўсёй шырыні сукна, а потым ушываўся рукаў. І тое, наколькі ніжэй пляча ўшываўся рукаў, залежала ад шырыні сукна. Ад шырыні сукна залежала і яшчэ адна асаблівасць, якая, на наш погляд, заслугоўвае ўвагі. Звязана яна з тым, якім было верхняе адзенне беларусаў — двухбортным ці аднабортным.

Да гэтага часу лічылася, што верхняе народнае адзенне беларусаў XIX — пачатку XX ст. было двухбортным і пры любым крoі адно крысо глыбока заходзіла за другое. Але гэта не зусім так. І тое, наколькі адно крысо заходзіла за другое, не залежала ад крою. Даныя сведчаць, што адзенне аднаго і таго ж крою шылася

[7] М. Я. Грынблат. Сялянскія промыслы і рамёствы ў Беларусі. «Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук», 1957, № 2, стар. 57.

[8] А. С. Дембовецкий. Опыт описания Могилевской губернии, кн. 2. Могилев, 1884, стар. 307.

[9] А. С. Дембовецкий. Опыт описания Могилевской губернии, кн. 2, стар. 306.

[10] Там жа, стар. 307.

як двухбортным, так і аднабортным. Калі сукно было шырокім, то крыссе мела вялікі заход, а калі вузкім, яно амаль не сыходзілася.

У залежнасці ад крою на тэрыторыі Беларусі к XIX — пачатку XX ст. можна вылучыць некалькі тыпаў верхняга адзення. Асноўным і самым пашыраным было суконнае адзенне тыпу «світа» прамога халатападобнага крою, пры якім вельмі эканомна расходаваўся матэрыял. У адзенні дадзенага тыпу спінка і крыссе былі прамымі, нідзе не звужаліся. Па баках для шырыні ўстаўляліся кліны. Рукавы прамыя. Каўнер часцей адкладны. Хоць адзенне прамога крою і было найбольш пашыраным, пераважала яно ў паўночнай Беларусі (Віленская, Віцебская, паўночная частка Мінскай губерняў) (карта 15). Гэты тып верхняга адзення вядомы ў заходніх і ўсходніх славян.

У паўднёва-ўсходніх і заходніх раёнах суконнае адзенне па крою было больш разнастайным. Тут побач са світай прамога крою была распаўсюджана світа з «вусам» (рыс. 15). Крой яе заключаўся ў наступным: спінка суцэльная, крыссе гладкае, у бакавыя швы ад лініі таліі ўстаўляліся трохвугольныя кліны-«вусы». Гэты тып адзення меў і некаторыя лакальныя асаблівасці. Так, у Магілёўскай і паўднёвых раёнах Мінскай губерні світа з «вусам» шылася ў талію, бакавыя кліны былі даволі шырокія і збіраліся ў зборкі. Для такой світы быў характэрны нізкі стаячы каўнер, зашпільвалася яна толькі на гаплікі. У паўднёва-заходнім Палессі світа такога тыпу шылася з прамой або завужанай у таліі спінкай. Каўнер адкладны, бакавыя кліны нешырокія, гладкія. У большасці выпадкаў світа не зашпільвалася, а толькі падпяразвалася поясам. Крой світы з «вусам» у канцы XIX — пачатку XX ст. быў распаўсюджан на тэрыторыі Палесся (карта 15). Аднак можна гаварыць, што дадзены тып верхняга адзення быў вядомы і ў паўночна-ўсходніх раёнах Беларусі, але там ён знік раней, і ў канцы XIX ст. світу «з вельмі вялікімі крыламі» там ужо не насілі [11].

На Палессі такая світа сустракалася яшчэ ў 20—30-я гады XX ст. Світа такога крою, апрача беларусаў, была вядома ў палякаў [12], балгар [13], украінцаў [14].




Рыс. 15. Тыпы верхняга суконнага адзення тыпу «світа»:
*а* — з «вусам», в. Завашчага Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл.; *б* — з падразнымі бачкамі, в. Бродніца Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл.; *в* — з адразной спінкай у зборку, в. Даманавічы Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.; *г* — з «фалдамі», Гомельскі п. Магілёўскай губ.

Менш распаўсюджана на тэрыторыі Беларусі была суконная світа з адразной спінкай па лініі таліі ў зборку. Перад складаўся з дзвюх суцэльных полак, спінка — з адной і на лініі таліі адразалася. Ніжняя частка спінкі складалася з дзвюх і больш полак (у залежнасці ад шырыні сукна), збіралася ў зборкі і прышывалася да верхняй, адразной часткі. Зашпільвалася такая світа звычайна на гаплікі. Для гэтага тыпу адзення больш характэрны невысокі стаячы каўнер. Асноўныя раёны бытавання — Магілёўская губерня і паўднёвыя паветы Мінскай (Мазырскі, Рэчыцкі і інш.). На астатняй тэрыторыі Беларусі світа ў зборкі сустракалася вельмі рэдка і адзначана намі ў некаторых паветах Гродзенскай губерні [15]. У XIX і пачатку XX ст. такі тып верхняга адзення, апрача беларусаў, быў вядомы літоўцам [16], рускім [17], украінцам [18].

У Мазырскім, Ігуменскім і Бабруйскім паветах Мінскай губерні лакалізаваўся крой світы з фалдамі (карта 15). Світа такога тыпу

[11] Архіў Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі, адз. зах. 40; гл. таксама: К. Т. Аникиевич. Сенненский уезд. Могилев, 1907, стар. 107.

[12] «Wisła», t. XVIII. Warszawa, 1904, стар. 449.

[13] М. Г. Велева, Е. И. Лепавцова. Народная одежда болгар в северной Болгарии в XIX и начале XX вв. София, 1961, мал. 25, 33б, 35а.

[14] Народы Европейской части СССР, ч. 1. М., 1964, стар. 666.

[15] Архіў ІМЭФ, ф. 6, воп. 11, спр. 120, л. 3.

[16] М. Мастоните. Литовская народная одежда в XIX — начале XX в. Вильнюс, 1967, стар. 18.

[17] Русские. Историко-этнографический атлас. М., 1967, стар. 244.

[18] Народы Европейской части СССР, ч. 1, стар. 666.




Карта 15. Тыпы верхняга суконнага адзення тыпу «світа» (канец XIX—пачатак XX ст.):

*1* — прамы, *2* — з бакавымі клінамі — «вусамі»; *3* — з адразной спінкай у зборкі; *4* — з фалдамі; *5* — з падразнымі бачкамі (*а* — пераважае, *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

шылася звычайна з больш шырокага сукна. Пярэдняе крыссе было суцэльным. Спінка фігурная, неадразная, звужаная ў таліі; на спіне па баках ад пройм рукавоў зашываліся глыбокія вытачкі, якія ніжэй таліі ўтваралі ўнутраныя складкі — «фалды», «фанды». (У некаторых месцах Беларусі фалдамі называлі звычайныя зборкі). Каўнер быў стаячым. Зашпільвалася на гаплікі. Па крою яна аднатыпна з украінскай світай з «фандамі», якая ў адрозненне ад беларускай мела не дзве складкі, а некалькі.

На поўдні Беларусі, а таксама ў радзе паветаў Магілёўскай губерні была вядома яшчэ світа з падразнымі бачкамі (карта 15). Пярэдняя частка яе, як і ва ўсіх тыпах світ, складалася з дзвюх суцэльных полак. Спінка ж на лініі таліі з бакоў падразалася, а ў цэнтры прыкладна на 9—12 см заставалася неадразной. Падразныя бачкі ледзь-ледзь прызборваліся і прышываліся да верхняй часткі. Пашытая такім чынам світа шчыльна аблягала фігуру і мела даволі прыемны знешні выгляд. Світа з падразнымі бачкамі была распаўсюджана на Украіне, а таксама ў Польшчы (на Падляшшы) [19].

На тэрыторыі Беларусі сярэдзіны XIX ст. найбольш распаўсюджаным было верхняе адзенне з сукна шэрага і белага колераў. Белы колер пераважаў у паўднёвых паветах Мінскай губерні, захопліваў Магілёўскую і ўсходнія

[19] Janusz Swiezy. Strój podlaski. Wrosław, 1958, стар. 13.




Карта 16. Колер верхняга адзення тыпу «світа» (канец XIX — пачатак XX ст.):
*1* — белы; *2* — шэры; *3* — чорны; *4* — карычневы; *5* — сіні (*а* — пераважае; *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

раёны Віцебскай губерні і пашыраўся далей за межы Беларусі: Смаленскую, Пскоўскую губерні, часткова Калужскую[20]. Шэры ж найбольш характэрны для паўночна-заходняй Беларусі. Нягледзячы на тое што перавага шэрага або белага колеру ў верхнім адзенні насельніцтва залежала ў асноўным ад таго, якую пароду авечак яно разводзіла, усё ж колер адзення стаў у нейкай ступені этнаграфічнай асаблівасцю. Так, верхняе адзенне чорнага колеру ў сярэдзіне XIX ст. у беларусаў амаль не сустракалася. Паяўленне яго прыпадае на больш познія часы. Так, у палякаў, як адзначае Л. Галэмбёўскі, чорны колер увайшоў у моду з другой палавіны XVII ст. і доўгі час пераважаў сярод шляхты[21]. У беларусаў жа яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. верхняе адзенне чорнага колеру таксама належала пераважна шляхце. На Віцебшчыне бытаваў нават такі жарт, нібы «чорная сярмяга падаравана толькі шляхце. Мужык можа наблізіцца да гэтага колеру, але не павінен насіць яе»[22]. Гэта з'ява знайшла сваё адлюстраванне і ў фальклоры. У адной вясельнай песні гаворыцца аб тым, што дзяўчына-нявеста адхіляе шляхту ў «чорных чарнінах» і кахае свайго «чалядзіначку» ў «белай сярмяжцы»[23].

[20] Русские. Историко-этнографический атлас, стар. 241.

[21] L. Golębjowski. Ubjory w Polske. Kraków, 1861, стар. 99—100.

[22] Н. Я. Никифоровский. Очерки житья-бытья в Витебской Белоруссии. Витебск, 1895, стар. XXII.

[23] М. Я. Гринблат. Белорусы. Минск, 1965, стар. 244.

Аднак ужо ў канцы XIX — пачатку XX ст. верхняе адзенне чорнага колеру шырока бытуе і ў асяроддзі сялян (карта 16). Як адзначаў П. В. Шэйн, «зараз ужо нельга ўбачыць белай сцяны, якая ўтваралася насовамі, белымі хусткамі, наміткамі, белымі шубамі, белымі сярмягамі. Цяпер гэта сцяна робіцца стракатаю, пялёсаю, і ў ёй толькі мільгае, а не пераважае белае адзенне»[24]. І сапраўды, межы пашырэння белага адзення значна скараціліся. Нават на Магілёўшчыне, як паказалі нашы даследаванні, белы колер пераважаў у гэты час толькі ў Быхаўскім і Рагачоўскім паветах. На ўсёй тэрыторыі Беларусі распаўсюджана верхняе адзенне розных колераў — чорнага, карычневага, шэрага, сіняга. Шэры колер па-ранейшаму пераважаў у паўночна-заходняй Беларусі, карычневы сустракаўся ў паўднёвых раёнах. Сіні адзначан у месцах, пагранічных з Расіяй, дзе адзенне з сіняга хатняга або фабрычнага сукна было вельмі распаўсюджаным (карта 16)[25].

Назвы верхняга суконнага адзення тыпу «світа» даволі разнастайныя. Самай пашыранай на ўсёй тэрыторыі Беларусі была агульнаславянская назва «світа». Але побач з гэтым у беларусаў былі вядомы і іншыя тэрміны. У паўночных раёнах Магілёўскай, у Віцебскай, Віленскай і радзе паветаў Гродзенскай губерні бытавала старажытнаруская назва «сярмяга». Тэрмін гэты на захадзе пашыраўся за межы Беларусі ў Літву[26] і Польшчу[27]. На поўначы і паўночным усходзе быў распаўсюджан тэрмін «армяк», бытаванне якога Л. Малчанава звязвае з рассяленнем старавераў на тэрыторыі Беларусі[28]. На захадзе Мінскай губерні верхняе адзенне даволі часта называлася «халат», у радзе паветаў Гродзенскай губерні — «бурнос». Тэрмін гэты сустракаецца і ў раёнах Букавіны — «бурнус»[29]. У паўднёва-заходнім Палессі шырока бытавала назва «латуха». Менш пашыраны былі тэрміны «сукман», «жупан», «кунтуш». Апошнія дзве назвы запазычаны ў палякаў і на Беларусі пашыраліся сярод шляхты. Гэта ў асноўным тэрміны, якія не абумоўлены ні кроем, ні яго дэталямі. Але, як паказалі нашы даследаванні, у беларусаў сустракаюцца і такія назвы («казачына», «чуйка», «світа з вусам» і інш.), якія звязаны якраз з кроем верхняга адзення ці асобнымі яго часткамі. Так, напрыклад, казачынай у беларусаў называлі адзенне толькі адразное па таліі ў зборку. Тэрмін гэты, відаць, паходзіць ад рускага «казакин» і распаўсюджваўся ў асноўным на ўсходзе. Суконная світа з вялікім адкладным каўняром называлася «чуйка», «чухмень» (руск. чекмень). Назва гэта сустракаецца на поўдні Беларусі. Бакавыя кліны — «вусы» абумовілі і назву — «світа з вусам» (паўднёва-ўсходнія раёны Палесся).

Багаццем упрыгожанняў верхняе адзенне не вылучаецца. Асабліва гэта трэба аднесці да паўночных і паўночна-заходніх раёнаў Беларусі, дзе верхняе адзенне, таксама як і жаночы і мужчынскі асноўныя комплексы наогул, упрыгожвалася мала. Увогуле ўпрыгожанні ў суконным верхнім адзенні і месца іх размяшчэння ў значнай ступені былі абумоўлены кроем. Сціпласцю ўпрыгожанняў вылучалася суконнае адзенне прамога халатападобнага крою. Звычайна правае крысо, ніз рукавоў, каўнер, кішэні абшываліся паскамі чорнага, сіняга або белага сукна. Зрэдку сукно замянялася скурай[30].

Найбольш багата і арыгінальна ўпрыгожвалася верхняе адзенне на Палессі, дзе была вядома світа з «вусам». У ёй упрыгожваліся не толькі каўнер, ніз рукавоў, крыссе, а абавязкова абшываліся і бакавыя кліны. Для паўднёва-заходніх раёнаў Палесся характэрна ўпрыгожанне шнурком, звітым з рознакаляровых суконных нітак, якім абшываліся каўнер, правае крысо, ніз рукавоў і бакавыя кліны, якія яшчэ ўпрыгожваліся кутасамі (дадатак, XXVIII, *а*, *б*). Але ў некаторых цэнтральных раёнах Палесся адзенне такога тыпу часта не ўпрыгожвалася зусім. Адзінай аздобай у такіх выпадках служыў каляровы пояс. Больш багата і заўсёды ўпрыгожвалася світа «з вусам» ва ўсходняй частцы Палесся. Яна вышывалася паскам тонкага купленага сукна (1,5—2 см шырынёй), якія тут звычайна называліся жычкамі, на поўначы Магілёўскай губерні (Сенненскі, Аршанскі паветы) — ірхамі. Для ўпрыгожанняў світы часцей за ўсё ўжываліся шнуркі сіняга, чорнага колераў. Пазней, у 20—30-я гады XX ст., у жаночай світе паміж чорнымі і сінімі шнуркамі нашываўся яшчэ чырвоны, а ў радзе месц (Рэчыцкі, Мазырскі, Бабруйскі паветы) і зялёны.

У канцы XIX — пачатку XX ст., апрача доўгага, у беларусаў шырока бытавала і кароткае верхняе адзенне, якое трэба лічыць больш позняга паходжання, бо матэрыялы, па якіх можна

[24] П. В. Шейн. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 3. СПб, 1902, стар. 53.

[25] Русские. Историко-этнографический атлас, стар. 241.

[26] М. Мастоните. Литовская народная одежда..., стар. 18.

[27] L. Gołębjowski. Ubjory w Polske, стар. 482.

[28] Л. А. Молчанова. Материальная культура белорусов. Минск, 1968, стар. 152.

[29] Народы Европейской части СССР, ч. 1, стар. 672.

[30] П. В. Шейн. Материалы для быта и языка..., стар. 43.




Карта 17. Тыпы кароткага верхняга адзення з рукавамі (канец XIX — пачатак XX ст.).

Прамога крою: *1* — з сукна; *2* — з палатна; *3* — з фабрычных матэрыялаў. У талію: *4* — з сукна; *5* — з палатна; *6* — з фабрычнага матэрыялу (*а* — пераважае; *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

было б меркаваць аб існаванні такога адзення раней XIX ст., намі пакуль што не выяўлены.

Верхняе кароткае адзенне з рукавамі ў аднолькавай меры насілі мужчыны і жанчыны ўсіх сацыяльных слаёў. Шылася яно пераважна з сукна, радзей з палатна і ў некаторых выпадках з фабрычных матэрыялаў (карта 17). У беларусаў (асабліва ў паўночных раёнах) шырока бытавала яшчэ цёплае кароткае адзенне. Для яго часцей за ўсё ўжывалі кудзелю і ў рэдкіх выпадках вату.

Па крою кароткае верхняе адзенне амаль нічым не адрознівалася ад світы. Але межы пашырэння асобных тыпаў яго не заўсёды супадалі з межамі існавання доўгага. Так, напрыклад, кароткае адзенне адразное па таліі ў зборкі пашыралася не толькі на паўднёвым усходзе, а было вядома і ў радзе паветаў Гродзенскай, Віленскай і Віцебскай губерняў, але разам з тым мела і некаторыя лакальныя адрозненні. Так, на поўдні Мінскай губерні (Слуцкі, Мазырскі паветы) і на Магілёўшчыне (Быхаўскі, Бабруйскі паветы) назіралася большая ўстойлівасць традыцыйных элементаў. Для гэтых месц характэрна казачынка з нізкім стаячым каўняром, якая зашпільвалася толькі на гаплікі. На захадзе і поўначы Беларусі (Гродзенскі, Лідскі, Ашмянскі, Полацкі, Дзісенскі паветы) адзенне такога крою шылася толькі з адкладным каўняром, зашпільвалася на гузікі. Крой кароткай світкі ў талію з падразнымі бачкамі і ўстаўнымі клінамі лакалізаваўся ў Пінскім, Слуцкім паветах Мінскай губерні, а таксама на Магілёўшчыне (Рагачоўскі, Клімавіцкі паветы).

У першыя гады XX ст. на вёсцы шырокае распаўсюджанне атрымлівае кароткае адзенне прамога крою, якое зашпільвалася толькі на гузікі, з адкладным каўняром, праразнымі бакавымі кішэнямі (рыс. 16). Кароткае адзенне, і мужчынскае, і жаночае, мела назвы «куртка», «курцік», «каптанік», «світка», «латушка», «сярмяжка», «армячок», «казачынка» і інш. Побач з імі былі вядомы назвы, якія датычыліся толькі мужчынскага кароткага адзення: «пінжак», «кулёк», «кусёк» або толькі жаночага — «сачык», «сачок» і інш. Яны былі вядомы на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Вузкалакальнае пашырэнне мелі назвы, запазычаныя ад суседніх народаў. Так, для ўсходняй часткі Беларусі былі характэрны рускія — «паддзеўка», «паддзёўка» (мужчынскае адзенне). У раёнах, пагранічных з Польшчай, вядома назва «марынарка», на мяжы з Украінай побач з іншымі — «сардачок». Усё гэта кароткае верхняе адзенне розных тыпаў.

Для беларусаў, як і для іншых народаў, было характэрна і верхняе адзенне з аўчын — кажух. У другой палавіне XIX ст. на тэрыторыі Беларусі шырока бытуе нядублены кажух з белых аўчын. Аднак пачынаючы з канца XIX ст. шырокае распаўсюджанне набывае дублены кажух, які паступова выцясняе белы. У першую чаргу гэта адносіцца да поўначы Беларусі. У паўднёвай жа частцы яшчэ доўгі час пераважалі белыя нядубленыя кажухі, якія захаваліся нават да 30-х гадоў нашага стагоддзя.




Рыс. 16. Кароткае верхняе адзенне з рукавамі:

*а* — сачок, в. Кляўіца Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл.; *б* — пінжак, в. Навасёлкі Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.; *в* — сярмяжка, Пружанскі п. Гродзенскай губ.; *г* — куртка, Бабруйскі п. Мінскай губ.

Крой кажухоў у асноўным супадае з кроем суконнага верхняга адзення. На ўсёй тэрыторыі Беларусі самым пашыраным быў кажух прамога крою. Мясцовыя адрозненні заключаліся ў асобных дэталях: у форме і памеры каўняра, спосабу зашпільвання і інш. На Палессі, асабліва ва ўсходніх яго раёнах, бытаваў кажух з «вусам», але ў параўнанні са світай такога ж тыпу быў менш распаўсюджан. Насілі яго часцей жанчыны. Рабіўся ён звычайна белым і абавязкова ўпрыгожваўся. Для гэтага бралі кавалак тонкай аўчыны (без воўны) адпаведнага памеру, старанна выпрацоўвалі і адбельвалі. У ім на аднолькавай адлегласці (прыкладна 1,5—2 см) праразалі адтуліны, у якія працягвалі шнуркі, а пасля ўжо нашывалі на кажух. Крой кажуха ў талію з адразной спінкай і зборкамі шырока бытаваў у Магілёўскай, паўднёвых і цэнтральных паветах Мінскай і менш у Гродзенскай губерні. (Такі тып намі зафіксаван толькі ў Кобрынскім павеце).

Самая пашыраная назва гэтага віду верхняга адзення — «кажух». На ўсходзе Віцебскай і Магілёўскай губерняў яго называлі шубай. Шубай называлі таксама кажух, пацягнуты зверху сукном. Такія кажухі насіла ў асноўным шляхта. Доўгі да пят кажух прамога крою з шырокім каўняром называўся тулупам. Служыў ён дарожным адзеннем і быў характэрны для Магілёўскай губерні. Лакальнае пашырэнне мела назва «казачына» (поўдзень Магілёўскай і Мінскай губерняў, зрэдку ў Мінскім павеце) (дадатак, XXX, *в*, *г*).

У канцы XIX — пачатку XX ст. шырокае распаўсюджанне набывае кароткі кажух — кажушак, паўшубак часцей прамога крою.

У параўнанні з суконным і футравым менш распаўсюджана ў беларусаў было верхняе адзенне з палатна — насоў, балахон, летнік, касталан. Раёны найбольш шырокага бытавання — поўнач Беларусі. На поўдні палатнянае верхняе адзенне сустракалася радзей.

Колер, а таксама крой палатнянага адзення беларусаў канца XIX — пачатку XX ст. у параўнанні з суконным былі менш разнастайнымі. Насоў — вельмі часта ён называўся «балахон», а на поўначы Віцебскай губерні — «шарапан» — шыўся са зрэбнага неадбеленага чатырохнітовага палатна, пафарбаванага часам у сіні або карычневы колер. Быў ён расхінным, з прамой спінкай і адкладным каўняром (найбольшае распаўсюджанне меў на тэрыторыі Віцебшчыны). Такі балахон быў пашыран і на поўначы Ра-




Карта 18. Тыпы кажухоў (канец XIX — пачатак XX ст.):
*1* — прамы; *2* — у талію (*а* — пераважае, *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

сіі [31]. У радзе месц Віленскай, на поўначы Гродзенскай і Мінскай губерняў бытаваў насоў, які быў самастойным адзеннем і надзяваўся звычайна ўвосень або летам у халаднаватыя дні. Спінка ў ім была прамая, часам з хлясцікам, зашпільваўся толькі на гузікі, даўжыня крыху ніжэй кален, але вельмі часта ён шыўся і больш кароткім.

Палатнянае верхняе адзенне ў талію не мела шырокага распаўсюджання. У асобных выпадках адзначана ў Дзісенскім, Ігуменскім, Аршанскім, Віленскім паветах і на поўдні ў Мазырскім павеце (тут яно называлася «белячок»). Насілі такое адзенне больш мужчыны. У некаторых месцах (Магілёўская, Віцебская, Мінская губерні) такі насоў і белыя палатняныя штаны служылі святочным мужчынскім адзеннем. На ўсходзе Віцебскай губерні М. Я. Нікіфароўскі адзначае бытаванне палатнянага насова «ў талію з клінамі па баках, нізкім стаячым каўняром, зашпільваўся на тры гузікі, пярэдняе крыссе з накладнымі карманамі, шыўся даўжынёю да кален» [32].

Такія насовы шыліся з адбеленага палатна, вытканага часта ў два ніты. На нашу думку, з'яўленне палатнянага насова як самастойнага адзення — вынік трансфармацыі крою нерасхіннага, так званага «глухога» насова, які быў вядомы на Віцебшчыне і адзначаецца ў матэрыя-

[31] Русские. Историко-этнографический атлас, стар. 246.

[32] Н. Я. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья..., стар. 110.

лах XIX ст. Так, Д. Зяленін піша, што ў «сялян непадалёку ад Суража жанчыны летам надзяваюць на сарочку панёву (круглякі, насоўкі), пашытыя кроем мяшка з разрэзам толькі ля каўняра» [33]. Бытаваў нерасхінны насоў і ў Ашмянскім раёне. Тут яшчэ памятаюць насоў з адкладным каўняром з разрэзам на грудзях да пояса [34]. У Ноўгарадскай, Пскоўскай, Смаленскай і іншых губернях Расіі назвы «насоў» і «касталан» ужываліся для нагруднага туніка-падобнага адзення з рукавамі, якое, на думку даследчыкаў [35], з'явілася прататыпам «глухога» сарафана.

Апрача рускіх і беларусаў, палатнянае верхняе адзенне вядома таксама ў эстонцаў [36] і палякаў (plótnjanska, parcijanka) [37].

Плашчападобнае адзенне без рукавоў у канцы XIX — пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі не насілі. Аднак у матэрыялах першай паловы XVI ст. пры апісанні мужчынскага адзення заможных слаёў насельніцтва адзначаецца «епанча чорная» і тлумачыцца як шырокі доўгі плашч без рукавоў. Пры апісанні простага адзення народа таксама ўпамінаецца суконны плашч — «сукман» [38].

Як паказваюць шматлікія літаратурныя і архіўныя крыніцы сярэдзіны XIX ст., беларускі селянін у зімовы час на кажух звычайна надзяваў суконную світу (сярмягу, латуху і г. д.). На поўначы Беларусі дадатковым адзеннем служыў палатняны балахон. Шыўся ён вельмі шырокім. Спінка, крыссе і бакавыя кліны ў аб'ёме складалі 2,5 м. Такі балахон зашпільваўся толькі на адзін гузік зверху або завязваўся пад шыяй на шнурок, меў вялікі каўнер, пазней да яго сталі прышываць башлык.

У канцы XIX і асабліва ў пачатку XX ст. было значна пашырана суконнае адзенне прамога крою з адкладным каўняром, зашпільвалася на гузікі. Гэта адзенне часта замяняла плашч. У паўднёва-заходняй Беларусі адзенне такога тыпу мела назву «бурка». Яна шылася абавязкова з башлыком і хлясцікам (дадатак, XXIX, *в*, *г*). Башлык даволі часта прышываўся і да армяка (Віцебшчына) і да бурноса (Гродзеншчына).

Вывучэнне верхняга адзення канца XIX — пачатку XX ст. паказала, што найбольш характэрным для беларускага сялянства з'яўляецца верхняе адзенне прамога крою. Яно было пашырана на ўсёй тэрыторыі Беларусі, але пераважала ў паўночнай яе частцы (Віцебская, Віленская, поўнач Мінскай губерні). На тэрыторыі Палесся бытавала верхняе адзенне з «вусам». У радзе месц Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай губерняў было вядома адразное па таліі адзенне ў зборкі. На поўдні Беларусі і ў некаторых паветах Магілёўскай губерні была вядома світа з падразнымі бачкамі і ўстаўнымі клінамі.

У верхнім традыцыйным адзенні беларусаў прасочваюцца рысы (крой, назва), агульныя для верхняга адзення рускіх, украінцаў, балгар, палякаў, а таксама іншых народаў (літоўцаў, эстонцаў), што гаворыць аб іх узаемасувязях.

Працэс пераходу ад традыцыйнага верхняга адзення з дамотканіны да адзення новага тыпу з фабрычных матэрыялаў, які пачынаецца ў канцы XIX ст., найбольшае развіццё набывае толькі ў гады Савецкай улады і поўнасцю завяршаецца ў пасляваенны час. Сёння традыцыйнае верхняе адзенне на тэрыторыі Беларусі — гэта ўжо этнаграфічныя рэлікты. Аб яго існаванні гавораць толькі некаторыя назвы, якія захаваліся да цяперашняга часу: світа, сярмяга, каптанік, паддзеўка, пінжак і інш.

## АБУТАК

Арганічнай часткай беларускага народнага касцюма з'яўляўся абутак.

Асноўным відам як летняга, так і зімовага абутку пераважнай большасці беларускіх сялян да Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі былі самаробныя плеценыя або скураныя лапці (рыс. 17). Са старажытных часоў лапці служылі абуткам усходніх і заходніх славян, балтаў, нярускіх народаў Сярэдняй Расіі.

Археалагічныя раскопкі ў горадзе Мінску і некаторых іншых гарадах рэспублікі паказалі, што сярод гарадскога насельніцтва плеценыя лапці не мелі шырокага бытавання [39]. Гэта пацвярджае думку, што лапці былі асноўным відам абутку толькі для сельскага насельніцтва.

[33] Д. К. Зеленин. Описание рукописей ученого архива императорского Русского географического общества, вып. 1. Пг., 1914, стар. 131—132.

[34] Архіў ІМЭФ, ф. 6, воп. 11, спр. 409, л. 8; спр. 412, л. 4.

[35] Русские. Историко-этнографический атлас, стар. 210.

[36] Народы Европейской части СССР, ч. 2. М., 1964, стар. 272.

[37] Tadeusz Seweryn. Strój krakowjaków wschodnich. Wrocław, 1960, стар. 50. Barbara Kaznowska-Jarecka. Strój biłgorajsko-tarnogrodzki. Wrocław, 1958, стар. 9.

[38] АВАК, т. XVII, 1890, стар. 57, 70.

[39] Э. М. Загорульский. Древний Минск. Минск, 1963, стар. 67.




Рыс. 17. Тыпы лапцей:

*а, б, в* — «глухія лапці» прамога пляцення з ліпавых лыкаў, в. Замошша Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.; *г* — скураны лапаць, в. Міёры Дзісенскага п. Віленскай губ.; *д* — «пахлапень» — лапаць касога пляцення з тонкіх, ачышчаных ад кары ліпавых лыкаў, Клімавіцкі п. Магілёўскай губ.

Лапці плялі звычайна са свежых, а зімой з размочаных у цёплай вадзе лыкаў ліпы, лазы, а таксама з кары вяза, вітушак пяньկі. На тэрыторыі Віцебскай губерні сустракаліся лапці і з бяросты. Дралі лыкі з тонкіх маладых пабегаў ліпы — «луцця», якія разразалі нажом уздоўж і здымалі кару. Загатаўлялі лыкі ў пачатку лета, калі кара яшчэ не прысохла да дрэва. Лыкі скручвалі ў круглыя матушкі і, нанізаўшы на повязь, вешалі ў клеці або на гарышчы хаты. У кожнай сям'і ў любую пару года быў даволі значны запас гатовых лапцей або лыкаў [40].

[40] Н. Я. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья..., стар. 122.

Па тэхніцы вырабу лапці прынята падзяляць на два асноўныя тыпы: прамога і касога пляцення [41]. Для беларусаў былі характэрны лапці з падэшвай прамога пляцення.

На ўсёй тэрыторыі Беларусі бытавалі розныя тыпы лапцей прамога пляцення. Раён распаўсюджання лапцей касога пляцення ахопліваў усходнія паветы Віцебскай (Віцебскі, Суражскі, Полацкі) і Магілёўскай (Аршанскі, Горацкі, Мсціслаўскі, Клімавіцкі, Чэрыкаўскі, Быхаўскі

[41] Д. К. Зеленин. Перспективный план по изучению генетики культуры. «Краеведение», 1928, № 5, стар. 262—263; Русские. Историко-этнографический атлас, стар. 2.

і Магілёўскі) губерняў. Трэба адзначыць, што лапці касога пляцення былі святочным абуткам беларускага селяніна і заўсёды суіснавалі з лапцямі прамога пляцення. Як указвалі многія даследчыкі [42], апошнія былі запазычаны ў рускіх. Лапці касога пляцення спарадычна сустракаліся таксама на поўначы Гродзенскай губерні і ў заходняй Міншчыне, што, на думку Л. Малчанавай, таксама звязана з рассяленнем тут рускіх старавераў [43].

Лапці як ні адзін іншы кампанент адзення мелі самыя розныя назвы. Адны з гэтых тэрмінаў, як напрыклад «лапці», бытавалі амаль паўсюдна ў Беларусі, іншыя («пасталы», «лазовікі») — на значнай яе частцы, а некаторыя мелі вузкалакальнае, нязначнае распаўсюджанне («кавярзні», «пахрасні», «вязнікі», «куратнікі», «крыставікі», «бяспятнікі», «ракі», «лыкі» і г. д.). Нярэдка назва лапцей абумоўлівалася іх знешняй формай, спосабам вырабу, матэрыялам.

Прасцейшыя лапці прамога пляцення — «шчарбакі» («шчарбачні», «бяспятнікі»). Гэта неглыбокія, лёгкія (амаль адна падэшва) лапці без галовак і запятак. Замест вушак у іх спераду былі дзве лыкавыя пятлі і па баках сплеценыя з лыкаў «заборнікі», за якія прымацоўваліся аборы. Разам з іншымі тыпамі лапцей шчарбакі бытавалі на тэрыторыі Віцебскай губерні і ў Сенненскім і Горацкім паветах Магілёўскай губерні. Такія лапці лічыліся летнімі і прызначаліся для палявых работ і нашэння ў хатніх умовах. З той жа мэтай выкарыстоўваліся і «лазовікі», якія пляліся з даволі шырокіх палосак лазовай кары з кароткімі галоўкамі. Поруч з іншымі тыпамі лапцей лазовікі сустракаліся на большай частцы тэрыторыі Беларусі.

Лапці з больш глыбокімі насамі, якія мелі вялікую пярэднюю страку для прадзявання абор, называлі «глухімі лапцямі», «слепакамі», «куратнікамі», «кавярзнямі». У Беларусі такія лапці мелі найбольш шырокае распаўсюджанне.

На Палессі і ў прылягаючых да гэтай вобласці паветах Гродзенскай і Мінскай губерняў бытавалі ліпавыя або лазовыя «зрачыя» лапці. Адметнай асаблівасцю «зрачых» лапцей быў кароткі, з адкрытым верхам насок. Адсутнасць пярэдняга вялікага вушка («стракі») для прадзявання абор і стварала «вока» лапця.

Лапці прамога пляцення ўсіх відаў (акрамя шчарбакоў, якія пачыналі плесці з пяты) плялі з наска, надзяваючы бакавыя вушкі лапця — «курцы», «куракі», «вушкі» — на дзве завостраныя з аднаго канца палачкі — «сугакі».

Выраб лапцей быў простым і хуткім. За вечар селянін мог сплесці адну-дзве пары лапцей.

Для моцнасці падэшва лапцей амаль заўсёды падпляталася пры дапамозе спіцы («спічака») — плоскага з закругленым краем жалезнага або касцянога кручка. Матэрыялы для падплятання служылі лаза, лыкі, вітушкі пянькі. Значна радзей ніз лапцей падшываўся скурай.

Лапці касога пляцення — «пахлапні», «пахрасні» — былі з глыбокімі круглымі насамі, высокімі запяткамі і бакамі. Пляліся яны з вузкіх палосак лыка (не шырэй 1 см), з якіх спачатку здымалі кару. Палоскі ачышчаных лыкаў у пахлапнях шчыльна падганяліся адна да другой. Таму на іх выраб патрабавалася амаль у тры разы больш лыкаў, чым на звычайныя лапці прамога пляцення. Плялі пахлапні на драўлянай калодцы з круглым наском, якая рабілася па памеру нагі. Пры дапамозе той жа спіцы, якая ўжывалася пры падплятанні звычайных лапцей, падэшву пахлапнёў падпляталі вітушкамі пянькі або тонкімі вяровачкамі. Пахлапні з'яўляліся толькі святочным абуткам беларускіх сялян і часта насіліся па некалькі гадоў [44].

Паколькі выраб пахлапнёў быў намнога складаней, чым выраб простых лапцей, і патрабаваў спецыяльных ведаў і навыкаў, іх рабілі звычайна сяляне-рамеснікі і збывалі на кірмашах. Каштавалі пахлапні ў 5—10 разоў даражэй за звычайныя лапці [45].

Лапці надзявалі на анучы або, у вельмі рэдкіх выпадках, на самаробныя панчохі. На летнія анучы («парцянкі») выкарыстоўвалася звычайна старое белае палатно. На зімовыя анучы («суконкі») ішлі часцей за ўсё кавалкі са старога андарака ці кашулі. Часта паверх суконак заварочвалі белыя палатняныя анучы. У вялікія маразы ступню нагі, закручаную ў суконку, абкладвалі сенам або мяккай саломай, а затым абкручвалі анучай.

Да нагі лапці прымацоўваліся пры дапамозе пяньковых, лыкавых або раменных абор («аборак», «валок»). Аборы працягваліся («заварсваліся», «забарсваліся») праз вушкі лапця. Затым іх перакрыжоўвалі на пяце і працягвалі праз сярэднія вушкі з бакоў лапця, што ўтварала па баках пяты петлі. Абкручаная анучай ступня нагі зацягвалася гэтымі петлямі накрыж у пад'ёме. Пасля гэтага шчыльна абкручвалася

[42] Е. Р. Романов. Белорусский сборник, вып. 8. Вильно, 1912, стар. 25; А. С. Дембовецкий. Опыт описания Могилевской губернии..., кн. 2, стар. 374 і інш.

[43] Л. А. Молчанова. Материальная культура белорусов. Минск, 1968, стар. 177.

[44] Н. Я. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья..., стар. 123.

[45] А. С. Дембовецкий. Опыт описания Могилёвской губернии..., кн. 2, стар. 374.

анучай голень нагі і замацоўвалася валокамі. Ва ўсходняй Беларусі мужчыны і жанчыны закручвалі аборы накрыж да калена. У паўднёвых і заходніх паветах Беларусі мужчыны закручвалі аборы такім жа чынам, але вельмі нізка — ледзь вышэй шчыкалаткі, а жанчыны — да калена. На Палессі вяровачныя аборы часта фарбавалі ў чорны колер, каб яны кантрастна выдзяляліся на белых палатняных анучах. У некаторых палескіх вёсках жанчыны так шчыльна закручвалі аборы віткамі вакол нагі да калена, што не было відаць ануч.

На Палессі бытаваў звычай абкручваць голені босых ног белымі палатнянымі анучамі — «завойкамі». Завойкі засцерагалі ногі ў час жніва ад калючага ржэўніку, а восенню ад халоднага ветру. Звычай абкручваць тканінай босыя ногі ад шчыкалаткі да калена мае, відаць, агульнаславянскую аснову, таму што бытаваў у гэты ж час і ў балгар [46].

Скураны абутак беларускага сялянства канца XIX — пачатку XX ст. можна падзяліць на тры асноўныя групы: боты, чаравікі і лапці. Боты (пераважна мужчынскі абутак) і жаночыя паўсапожкі (чаравікі) бытавалі на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Боты са старажытных часоў былі абуткам славянскіх народаў, і тэрмін «боты» сустракаецца ўжо ў дакументах XI ст.[47]

Як паказалі раскопкі старажытнага Полацка, шавецкае рамяство было развіта на Беларусі ў XI—XII стст.[48] Аднак з-за цяжкага матэрыяльнага становішча і звязанай з гэтым нізкай пакупной здольнасці боты і чаравікі былі недаступны асноўнай масе сялянскага насельніцтва. У канцы XIX — пачатку XX ст. звычайным было становішча, калі на ўсю вёску мелася некалькі пар ботаў, якія насілі толькі па святах. На вяселле або ў іншых асабліва ўрачыстых выпадках боты пазычаліся ў суседзяў.

Боты мелі некалькі назваў. Тэрмін «боты» быў найбольш характэрны для паўночнай і цэнтральнай Беларусі і значна радзей сустракаўся на поўдні. Назва «чобаты» найбольш шырока была распаўсюджана на Магілёўшчыне, Гродзеншчыне і ў паўднёвых паветах Мінскай губерні. У некаторых усходніх паветах Магілёўшчыны і Віцебшчыны разам з тэрмінамі

[46] М. Г. Велева, Е. И. Лепавцова. Народная одежда болгар в северной Болгарии в XIX и начале XX вв. София, 1961, стар. 17.

[47] И. И. Срезневский. Материалы для словаря древнерусского языка по письменным памятникам, т. III. СПб, 1903, стар. 261.

[48] Г. В. Штыхаў. Шавецкае рамяство старажытнага Полацка. «Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук», 1962, № 3, стар. 81—90.



Рыс. 18. Жаночыя чаравікі (в. Іванск Чашніцкага р-на Віцебскай вобл.)

«боты» і «чобаты» часта карысталіся рускім словам «сапагі».

Па тэхніцы вырабу боты былі «прышвыя» і «выцяжныя», прычым першыя мелі большае распаўсюджанне. «Выцежкі» («выцяжныя боты») атрымалі такую назву таму, што шыліся без перадоў («прышваў»). Халява ў «выцежках» плаўна пераходзіла ў перад і сшывалася ззаду. Шылі выцежкі наступным чынам. Скураную загатоўку халявы мачылі, а затым нацягвалі і замацоўвалі на «правіле» — тоўстай дошцы, якая мела форму загнутага полаза. Калі загатоўка высыхала, яе здымалі, сшывалі халяву і прышывалі да яе заднік. Халяву з заднікам нацягвалі на калодку («капыл») і прышывалі дратвай сцельку. Зверху сцелькі накладвалі падэшву і абцас, прыбіваючы іх драўлянымі цвікамі. Такія боты ў сялян лічыліся лепшымі, таму што менш прапускалі вільгаць. «Прышвыя боты», або проста «боты», па крою былі падобны да сучасных з прышыўнымі перадамі. Боты абодвух відаў звычайна былі чорнага або рыжага колеру, пераважна з рантам, на нізкіх прамых абцасах, з шырокімі круглымі насамі.

Звычайна боты куплялі ў лаўках бліжэйшага мястэчка або на кірмашах. Часта беларускія сяляне куплялі толькі скураныя загатоўкі і заказвалі боты вясковым шаўцам, якія займаліся гэтым рамяством у вольны час. Селянін вельмі беражліва адносіўся да абутку, і часта боты служылі яму ўсё жыццё і яшчэ не зусім зношанымі пераходзілі яго нашчадкам [49].

[49] Н. Я. Никифоровский. Очерки простонародного житья-бытья..., стар. 126.




Карта 19. Віды мужчынскага і жаночага абутку (канец XIX — пачатак XX ст.):
*1* — скураны; *2* — плецены; *3* — валены; *4* — з дрэва (*а* — пераважае, *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

Жаночыя чаравікі («чаравікі», «паўсапожкі», «баціінкі») уяўлялі сабою скураны абутак на высокіх або нізкіх абцасах (рыс. 18). Вышыня чаравікаў была рознай. Яны шыліся то кароткімі, ледзь прыкрываючымі шчыкалатку, то да палавіны галёнкі. Спераду або збоку чаравікі звычайна шнураваліся тонкімі раменьчыкамі, каляровымі шнуркамі [50] або зашпільваліся на гузікі, гаплікі. У пачатку XX ст. атрымалі пашырэнне чаравікі з рызінкамі па баках халяўкі. Трэба адзначыць, што ў канцы XIX — пачатку XX ст. чаравікі насілі толькі дзяўчаты і маладыя жанчыны. Больш пажылыя жанчыны звычайна насілі боты [51].

Скураныя лапці — самы старажытны від абутку [52] — не атрымалі, аднак, паўсюднага пашырэння на тэрыторыі Беларусі. У вывучаемы перыяд яны шырока бытавалі толькі ў Гродзенскай і Віленскай губернях, дзе ў радзе месц з'яўляліся асноўным відам сялянскага абутку. Побач з плеценымі скураныя лапці былі распаўсюджаны ў некаторых паветах Мінскай і Магілёўскай губерняў.

[50] А. Бульба. Колькі слоў аб дзявочай вопратцы на Беларусі. Вільна, 1911, стар. 11.

[51] Россия. Полное географическое описание нашего Отечества, т. 9. СПб, 1905, стар. 146.

[52] Г. Вейс. Внешний быт народов с древнейших до наших времен, т. 2. М., 1876, стар. 8.

Трэба адзначыць, што скураныя лапці былі шырока распаўсюджаны толькі ў тых месцах, дзе было мала лясоў або дзе рэдка сустракалася ліпа, лыкі з якой з'яўляліся асноўным матэрыялам для вырабу плеценых лапцей. Звычайна сырамятную скуру сяляне лічылі больш мэтазгодным выкарыстоўваць на конскую збрую і іншыя патрэбы гаспадаркі.

Разам з агульнапашыранай назвай «лапці» скураныя лапці ў Віцебскай губерні называліся «паршні» («баршні»), «пасталы», у Віленскай і Гродзенскай — «пасталы», «хадакі»; у Магілёўскай — «пасталы», «маршчакі», у Мінскай губерні — «пасталы», «хадакі», «маршчакі».

Скураныя лапці былі двух відаў. Адны рабіліся з кавалка скуры авальнай формы. Даўжыня і шырыня загатоўкі адпавядалі памеру ступні з прыпускам на бакі, заднік і галоўку, а па краях рабіліся дзірачкі для працягвання абор. Другія шыліся з прамавугольнага кавалка скуры. Галоўка ў такіх лапцях сшывалася па цэнтру, а па краях рабіліся дзірачкі для працягвання абор (рыс. 17 *г*).

На скураныя лапці часцей за ўсё ішла сырамятная скура ялаўкі або цяляці. У некаторых месцах Беларусі сырамяць выраблялі наступным чынам. Шкуру ачышчалі ад воласу і разразалі на палоскі. Палоскі замацоўвалі на слупах, змазвалі дзёгцем і доўгі час выкручвалі пры дапамозе кола. Пасля гэтага скуру скручвалі ў рулон, клалі на калоду і білі па ёй драўляным молатам («чапухай»)[53]. Часам скуру толькі трохі змякчалі, для чаго намазвалі кіслым цестам з соллю і адціралі рукамі. У такіх выпадках лапці шылі шэрсцю ўсярэдзіну, да нагі.

Валены абутак («валёнкі», «валенцы») у канцы XIX — пачатку XX ст. з'яўляўся прыналежнасцю толькі заможных сялян. Тлумачылася гэта тым, што для валёнак патрэбна была добрай якасці кароткая авечая воўна, з якой селянін звычайна вырабляў верхняе адзенне. Найбольшае распаўсюджанне валёнкі атрымалі ва ўсходняй Беларусі, на Магілёўшчыне, што звязана з адыходным промыслам у рускія губерні. Валілі валёнкі звычайна шапавалы, якія зімой хадзілі з вёскі ў вёску і працавалі дома ў заказчыкаў. Сяляне давалі шапавалам воўну для валёнак, ежу і начлег. Для моцнасці валёнкі абавязкова падшывалі лямцам. Часта на валёнкі абувалі плеценыя лапці.

Драўляны абутак меў вельмі нязначнае распаўсюджанне на тэрыторыі Беларусі (карта 19) і бытаваў пад назвамі «чуні», «кандалы», «дзеравянікі», «дзеравяшкі». Дзеравяшкі былі альбо поўнасцю выдаўбленымі з дрэва, або са скураным верхам на драўлянай падэшве. Насілі гэты абутак толькі вясной і восенню ў гразь.

Такім чынам, абутак, як і ўвесь нацыянальны касцюм, адлюстроўваў умовы жыцця беларусаў, спецыфіку іх матэрыяльнай культуры.

[53] М. Я. Грынблат. Сялянскія промыслы і рамёствы ў XIX—XX стст. «Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук», 1957, № 2, стар. 57.

# АДЗЕННЕ ІНШЫХ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ У БЕЛАРУСІ

Славянскія плямёны, па сцвярджэнню савецкіх археолагаў, з'явіліся на тэрыторыі Беларусі ў перыяд VI—VIII стст. н. э.[1] Развіццё земляробства, рост прадукцыйнасці працы і насельніцтва прывялі да таго, што к XI ст. усходнеславянскія народы занялі велізарныя прасторы Усходняй Еўропы. У складзе заходнерускіх княстваў беларусы ў XIII ст. далучыліся да Вялікага княства Літоўскага. Аднак гэта не зламала старых этнічных межаў і не прывяло да масавага перамяшчэння карэннага насельніцтва, што садзейнічала захаванню яго этнічнага адзінства. У XIX — пачатку XX ст. пераважную большасць насельніцтва сучаснай тэрыторыі Беларусі складалі беларусы.

Паводле даных усеагульнага перапісу насельніцтва 1897 г., на тэрыторыі Беларусі (у сучасных яе межах) пражывала 6579,6 тыс. чалавек. З іх беларусы складалі 73%, яўрэі — 13,8, рускія — 4,3, украінцы — 4,7, палякі — 2,5, іншыя народнасці — 1,7%[2]. Асноўная маса беларусаў жыла ў сельскай мясцовасці. У гарадах назіралася іншая карціна: там беларусы складалі толькі 13,2%, асноўным насельніцтвам былі яўрэі і рускія. На долю першых прыходзілася 58,2%, а на долю іншых — 17,8%. Палякі складалі 12% і іншыя нацыянальнасці — 2,8%[3].

Мы абмяжоўваемся толькі кароткаю даведкаю аб з'яўленні на Беларусі насельніцтва іншых нацыянальнасцей і характарыстыкай іх адзення, прычым гаворка вядзецца аб жыхарах вёсак і дробных мястэчак, бытавыя ўмовы якіх мала чым адрозніваліся ад вясковых.

Побач з беларусамі ў сельскай мясцовасці жылі і займаліся пераважна земляробствам украінцы, рускія, палякі, латышы, літоўцы, татары і немцы. Амаль усе гэтыя народы былі рассеяны невялікімі астраўкамі сярод беларусаў і знаходзіліся з імі ў аднолькавым сацыяльна-эканамічным становішчы. Толькі літоўцы складалі больш-менш кампактную групу ў паўночна-заходніх паветах — Ашмянскім, Лідскім, Браслаўскім Віленскай губерні. У рукапісным фондзе акад. П. І. Кепена маецца пералік літоўскіх вёсак не толькі ў Віленскай, але і ў Гродзенскай губерні. Паводле даных Кепена, у 1848 г. на літоўскай мове гаварылі жыхары 13 вёсак, 8 засценкаў, 2 мястэчак Гродзенскага павета, 13 вёсак — Слонімскага[4]. Літоўцы з'яўляліся старажытным насельніцтвам гэтага краю. Значная частка іх к XIX ст. у працэсе складвання беларускай нацыі была асімілявана цалкам. У тых жа вёсках, дзе яны яшчэ лічылі сябе літоўцамі і гаварылі на сваёй роднай мове, па сведчанню беларускіх этнографаў, іх матэрыяльная культура ў многім была блізкай да беларускай.

Адзенне літоўцаў, якія жылі ў Віленскай губерні, згодна з апісаннем А. Кіркора, мала адрознівалася ад беларускага. Толькі жанчыны ў святочныя дні надзявалі світку або катанку з сіняга сукна, хатняга або тонкага куплёнага; у будныя ж дні насілі світы са звычайнага хатняга шэрага сукна, зімой аўчынныя кажушкі, рэдка кажухі. Мужчынскае адзенне літоўца ўвосень і зімой складалася са світкі, сярмягі са звычайнага шэрага сукна з невялічкім стаячым каўняром .Толькі ў вёсках бліжэй да гарадоў літоўскія сяляне насілі доўгія камзолы з сіняга сукна з металічнымі гузікамі і з невялікім стаячым каўняром[5] (рыс. 19).

[1] Очерки по археологии Белоруссии. Минск, 1970, стар. 254.

[2] Гісторыя Беларускай ССР, т 2. Мінск, 1972, стар. 188.

[3] Там жа.

[4] Гл.: М. Я. Гринблат. Белорусы. Минск, 1968, стар. 150.

[5] А. Киркор. Этнографический взгляд на Виленскую губернию. Этнографический сборник, вып. III. СПб, 1858, стар. 136—138.





Рыс. 19. Адзенне літоўцаў і дробнай шляхты:
зверху — літоўцы з ваколіц Валкаміра Віленскай губ.; знізу — шляхціцы XVIII ст. (паводле малюнка Яна Матэйкі)

Латышы сталі сяліцца ў Беларусі з XVIII ст.[6] Асноўная іх маса рассялялася ў паўночна-ўсходняй частцы Беларусі. Шмат латышоў пасялялася ў Віцебскай губерні. Па даследаванню А. М. Семянтоўскага, у 1869—1870 гг. у складзе насельніцтва Віцебскай губерні латышоў было 19,8 працэнта. Праз 30 гадоў колькасць іх зменшылася да 17,9 працэн-

[6] Андрей Мейер. Описание Кричевского графства 1786 г. «Могилевская старина», вып. II, 1901, стар. 98.





Рыс. 20. Адзенне латышоў Віцебскай губ.

та [7]. У канцы XIX ст. латышы звычайна сяліліся ў лясах, купляючы або арандуючы землі на ільготных умовах. Распыленыя невялікімі астраўкамі сярод мясцовага насельніцтва, яны хутка прыстасоўваліся да новых умоў. У пачатку XX ст. М. В. Доўнар-Запольскі адзначаў, што «сярод віцебскіх латышоў знікае іх старадаўняе нацыянальнае адзенне; яго замяняе сярмяга, па крою падобная да беларускай. Толькі святочны касцюм латышоў даражэйшы, прыгажэйшы і больш мудрагелісты, чым у суседзяў-беларусаў. Толькі камзол з адкладным каўняром адрознівае латыша ад яго суседзяў: у свята латыш ідзе ў касцёл у доўгім суконным кафтане і ў капелюшы з шырокімі палямі» [8] (рыс. 20). Паступова былі асіміляваны асноўным беларускім насельніцтвам і іншыя дробныя этнічныя групы, якія з'явіліся тут у розныя часы.

У другой палавіне XVII — першай палавіне XVIII ст. з прычыны войнаў і эпідэміі насельніцтва Беларусі скарацілася амаль у два разы [9]. Гэта прымусіла беларускіх феадалаў для засялення пустуючых зямель прывозіць пасяленцаў з Падляшша, Украіны і старавераў з Расіі, якія ратаваліся ад ганенняў рускага патрыярха Нікана. Перасяленцаў на некалькі гадоў вызвалялі ад асноўных павіннасцей [10]. Навапасяленцы, за выключэннем старавераў, вельмі хутка змяшаліся з мясцовым насельніцтвам. Стараверы аказаліся найбольш кансерватыўнымі ў матэрыяльным быце. Яны ўпарта захоўвалі свае старажытныя формы адзення і галаўных убораў. Амаль да савецкага часу яны насілі ка-

[7] Хозяйственное положение и промыслы сельского населения Витебской губернии. Витебск, 1910, стар. 51.

[8] Россия. Полное географическое описание нашего Отечества, т. IX. СПб, 1905, стар. 201.

[9] Гісторыя Беларускай ССР, т. 1. Мінск, 1972, стар. 328.

[10] Там жа, стар. 334.

саклінавыя сарафаны — «шубейкі», шырокія душагрэі і да т. п.[11]

Стараверы жылі галоўным чынам у паўночна-ўсходніх беларускіх паветах. Так, у другой палавіне XIX ст. у Віцебскай губерні велікарускае насельніцтва (галоўным чынам стараверы) складала 5,5 працэнта агульнай колькасці жыхароў губерні [12]. У Магілёўскай губерні сустракаліся мястэчкі, цалкам заселеныя старaверамі (Веткаўская Слабада).

Пасля ўз'яднання Беларусі з Расіяй заходнія і цэнтральныя беларускія паветы засяляліся рускімі з цэнтральных рускіх губерняў з той мэтай, каб яны прынеслі з сабою «ў сей край, які найбольш чужы Расіі, нашу мову, звычай і прыхільнасць рускіх да трона» [13]. Але гэта мэта не была дасягнута на той падставе, што пад уплывам карэнных жыхароў перасяленцы, як адзначалася Часовым саветам для кіраўніцтва дэпартаментам дзяржаўных маёмасцей, не толькі не ў сілах будуць распаўсюджваць у гэтым краі рускі дух, але і лёгка могуць самі яго страціць [14].

Цікавыя ўзаемаадносіны склаліся ў Беларусі з крымскімі татарамі. Татары наносілі значныя спусташэнні Вялікаму княству Літоўскаму. Але ў той жа час яны сумесна з літоўска-рускімі войскамі неаднаразова біліся супраць ворагаў Вялікага княства Літоўскага [15]. Польскія магнаты выкарыстоўвалі татарскія войскі ў барацьбе супраць казацтва і беларускіх паўстанцаў. Татары, якія былі пераселены князем Вітаўтам у Беларусь у XIV ст., атрымалі правы дваранства. Кампактныя групы татар пасяляліся галоўным чынам у гарадах і мястэчках Лідскага, Ашмянскага, Навагрудскага, Клецкага, Давыд-Гарадоцкага і рада іншых паветаў Беларусі. К XIX ст. яны амаль зусім страцілі своеасаблівасці ў матэрыяльным быце і ў тым ліку ў адзенні. Як прывілеяванае служылае саслоўе татары засвойвалі шляхецкія звычаі і адзенне. Некаторая своеасаблівасць прасочвалася толькі ў галаўных уборах і ўпрыгожаннях.

Яўрэі, як паказваюць статыстычныя даныя, складалі большую частку насельніцтва беларускіх гарадоў. У сельскай мясцовасці працэнт яўрэйскага насельніцтва быў даволі нязначны. У некаторых крыніцах адзначаецца, што яўрэі прыйшлі ў Літву ў першай палавіне XII ст. з Кіева. У першай палавіне XIV ст. яны ўжо мелі ў Вільна гасціны двор [16]. У пачатку XX ст. у паветах і гарадах шасці заходніх губерняў: Гродзенскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Віленскай, Ковенскай — іх налічвалася 1 414 457 чалавек (14,1 %) і ў паветах, акрамя гарадоў,— 798 466 чалавек (9,0 %) [17].

Займаючыся гандлем і прамысловасцю, яўрэі даволі цесна сутыкаліся з бытам карэннага насельніцтва. Паслугамі шаўцоў-яўрэяў шырока карысталіся сельскія жыхары. Праз іх у беларускую вёску заносіліся гарадскія фасоны і тыпы крою [18].

У статыстычных даных аб колькасці палякаў у Віцебскай губерні ўказваецца: «Палякі, якія таксама ўваходзяць у склад мясцовага насельніцтва,— самая малая група, і ў ёй прыродных палякаў вельмі мала, у большасці гэта апалячаныя беларусы» [19]. Гэта тлумачэнне не выпадковае.

Гістарычна ў Беларусі склаліся вельмі складаныя адносіны мясцовага беларускага насельніцтва з палякамі. Палякі паявіліся ў Беларусі з даўніх часоў. Асабліва ўзмацніўся іх прыток пасля заключэння Люблінскай уніі ў 1569 г., калі была знята забарона для польскіх магнатаў набываць землі ў межах Вялікага княства Літоўскага. Пасля Люблінскай уніі шырокай плынню на ўсход пайшла каталіцкая экспансія. Каталіцкія ксяндзы пачалі прымушаць просты народ адысці ад праваслаўя, прынятага яшчэ ў перыяд Кіеўскай Русі. Добраахвотна, але часцей пад прымусам значная частка беларускага насельніцтва прыняла каталіцтва, што паклала мяжу паміж адзінымі па паходжанню жыхарамі Беларусі. Каталіцтва прынялі ў большасці пануючае саслоўе, буйная і дробная шляхта, якая імкнулася праз гэта набыць сабе палітычныя і маёмасныя прывілеі. У сілу гістарычных акалічнасцей пэўная частка дробнай шляхты не мела магчымасці даказаць сваё шляхецкае паходжанне і апынулася ў становішчы простых сялян, але і ў гэтых умовах не страціла свайго фанабэрства. Гэта так званая засцянковая шляхта, хоць і была ў асноўнай масе беларускага паходжання, імкнулася ў быце адасобіць сябе ад сялян, г. зн. праваслаўных беларусаў. У адзенні шляхты (расфарбоўцы, крої, характары ўпрыгожанняў, у манеры нашэння) адбіўся польска-шляхецкі ўплыў. М. В. Доўнар-Запольскі адзначаў, што «польскі ўплыў адбіўся на адзенні і звычках шляхціца. Шляхціц збрывае бараду, адзяваецца ў чорны або шэры

[11] Архіў ІМЭФ, ф. 6, воп. 11, спр. 1092.

[12] Хозяйственное положение и промыслы сельского населения Витебской губернии, стар. 49.

[13] Белоруссия в эпоху феодализма, т. III. Минск, 1961, стар. 219—220.

[14] Там жа, стар. 224—225.

[15] Гісторыя Беларускай ССР, т. 1, стар. 227.

[16] Живописная Россия, т. III, ч. II. СПб. 1882 стар. 16.

[17] А. Н. Харузин. Славянское жилище в Северо-Западном крае. Вильна, 1907, стар. 23—24.

[18] Архіў ІМЭФ, ф. 6, воп. 11, спр. 998.

[19] Хозяйственное положение и промыслы Витебской губернии, стар. 49

суконны кафтан, на галаве носіць куртуз польскага крою. Шляхцянка носіць кофту і спадніцу з паркалю, апранаецца ў паліто старажытнага крою» [20].

У сяле Ляхаўцы Маларыцкай воласці Брэсцкага павета, напрыклад, шляхта ад сялян адрознівалася толькі па крою адзення. Мужчыны замест сялянскіх латух (верхняе суконнае адзенне) насілі доўгія курцікі з рознымі тасёмкамі, шнуркамі, гузікамі, а жанчыны замест намітак — звычайныя каляровыя хусткі [21].

Адзенне мяшчан — жыхароў мястэчак, асабліва верхняе, зазнала таксама значны польскі ўплыў. У XIX ст. у мяшчан яшчэ шырока бытавалі кунтушы, жупаны, пашытыя па ўзорах, блізкіх да польскіх жупаноў. Так, у канцы XIX ст. у асяроддзі тураўскага мяшчанства бытавалі жупаны, пашытыя з сіняга сукна. На грудзях такі жупан зашпільваўся на круглыя вісячыя белыя гузікі. Вельмі доўгі з чырвонага атласу каўнер быў адкладным, рукавы таксама з атласнымі шырокімі (каля 20 см) адваротамі. На баках ля кішэнных пpoрaзей прышываўся залацісты галун. Своеасаблівай мадыфікацыяй жупана з'яўляліся жаночыя паўжупанкі і футры. Першы падшываўся палатном, другі — аўчынай. Блізкімі да гэтых відаў адзення з'яўляліся вядомыя ў мяшчан Смаргоні так званыя шляпрок і сурдушчык, якія жанчыны надзявалі толькі па святах.

Трэба заўважыць, што запазычаныя ад палякаў формы крою не былі аднастайнымі і аднатыповымі па ўсёй Беларусі.

У мястэчку Дрыбін Чавускага павета Магілёўскай губерні, напрыклад, яшчэ ў канцы XIX ст. захавалася некалькі экземпляраў жаночага верхняга адзення старажытнага крою, вядомага пад назвай «кунтуш». Кунтушы шыліся з цёмна-чырвонага, зялёнага і іншага колеру сукна, ніз і крыссе абшываліся пазументам, а адкладны каўнер — сярэбранымі махрамі. У плячах кунтушы былі вузкія, а к нізу расшыраліся [22].

Рознакаляровае суконнае верхняе адзенне, аздобленае атласам, бархатам і галунамі, характэрнае для польскай шляхты, асвоенае багатымі мястэчковымі жыхарамі, доўгі час выкарыстоўвалася ў якасці святочнага касцюма.

Аднак ужо ў канцы XIX ст. ад шляхецкага адзення захаваліся толькі назвы. Мужчынскія і жаночыя жупаны, або шаракі, шыліся ўжо з хатняга валенага сукна шэрага колеру. І крой іх капіраваў звычайную беларускую світку з адразным нізам і гладкімі неадразнымі полкамі.

Адзенне ў мястэчках, якія не былі пераведзены ў разрад сельскіх пасяленняў, больш адрознівалася ад адзення сялян. Яно развівалася па ўзорах гарадскога касцюма, агульнага для ўсёй Расіі. Нават вядомыя ў сялянскім комплексе прадметы ў мяшчан шыліся крыху па-асобаму. Так, мяшчане горада Суража Віцебскай губерні зімой насілі аўчынныя футры, пакрытыя пасіненым сукном. Летняе мужчынскае адзенне складалася з армяка, але ўжо не суконнага, а пашытага з тоўстага пасіненага палатна. Мужчыны з больш заможных сямей хадзілі ўлетку ў чорным камзоле, які надзяваўся на кашулю, так што апошняя была відаць з-пад яго. Замест камзола і жылета насілі простую кароткую суконную куртку чорнага або шэрага колеру. Жаночае верхняе адзенне суражскіх мяшчанак складалася з сіняй катанкі, якая шылася ззаду са зборкамі. Пад катанку для цяпла паддзявалі аўчынны кажух. Улетку замест суконнай катанкі насілі катанку з сіняга або чорнага рыпсу [23].

Паводле даных П. Баброўскага, мяшчане Беластоцкай губерні насілі капоты або сурдуты з шэрага або сіняга сукна, абшытага белай тасьмой, улетку — курткі або кафтаны з палатна, вытканага з белых і сініх нітак. Шляхта і майстравыя на фабрыках хадзілі ў сініх або шэрых з тасьмой кафтанах або сурдутах [24].

Як паказвае прыведзены матэрыял, сялянскае адзенне беларусаў у канцы XIX — пачатку XX ст. зазнала некаторыя змены пад уплывам гарадской культуры. Змяніўся матэрыял і ў некаторых відах адзення (галоўным чынам верхняе) і крой. Моцнай нівеліроўцы падверглася адзенне малых нацыянальных груп, паселеных у асноўны масіў мясцовага беларускага насельніцтва. Трацiць свае асаблівасці адзенне іншых саслоўных груп.

Больш выразныя адрозненні наглядаліся ў адзенні розных сацыяльных слаёў беларускага насельніцтва, але і яны з цягам часу паступова нівеліруюцца пад уплывам далейшага сацыяльна-эканамічнага развіцця.

[20] Россия. Полное географическое описание нашего Отечества, стар. 201.

[21] Село Ляховцы Брестского уезда. «Гродненские губернские ведомости», 1891, № 73.

[22] Архіў Усесаюзнага геаграфічнага таварыства СССР, разрад 20, воп. 1, № 12, стар. 79.

[23] Архіў Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі.

[24] П. Бобровский. Гродненская губерния. Материалы для географии и статистики России, ч. I. СПб, 1863, стар. 816—818.

# СУЧАСНАЕ АДЗЕННЕ СЕЛЬСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ

Сучаснае адзенне беларусаў — якасна новы этап у яго развіцці. Усе змены, што адбыліся за гады Савецкай улады ў эканамічным і культурным жыцці рэспублікі, зразумела, наклалі адбітак і на адзенне. Працэс дэмакратызацыі адзення, які пачаўся яшчэ ў нетрах капіталістычнага дзелавога свету, знайшоў сваё завяршэнне ў сацыялістычным грамадстве, заснаваным на роўнасці ўсіх яго членаў. Сучаснае адзенне страціла сваю сацыяльную адасобленасць.

Агульная тэндэнцыя да урбанізацыі ў нашай краіне, узбуйненне многіх вёсак і стварэнне пасёлкаў гарадскога тыпу, развіццё аўтамабільнага руху, пашырэнне сеткі радыё і тэлебачання і г. д. стварылі аб'ектыўныя перадумовы для хуткай нівеліроўкі быту гарадскога і сельскага насельніцтва, іх культуры.

На вёсцы вырас свой рабочы клас. Тут з'явіліся спецыяльнасці, якіх ранейшая вёска не ведала,— інжынеры-механізатары, будаўнікі, радыётэхнікі, сувязісты, эканамісты і г. д.[1] Рост вытворчых сіл сельскай гаспадаркі, паступовае ператварэнне сельскагаспадарчай працы ў разнавіднасць працы індустрыяльнай, павышэнне культуры вёскі і перабудова сельскага быту — усё гэта вядзе да змянення сацыяльнага аблічча і псіхалогіі селяніна: у яго з'яўляецца ўсё больш агульных рыс з рабочым. Узрастае колькасць калгаснікаў, чыя праца непасрэдна звязана з машынамі і механізмамі, павышаецца адукаванасць калгаснага сялянства. Камуністычная партыя Савецкага Саюза і Савецкі ўрад бачаць у знішчэнні граней паміж горадам і вёскай адну з галоўных задач сучаснага этапа камуністычнага будаўніцтва. У выступленні Л. І. Брэжнева адзначана, што «за апошнія гады нямала зроблена для таго, каб паскорыць збліжэнне горада і вёскі... у сферы дабрабыту і культуры» [2]. Улічваючы рост запатрабаванняў народа, Савецкі ўрад прымае ўсе меры па пашырэнню вытворчасці тавараў першай неабходнасці. З дзяржаўнага бюджэта выдзяляюцца вельмі значныя сумы на вытворчасць тканін, абутку і галаўных убораў.

Знікненне розніцы ў адзенні гарадскога і сельскага насельніцтва адбываецца на базе ўсямернага павышэння матэрыяльна-тэхнічнай базы вёскі — аб'ектыўнай асновы для далейшага павышэння яе культуры, зблiжэння яе з гарадской культурай.

Адзенне сельскага насельніцтва ў сучасны момант вырабляецца выключна з фабрычных тканін па агульнапрынятых у пэўны сезон фасонах. Пранікненне ў сельскую мясцовасць навейшых мод адбываецца не толькі праз пакупку гатовых вырабаў, але абумоўліваецца ўсім укладам жыцця калгаснага сялянства, якое не адгароджана ад жыцця горада.

Лепшыя ўзоры сучасных фасонаў, айчынных і замежных, прапагандуюцца на старонках часопісаў мод, а таксама ў дадатках да грамадска-палітычных і літаратурна-мастацкіх часопісаў. Навінкі сезонных мод дэманструюцца на экранах кінатэатраў і тэлевізараў, якія шырока ўвайшлі ў быт сучаснай вёскі. Пастаянная сувязь сельскага насельніцтва з горадам праз моладзь, якая вучыцца ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, таксама садзейнічае распаўсюджанню ў вёсцы агульнапрынятых відаў адзення. Прыкметны ўплыў на агульны каларыт адзення ў вёсцы аказвае і шматлікая прыезджая з гарадоў інтэлігенцыя (настаўнікі, урачы, аграномы і інш.). Пашыў адзення ў гарадскіх атэлье, швейных майстэрнях таксама садзейнічае ўкараненню навейшых фасонаў у сельскае асяроддзе. У апошнія гады шырока разгарнулася

[1] Некоторые вопросы экономического развития Белоруссии. Минск, 1969, стар. 238—239.

[2] Л. И. Брежнев. Ленинским курсом, т. 2. М., 1970, стар. 105.

будаўніцтва ў сельскай мясцовасці камбінатаў бытавога абслугоўвання. Тут сяляне могуць не толькі пашыць адзенне любога фасону, але і атрымаць кансультацыі і выкрайкі.

Арганізацыі па праектаванню і вырабу сучаснага адзення ўлічваюць спецыфічныя ўмовы жыцця і працы сельскага насельніцтва і накіроўваюць у адпаведнасці з гэтым сваю работу.

У станаўленні сучаснага адзення сельскага насельніцтва Беларусі пэўную ролю адыгралі традыцыі народнага адзення.

Традыцыі з'яўляюцца сувязным звяном паміж мінулым народа, яго сённяшнім днём і будучым. Пытанне ўсямернага выкарыстання ў сучаснай матэрыяльнай культуры, сучасным адзенні лепшых традыцый народнай творчасці з'яўляецца актуальнай і разам з тым складанай задачай сучаснасці. Яна асноўваецца на неабходнасці беражлівых адносін да культурных каштоўнасцей, якія дасталіся чалавецтву з мінулых гадоў і падлягаюць крытычнай ацэнцы і перагляду, развіццю і выкарыстанню іх у адпаведнасці з канкрэтнымі задачамі сучаснасці і аб'ектыўнымі крытэрыямі грамадскага прагрэсу [3]. «Захоўваць спадчыну — зусім не азначае яшчэ абмяжоўвацца спадчынай»,— пісаў У. І. Ленін [4].

Уяўляючы сабой гістарычны, стваральны і творчы вопыт многіх пакаленняў, без якога немагчымы далейшы прагрэс, традыцыі адыгрываюць значную ролю ў паступальным руху чалавецтва, пазбаўляючы яго ад дарэмнай працы на паўторнае адкрыццё і стварэнне ўжо вядомага.

Кожнае новае пакаленне не стварае матэрыяльнай базы і культуры нанава, не пачынае сваё свядомае жыццё на пустым месцы, а засвойвае тыя рэальныя каштоўнасці, якія былі створаны папярэднімі пакаленнямі. «Гісторыя,— пісалі К. Маркс і Ф. Энгельс,— ёсць не што іншае, як паслядоўная змена асобных пакаленняў, кожнае з якіх выкарыстоўвае матэрыялы, капіталы, вытворчыя сілы, што былі перададзены яму ўсімі папярэднімі пакаленнямі; у сілу гэтага дадзенае пакаленне, з аднаго боку, працягвае атрыманую ў спадчыну дзейнасць пры зусім змяніўшыхся умовах, а з другога — відазмяняе старыя ўмовы пры дапамозе зусім зменeнай дзейнасці» [5].

Сучасная матэрыяльная культура, састаўной часткай якой з'яўляецца адзенне, уяўляе сабой лагічны і арганічны працяг старой, традыцыйнай. Частка элементаў, якія не вытрымалі выпрабавання часам, паступова знікла, але другая частка, якая мела большую жыццяздольнасць, знайшла сабе месца ў новай, сучаснай і працягвае адыгрываць істотную ролю ў жыцці грамадства.

Так, з сялянскага адзення параўнальна даўно зніклі традыцыйныя безрукаўкі, якія ўжо ў першыя паслярэвалюцыйныя гады сустракаліся, як правіла, толькі ў больш аддаленых ад горада і чыгуначных станцый вёсках, прычым іх ужо рэдка шылі нанава па старому крою, а часцей толькі даношвалі старыя запасы.

Даволі рана зніклі з жаночага комплексу даматканыя андаракі і спадніцы (карта 20). У 50-я гады XX ст. яны захаваліся толькі ў куфрах старых жанчын.

Беларускае народнае адзенне акумулявала ў сабе шматвяковы вопыт нялёгкага жыццёвага шляху беларускага народа. Таму некаторыя традыцыйныя віды адзення доўгі час захоўваліся і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. У першыя паслярэвалюцыйныя гады, гады пасляваеннай разрухі, яшчэ ўжывалася адзенне з даматканіны, якое канчаткова знікла толькі пасля калектывізацыі разам са знікненнем рэштак замкнутасці сялянскай гаспадаркі, змяншэннем плошчы індывідуальных пасеваў ільну і пашырэннем вытворчасці фабрычных тканін. Выцясненне з ужытку асноўнай сыравіны для хатняга ткацтва абумовіла пераход сялянства да адзення з купленых тканін, якія ў дарэвалюцыйны час былі даступны толькі заможным слаям сельскага насельніцтва. Але гэты пераход не азначаў поўнага знікнення традыцыйнага адзення. З дарэвалюцыйнага комплексу жаночага адзення ў малазмененым выглядзе захаваўся фартух, які да 60-х гадоў у многіх раёнах Беларусі, а асабліва на Палессі, складаў неабходную частку адзення жанчын пажылога ўзросту. Ён захаваў старажытныя рысы ў кроі і характары ўпрыгожанняў.

У адрозненне ад фартухоў, якія надзявалі маладыя жанчыны на работу, фартух пажылых жанчын (асабліва святочны) быў часцей за ўсё з тонкай белай тканіны. Па ніжняму краю прышываліся карункі, а поле фартуха ўпрыгожвалася вышыўкай.

Традыцыйныя рысы ў адзенні ў савецкі час даўжэй захоўваліся ў комплексе старэйшага пакалення. Пажылыя жанчыны па традыцыі больш ахвотна (а да 60-х гадоў пераважна) насілі не суцэльную сукенку, а спадніцу з кофтай. Матэрыялы, асабліва для спадніц, падбіралі такіх расфарбовак, якія нагадвалі даматканую андарачную тканіну. У характары крою таксама назіраліся некаторыя традыцыйныя рысы.

[3] П. И. Кабанов. История культурной революции в СССР. М., 1971, стар. 126.
[4] В. И. Ленин. Полн. собр. соч., т. 2, стар. 542.
[5] К. Маркс и Ф. Энгельс. Соч., т. 3, стар. 44—45.




Карта 20. Тыпы жаночага паяснога адзення (20—30-я гады XX ст.):
*1* — з фабрычнай тканіны; *2* — саматканыя (*а* — пераважае, *б* — бытуе, *в* — сустракаецца)

Старыя звычайна насілі доўгія, амаль да шчыкалаткі і даволі шырокія спадніцы са зборкамі ля пояса, кофты на гестцы з разрэзам спераду, уздоўж якога ад каўняра да нізу прышываліся кнопкі або гузікі. Рукаў, як правіла, быў доўгі, з манжэтай. Такую кофту насілі звычайна навыпуск, наверх на спадніцу. На кофту пры выхадзе «ў людзі» надзявалі жакет, пашыты часцей за ўсё з тоўстага чорнага матэрыялу. Увосень і зімой, а таксама ў халоднае надвор'е летам у хаце на кофту надзявалі безрукаўку на цёплай ватовай падкладцы, якая шчыльна зашпільвалася на гаплікі або гузікі. Нярэдка гэты касцюм дапаўняўся фартухом (дадатак, XXVII).

Такі даволі ўстойлівы комплекс адзення пажылой жанчыны быў шырока распаўсюджан у Беларусі.

У Заходняй Беларусі, якая да 1939 г. уваходзіла ў склад буржуазнай Польшчы, даўжэй захоўвалася аднаасобная гаспадарка з даволі развітым хатнім ткацтвам. Тут, асабліва ў Пінскім Палессі, вельмі доўга пераважала даматканіна ў адзенні яшчэ ў пасляваенныя гады. У шырокім ужытку быў своеасаблівы касцюм, які складаўся з блузы, упрыгожанай нашыўкай шаўковых стужак або карункаў, спадніцы хацця і пашытай часцей за ўсё з купленых тканін, але таксама ўпрыгожанай шаўковымі стужкамі, карункамі і галуном.

Найбольш заможныя жанчыны і рукадзельніцы заўсёды мелі значны запас не толькі вытканага палатна, але і гатовых вырабаў. Гэтыя запасы былі сур'ёзнай дапамогай у бюджэце сям'і ў цяжкія гады вайны і пасляваеннай разрухі. Нацельнае адзенне з даматканіны з ужытку

беларускіх сялян канчаткова стала знікаць толькі пасля Вялікай Айчыннай вайны. У 60-я гады ў радзе глухіх вёсак старыя жанчыны насілі кашулі з даматканіны, пашытыя традыцыйным кроем. Выкарыстоўваліся яны, як правіла, у якасці ніжняй бялізны, а ў заходніх абласцях іх насілі і замест блузкі. Кашулі-блузкі багата арнаментаваліся тканым, а часцей вышытым узорам. Сподняя жаночая бялізна з простага ці шаўковага трыкатажу, якая з'явілася ў вёсках у пасляваенныя гады, у сучасны момант канчаткова выцесніла даматканыя кашулі нават у старэйшага пакалення.

Віды і крой сучаснага жаночага адзення вельмі разнастайныя. Адзенне — вельмі рухомы элемент культуры. Кожны год, а іншы раз і кожны сезон уносіць нешта новае як у агульны комплекс адзення, так і ў яго крой. Гэта акалічнасць абумоўлівае разнастайнасць фасонаў, асабліва святочнага адзення. Параўнальная ўстойлівасць назіраецца ў відах і фасонах рабочага адзення і уніфікаваным спецадзенні. Разнастайнасць адзення прасочваецца не па лакальнай прыкмеце, як гэта было ў традыцыйным адзенні, а ў межах аднаго і таго ж населенага пункта, нават у адной і той жа жанчыны. Матэрыяльная забяспечанасць, наяўнасць у продажы разнастайных матэрыялаў дазваляюць сучаснай сялянцы ісці ў нагу з модай.

У сучасным сялянскім адзенні, як ужо адзначалася, зусім не адбіваецца сацыяльнае і сямейнае становішча, г. зн. тыя моманты, якія адыгрывалі немалую ролю ў адзенні дарэвалюцыйнай вёскі.

Адзенне жанчын ва ўзросце ад 18 да 40 гадоў зараз мала адрозніваецца ў крoі і ў агульным комплексе. Нават характарам упрыгожанняў касцюм жанчын сярэдніх гадоў не адрозніваецца ад касцюма дзяўчат і маладых жанчын. Розніца тут назіраецца толькі ў даўжыні і шырыні вырабаў. Жанчыны прытрымліваюцца «залатой сярэдзіны», г. зн. звычайна носяць сукенку ўмеранай даўжыні і шырыні, тады як дзяўчаты іншы раз утрыруюць агульнапрынятыя нормы.

Мужчынскае нацельнае і хатняе адзенне за гады Савецкай улады змянілася менш, чым жаночае. Тлумачыцца гэта часткова тым, што ў канцы XIX — пачатку XX ст. з развіццём прамысловасці і адыходніцтва мужчынская частка сельскага насельніцтва была больш шчыльна звязана з горадам, і мужчынскае адзенне ўжо тады зазнала значныя змены на шляху збліжэння яго з гарадскім. Яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі многія прадметы мужчынскага касцюма шыліся не з даматканіны, а з куплёных тканін. Разам з куплёнымі тканінамі пранікалі ў вёску і гарадскія фасоны, якія нярэдка пераносіліся і на адзенне са свайго, хатняга матэрыялу.

Комплекс сучаснага мужчынскага адзення па-ранейшаму складаецца са штаноў, пінжака і сарочкі і прадметаў ніжняй бялізны.

Святочнае адзенне ад будзённага адрозніваецца часцей за ўсё толькі якасцю матэрыялу. Святочныя сарочкі, звычайна больш светлых таноў, у маладых мужчын часта шаўковыя, палатняныя, трыкатажныя або віскозныя. Святочныя касцюмы з больш якасных матэрыялаў купляюць часцей за ўсё гатовыя, таму крой іх даволі аднатыпны і адпавядае агульнапрынятай у пэўны адрэзак часу модзе. Больш змяніліся манера нашэння адзення, а таксама яго дадатковыя элементы. Зараз ужо і старыя мужчыны рэдка носяць сарочкі-касавароткі, падпяразаныя шарсцяным хатняй работы поясам. Цяпер сарочкі носяць запраўленымі ў штаны. А калі і носяць навыпуск, дык не падпяразваюцца.

Самыя істотныя змены за гады Савецкай улады зазнала верхняе адзенне сялян. Калі ў куфрах старых жанчын яшчэ параўнаўча няцяжка знайсці традыцыйныя вышытыя і мастацкі затканыя кашулі і нават суконныя андаракі, то пра суконныя армякі і світкі часцей за ўсё можна чуць толькі расказы. З традыцыйнага верхняга адзення ў наш час бытуе толькі футравае аўчыннае.

У паслярэвалюцыйныя гады суконныя світкі пачалі перашываць на пінжакі і бравэркі. У Заходняй Беларусі з даматканага сукна і паўсукна шылі кароткія прамога крою фрэнчы, якія ў радзе месц называліся марынаркамі, і жаночыя жакеткі на падкладцы — «сачкі».

У першыя гады пасля Айчыннай вайны шырока распаўсюджаным відам верхняга адзення мужчын, жанчын, падлеткаў былі падшытыя ватай жакеткі — фуфайкі, якія або куплялі ў магазінах гатовымі, або шылі ў мясцовых краўцоў. Святочным цёплым адзеннем жанчын з'яўляліся плюшавыя на ваце жакеткі «плюшаўкі», якія яшчэ і зараз дзе-нідзе можна сустрэць у пажылых жанчын. Пашытыя з чорнага плюша прамым, крыху прыталеным кроем плюшаўкі насілі не толькі зімой, але наогул у халоднае надвор'е, яны замянялі нярэдка і дэмісезоннае паліто. У маразы для работы ў лесе і каля дому паўсюдна насілі аўчыннае адзенне тыпу кароткіх кажушкоў.

Асабліва прыкметныя змены ў тыпах і відах верхняга адзення адбыліся ў апошнія два дзесяцігоддзі. Узмацнелая эканоміка калгасаў і саўгасаў, узрослыя даходы працаўнікоў вёскі пашырылі пакупныя здольнасці сялян і садзейнічалі поўнаму знікненню вырабленага ў хатніх умовах і саматужнікамі верхняга адзен-

ня. Адбылася дыферэнцыяцыя верхняга адзення па сезонах. У гардэробе сялян абавязковымі сталі летнія і асеннія плашчы — шарсцяныя і з прарызіненых тканін, дэмісезонныя і зімовыя паліто. Пастаянна ўзрастае попыт на футравыя вырабы.

Футры выкарыстоўваюць галоўным чынам на аддзелку — на каўняры, манжэты. У шырокі ўжытак уваходзяць футры з сінтэтычных матэрыялаў. Што датычыць крою сучаснага верхняга адзення, то ён не адрозніваецца ад агульных стандартаў, таму што гэта адзенне купляецца часцей за ўсё гатовым або шыецца ў дзяржаўных майстэрнях і атэлье.

Галаўныя ўборы мужчын і жанчын за гады Савецкай улады таксама зазналі істотную мадэрнізацыю. Адбылася поўная нівеліроўка адрозненняў у прычосках і галаўных уборах жанчын у залежнасці ад узросту і сямейнага становішча. Гэты працэс ішоў паступова. У глухіх палескіх вёсках яшчэ ў 50-х гадах старыя жанчыны па традыцыі не плялі кос, а закручвалі іх на тканку вакол галавы і прыкрывалі чапцом. Доўга захоўваўся таксама звычай у дзяўчат заплятаць валасы ў косы, а не падстрыгаць іх, як гэта шырока распаўсюдзілася ў наступныя гады. Канчатковае знікненне старадаўніх прычосак і традыцыйных чапцоў можна аднесці да 50-х гадоў.

Жаночыя галаўныя хусткі ў беларускіх сялянак увайшлі ва ўжытак з сярэдзіны XIX ст. і з'яўляліся абавязковай састаўной часткай жаночага касцюма. Іх прадавалі на кірмашах, развозілі па вёсках вандроўныя гандляры — афені. У XIX ст. у Расіі шырока была развіта вытворчасць шарсцяных і шаўковых хустак, шалікаў і паўшалікаў. Куплёныя хусткі мелі амаль усе жанчыны. Толькі найбольш бедныя выраблялі хусткі з хатняга палатна і сукна.

Не страціла хустка свайго пануючага значэння і цяпер. Вялікі разнастайны асартымент хустак ёсць у кожным сельскім і гарадскім магазіне. Сялянкі ў працоўныя дні носяць паркалёвыя белыя або з набойкай хусткі, яны лёгкія і не выгараюць на сонцы. На святы надзяваюць шаўковыя і капронавыя хусткі або касынкі. Зімой на работу носяць цёплыя хусткі з махрамі шэрага, карычневага, зялёнага колеру, у святочныя дні — шарсцяныя яркіх колераў або пуховыя. Спосабы завязвання хустак па-ранейшаму даволі разнастайныя. Яны захавалі ў многім традыцыйныя рысы.

Зімой хусткі завязваюцца звычайна вакол шыі канцамі ззаду. Калі надзяваюць прыгожую шарсцяную або пуховую хустку, каля шыі абвіваюць толькі адзін канец, а другі свабодна ляжыць на грудзях. Да гэтага часу ў беларускіх сялянак, як і раней, практыкуецца завязванне некалькіх хустак адначасова. Звычайна зімой пад цёплую хустку, завязаную канцамі ззаду, падвязваюць паркалёвую, завязаную пад падбародкам. Іншы раз цёплую хустку накідваюць на галаву і плечы, не завязваючы. Нягледзячы на тое што ў апошнія гады пачалі ўваходзіць ва ўжытак шапкі, капелюшы, берэты, хустка ўсё ж з'яўляецца асноўным галаўным уборам жанчыны, таму што яна вельмі зручная пры рабоце на адкрытым паветры зімой і летам.

Мужчыны набываюць галаўныя ўборы звычайна ў магазінах. Даўно ўжо не ходзяць па вёсках вандроўныя краўцы-шапачнікі, якія яшчэ ў першыя паслярэвалюцыйныя гады амаль цалкам задавальнялі попыт насельніцтва вёскі на галаўныя ўборы.

Сучасныя сельскія галаўныя ўборы мужчын на вёсцы нічым не адрозніваюцца ад гарадскіх. Гэта тыя ж зімовыя шапкі-вушанкі, папахі, кубанкі з натуральнага або сінтэтычнага футра, берэты, капелюшы (саламяныя, капронавыя, фетравыя) улетку і ўвосень. У адрозненне ад горада тут большая перавага аддаецца шапцы-вушанцы, якая найбольш адпавядае ўмовам сельскай працы на адкрытым паветры.

За гады Савецкай улады істотна змяніліся традыцыйныя вясельныя галаўныя ўборы. У Віцебскай губерні яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі замест вянка са штучных кветак і са стужкамі, прымацаванымі да яго, у шырокі ўжытак увайшлі вянкі з васковых белых кветак з белай тонкай фатой ніжэй пояса. К 30-м гадам такі вясельны ўбор распаўсюдзіўся амаль паўсямесна ў Беларусі. Толькі ў радзе вёсак Пінскага Палесся аж да 50-х гадоў прытрымліваліся старадаўнасці, і нявесце (у радзе месц і жаніху) надзявалі вянкі з рознакаляровых штучных кветак, умацаваных на цвёрдым абручы, да якога ззаду падвешвалася шмат рознакаляровых шаўковых стужак.

З адкрыццём спецыяльных магазінаў для маладажонаў, дзе побач з іншымі прадметамі вясельнага адзення прадаюцца і галаўныя ўборы, традыцыйныя вясельныя галаўныя ўборы канчаткова выйшлі з ужытку.

У савецкі час цалкам знік традыцыйны сялянскі абутак, сплецены з лыкаў і пашыты з сырамятнай скуры. Скураныя поршні, моршні, хадакі — абутак тыпу лапцей, які надзяваўся на анучы і ўмацоўваўся на назе пяньковымі або скуранымі аборамі, знік яшчэ да рэвалюцыі, у першыя дзесяцігоддзі XX ст. Лапці аказаліся больш жывучымі. Да пачатку 30-х гадоў у радзе месц іх надзявалі на работу, дзеці і падлеткі хадзілі ў лапцях у школу. На палявых работах, асабліва на балотных сенакосах, лапці ўжываліся яшчэ ў пасляваенныя гады.





Рыс. 21. Сучаснае жаночае адзенне з выкарыстаннем народных традыцый. Мінская фабрыка мастацкіх вырабаў

Насілі лапці ў час Айчыннай вайны і ў першыя пасляваенныя гады.

У сучасны момант пераважным відам абутку на вёсцы з'яўляюцца скураныя боты. Боты носяць мужчыны, жанчыны і падлеткі абодвух полаў. У сельскай мясцовасці скураныя і гумавыя высокія боты — найбольш практычны абутак, асабліва ў час асенняга і веснавога сезонаў. У летняе сухое надвор'е вельмі зручны лёгкі парусінавы абутак, басаножкі і сандалі.

У зімовую халодную пару мужчыны, жанчыны, падлеткі і дзеці носяць валёнкі з высокімі халявамі, якія ў беларускай вёсцы пачалі распаўсюджвацца ў асноўным пасля рэвалюцыі. У сучасны момант валены абутак побач са скураным з'яўляецца шырока ўжывальным відам абутку.

Новай з'явай у адзенні сучаснай вёскі можна лічыць шырокае выкарыстанне панчох і шкарпэтак, якія ў традыцыйным касцюме былі вядомы толькі спарадычна. Мужчыны шкарпэтак не насілі зусім, таму што ў лапці і боты дастаткова было ануч. У цяперашні час штогод сельскія магазіны прадаюць панчох і шкарпэтак на сотні тысяч рублёў.

Рукавіцы і пальчаткі ў беларускай вёсцы таксама купляюць у магазінах, за выключэннем, можа, рабочых рукавіц, якія іншы раз шыюць самі. У апошняе дзесяцігоддзе па лініі Міністэрства мясцовай прамысловасці Беларускай ССР наладжваецца ў камбінатах надомнай працы шырокая вытворчасць гэтых вырабаў.

Сучаснае адзенне беларускага сялянства характарызуецца дакладнай асэнсаванай формай, колерам, ярка выяўленымі функцыянальнымі і эстэтычнымі якасцямі. У сваім станаўленні і развіцці яно адчувае на сабе дабратворны ўплыў народнага адзення, народнай творчасці. Навізна форм сучаснага адзення не супярэчыць наяўнасці ў ім тых традыцыйных элементаў, змест якіх сугучны патрабаванням, што прад'яўляюцца да сучаснага адзення.





Наш народ пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі вядзе непрымірымую барацьбу супраць шкодных традыцый мінулага і ў той жа час беражліва адносіцца да ўсяго прагрэсіўнага, што створана геніем простага народа, папярэднімі пакаленнямі.

Зусім натуральна, што нават прагрэсіўныя элементы народнага адзення ўваходзяць у сучаснае шляхам іх творчай пераапрацоўкі. Неабходнасць крытычных адносін да традыцый беларускага народнага адзення і народнай творчасці выцякае са складанасці гэтых з'яў. Да рэвалюцыі адзенне не было аднародным як па сваіх часавых характарыстыках, так і па класавай вызначанасці, таму што адзенне любога народа адлюстроўвае асаблівасці сучаснай яму эпохі. У яго знешніх формах і ўнутраным змесце прагледжваюцца не толькі магчымасці і дасягненні матэрыяльнай вытворчасці, але ў апасродкаваным выглядзе і існуючыя формы вытворчых адносін і грамадскай свядомасці. Вось чаму мастакам адзення, прыкладнога мастацтва, якія непасрэдна маюць дачыненне ў сваёй рабоце да народнага адзення, неабходна глыбокае і ўсебаковае веданне традыцыйных асноў народнага адзення, каб не пайсці па шляху прафанацыі іх асноўнага зместу і мастацкіх асаблівасцей.

Формы выкарыстання лепшых традыцый народнай творчасці ў сучасным адзенні разнастайныя. Гэта выкарыстанне розных традыцыйных матэрыялаў, прынцыпаў іх спалучэнняў, сілуэта, прыёмаў камплектацыі састаўных частак адзення, народных спосабаў і прыёмаў арнаментацыі, самога арнаменту, упрыгожанняў і інш.

У сучасным адзенні, а таксама пры стварэнні вялікага кола прадметаў быту шырока выкарыстоўваецца традыцыйны на Беларусі матэрыял — лён, які часта ўжываецца з дабаўленнем новых сінтэтычных валокнаў (лаўсану), што значна паляпшае яго эксплуатацыйныя

якасці. Ільняныя тканіны з аднолькавым поспехам ужываюцца для святочнага, паўсядзённага і дзіцячага адзення, а таксама для адзення спецыяльнага прызначэння. Касцюмы і ансамблі з ільну, створаныя ў праектных арганізацыях адзення рэспублікі, атрымалі шырокае прызнанне не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой. Сёння лён перажывае сваё другое нараджэнне.

У сучаснай матэрыяльнай культуры беларускага народа працягваюць жыць і развівацца і іншыя лепшыя народныя традыцыі, якія вытрымалі выпрабаванне часам, захавалі сваю нацыянальную форму і ўзбагаціліся новым сацыялістычным зместам.

Гэта датычыцца ў першую чаргу народнага крою. Творчая думка народа, увасобленая ў мэтазгодных формах адзення, рацыянальных спосабах спалучэння яго частак, умелым ужыванні розных канструктыўных і дэкаратыўных швоў і г. д., знаходзіць шырокі водгук у творчасці сучасных мастакоў адзення.

Прыклады выкарыстання народнага крою пры стварэнні сучаснага адзення мы бачым у творчасці мастакоў адзення Беларускага дома мадэлей, шматлікіх фабрык мастацкіх вырабаў міністэрстваў лёгкай і мясцовай прамысловасці БССР, праектных інстытутаў (Белбыттэхпраект, Белмясцпрампраект) (дадатак, XXXIII—XXXIV). У сучасных мадэлях, якія зроблены гэтымі ўстановамі, сустракаецца традыцыйны крой з гесткамі, палікамі, доўгім рукавом з манжэтамі, своеасаблівымі стаячым і адкладным каўнярамі. Крой сукенкі ў кліны таксама пераклікаецца з традыцыйным кроем андаракаў. Вельмі нагадваюць традыцыйны крой безрукаўкі, якія сучасныя мастакі ўкараняюць у комплекс жаночага адзення (рыс. 21, 22, 24).

Найбольш шырока традыцыі народнага крою выкарыстоўваюцца ў сучасным сцэнічным касцюме. У ім у роўнай меры прадстаўлена ўся разнастайнасць кампанентаў традыцыйнага народнага адзення. Спецыфічнасць прызначэння сцэнічнага касцюма як відовішчнага патрабуе максімальнага набліжэння яго да народных форм. Асабліва гэта неабходна ў тэатральным касцюме, які павінен поўнасцю адпавядаць народнаму, часам з вылучэннем этнаграфічных асаблівасцей: тэрытарыяльных, часавых, сацыяльных і г. д.

У касцюмах для харавых і танцавальных калектываў дадзенае патрабаванне менш жорсткае. Гэта звязана з сучаснай інтэрпрэтацыяй рэпертуару, калі ў народных танцах захоўваюцца толькі асноўныя характэрныя нацыянальныя рысы. Аднак гэта не значыць, што ў касцюмах для танцаў і харавых спеваў дапушчальна вельмі вольнае абыходжанне з элементамі традыцыйнага адзення, эклектычнае змяшанне, акцэнтаванне нехарактэрных яго рыс. Цяпер у некаторых касцюмах, выкананых для народных ансамбляў, заўважаецца захапленне андаракамі ў гарызантальную палоску, колер якіх і агульны каларыт часта падганяюцца пад колеравае афармленне сцэны. Андаракі ў гарызантальную палоску з'яўляюцца этнаграфічнай асаблівасцю цэнтральных і заходніх раёнаў Беларусі, і таму ўзводзіць іх у ступень абавязковага элемента, скажам, для ансамбляў усходніх раёнаў, ці выдаваць іх за адзіную, характэрную для ўсяго беларускага народнага касцюма асаблівасць неапраўдана. Гэта тым больш недапушчальна ў сцэнічным касцюме, які становіцца здабыткам шырокіх мас гледачоў і з'яўляецца своеасаблівым папулярызатарам нацыянальнай культуры, у дадзеным выпадку беларускага народнага адзення. Часта, асабліва за межамі рэспублікі, па яго знешняму выгляду складаецца агульная думка аб культуры адзення народа.

Добры прыклад у гэтых адносінах даюць самадзейныя этнаграфічныя калектывы рада вёсак Беларусі. Поспех іх вызначаецца не толькі высокім выканаўчым майстэрствам, але і арганічным адзінствам рэпертуару і касцюмаў выканаўцаў (рыс. 23). У творчасці і касцюмах народных этнаграфічных калектываў мы бачым беражлівае захаванне і прамы працяг багатых народных традыцый. Іменна яны ў параўнальна дакладным выглядзе даносяць да нас разнастайную і багатую песенна-танцавальную творчасць беларускага народа, прыгажосць і асэнсаванасць народнага адзення.

Жывуць народныя традыцыі і ў сучасным адзенні агульнага прызначэння. Ступень іх выкарыстання вызначаецца разнастайнасцю сучаснага адзення, абумоўленай шматграннасцю відаў працоўнай дзейнасці, вучобы, адпачынку і г. д. У кожным асобным выпадку выкарыстанне традыцыйных элементаў дыктуецца прызначанасцю таго ці іншага віду адзення. Так, калі ў святочным, спартыўным, у адзенні для дзяцей увядзенне традыцыйных элементаў практычна неабмежавана, то ў адзенні для працы, у адзенні спецыяльнага прызначэння гэтыя магчымасці зведзены да мінімуму.

Прыгажосць народнага адзення стваралася шляхам ужывання простых, але разам з тым па-мастацку выразных сродкаў. І перш за ўсё шляхам аздаблення. Прыёмы і спосабы ўпрыгожвання народнага адзення выпрацоўваліся на працягу многіх стагоддзяў і ўвабралі ў сябе мастацкі і практычны вопыт простага працоўнага народа, яго імкненне да ўпрыгожвання навакольнага прадметнага свету. У працэсе шматвяковай жыццёвай практыкі ў народным адзен-







Рыс. 22. Сучаснае жаночае адзенне з выкарыстаннем народных традыцый. Мінская фабрыка мастацкіх вырабаў





Рыс. 23. Сцэнічныя касцюмы:

*а* — Дзяржаўны ансамбль танца БССР пад кіраўніцтвам А. Апанасенкі; *б* — хор калгаса імя Жданава Камянецкага р-на Брэсцкай вобл.; *в* — танцавальны ансамбль «Брастчанка», г. Брэст; *г* — народны хор даярак Варатынскага сельскага клуба калгаса імя Пушкіна Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл.


в


г





Рыс. 24. Вязаныя вырабы з выкарыстаннем народных традыцый

ні быў выпрацаван прынцып адзінства прыгажосці і карысці. Каштоўнасць любога элемента вызначаецца перш за ўсё сваёй ярка выяўленай мэтазгоднасцю. Народ не прымае непатрэбных у быце прадметаў. Голая прыгажосць прадметаў па-за іх прымяняльнасцю ў паўсядзённым жыцці чужая прадметнаму свету простага народа. Гэта асаблівасць традыцыйнага адзення пераклікаецца з патрабаваннямі да сучаснага адзення, якое заклікана задавальняць надзённыя патрабаванні савецкага працоўнага народа, і знаходзіць рознабаковае ўжыванне. Любая састаўная частка сучаснага адзення, як і традыцыйнага, павінна ствараецца, а затым выкарыстоўвацца толькі пасля праверкі яе адпаведнасці сучасным запатрабаванням. Аднак у гэтым пытанні рэцыдывы няправільнай трактоўкі выкарыстання традыцый усё яшчэ маюць месца.

Памылкі ўзнікаюць, на нашу думку, з-за фармальнага падыходу да традыцый, захаплення іх знешнім бокам без пранікнення ва ўнутраны змест. Гэта часта прыводзіць да стварэння эклектычных рэчаў, псеўданароднасці, бадай, адной з горшых праяў некрытычных адносін да традыцый. Не ў меншай меры памылкі ўзнікаюць таксама з-за няўмення адчуць змест сваёй эпохі, імкнення любымі мера-

мі ўціснуць традыцыйныя формы ў рамкі сучасных патрабаванняў, без уліку новых умоў жыцця.

Другі немалаважны бок памылковых тэндэнцый — нігілістычныя адносіны да традыцый народа. Гэта часта прыводзіць да ігнаравання і марнатраўства патэнцыяльных магчымасцей, закладзеных у папярэднім вопыце мас. Партыя вучыць беражліва адносіцца да багатай спадчыны народа, захоўваць і развіваць лепшыя рысы і формы мінулай культуры.

У сучасным адзенні выкарыстоўваецца цэлы рад сродкаў, з дапамогай якіх ствараецца непаўторная своеасаблівасць народнага касцюма. Найбольш значным у гэтым плане з'яўляецца вобразная будова: адпаведнасць, суразмернасць і ўзаемазвязанасць асобных частак народнага адзення, якія ўтвараюць непарыўнае цэлае. Прыўзнятасць вобразнай будовы народнага касцюма, яго аптымістычнасць найбольш прымальныя ў сучаснай школе мадэліравання адзення.

Адным з галоўных сродкаў дасягнення святочнага выгляду народнага адзення з'яўляецца аздабленне яго арнаментам, увядзенне розных дапаўненняў, здымных упрыгожанняў.

Строгасць і прастата ліній сучаснага адзення і сама фактура матэрыялу не заўсёды дапускаюць увядзенне яркіх арнаментальных плям. І таму часцей за ўсё арнамент перапрацоўваецца ў адпаведнасці з колерам адзення, яго кампазіцыйнай будовай. Колер і малюнак традыцыйнага арнаменту спрашчаюцца або з агульнай кампазіцыі выбіраюцца яго асобныя элементы. Арнамент заўсёды падпарадкоўваецца вобразнаму рашэнню касцюма, знаходзіцца з ім у каларыстычным адзінстве і не мае самагоднага значэння.

Арнамент у сучасным адзенні размяшчаецца на гарлавіне, каўняры, рукавах, па нізу сукенкі, жакета, спадніцы і г. д., што, дарэчы, характэрна і для народнага адзення.

Спосабы ўвядзення арнаменту часцей за ўсё таксама традыцыйныя. Гэта вышыўка, вязанне, карункі, аплікацыя і інш. Найбольш распаўсюджана ўпрыгожанне адзення вышыўкай — ручной і машыннай. Ручная як найбольш працаёмкая і дарагая ўжываецца ў асноўным у святочных сукенках і касцюмах, прызначаных для ўрачыстых выпадкаў. Ва ўпрыгожанні сучаснага адзення яна мае свае межы. Нават пры ўсіх перавагах яе перад іншымі відамі аздабленняў ручная вышыўка ў апошні час у масавым пашыве выкарыстоўваецца рэдка і з'яўляецца здабыткам адзення, выкананага метадам індывідуальнага пашыву ці метадам малых серый. Часцей выкарыстоўваецца машынная вышыўка дзякуючы яе таннасці і практычнасці.

Вышыўка не адзіны шлях арнаментацыі адзення. Вялікія магчымасці арнаментацыі закладзены ў спосабе вырабу тканін пры дапамозе ткацтва і набойкі. Так, у сучасным адзенні шырока выкарыстоўваюцца тканіны жакардавага перапляцення, знешні выгляд якіх супадае з фактурай распаўсюджаных у народным ткацтве тканін, выкананых шматнітовай тэхнікай. У адной з апошніх калекцый Беларускага дома мадэлей былі паказаны касцюмы і ансамблі, у якіх спрабавалася прамое выкарыстанне рэчаў народнага вырабу (посцілак і інш.) (дадатак, XVI). Такога ж плана работа была праведзена і на Мінскай фабрыцы мастацкіх вырабаў. Заслугоўвае асаблівай увагі ініцыятыва мастакоў гэтай фабрыкі, якія зрабілі спробу стварыць касцюмы з народных тканін. З гэтай мэтай быў наладжан дзелавы кантакт з фабрыкай у г. Слуцку, якая спецыялізавалася на вырабе тканін па народных матывах. У выніку жывога кантакту стаў магчымым выраб тканін па ўжо гатовых эскізах адзення з выкарыстаннем традыцый беларускага народнага ткацтва. Гэта каштоўнае пачынанне павінна быць узята на ўзбраенне ўсімі праектнымі арганізацыямі адзення.

Побач з арнаментацыяй у традыцыйным адзенні шырока ўжываліся рознага роду здымныя ўпрыгожанні. У сучасным адзенні мы назіраем тую ж карціну. Праўда, у наш час асартымент упрыгожанняў значна пашырыўся.

Спартыўная прастата сучаснага адзення, абмежаванасць аздабленняў, адсутнасць празмернасцей у дэталях выклікаюць неабходнасць у здымных упрыгожаннях. Здымныя ўпрыгожанні як прадметы прыкладнога мастацтва робяцца па агульных заканамернасцях гэтага віду мастацтва. Перш за ўсё маецца на ўвазе лагічнасць і прастата форм, гармонія каляровых спалучэнняў, адпаведнасць формы і матэрыялу і інш. Сучасныя здымныя ўпрыгожанні ў тэхнічных і мастацкіх адносінах ствараюцца ў традыцыях творчасці беларускага народа ў гэтай галіне. Як станоўчую з'яву трэба адзначыць тое, што мастакі пераадольваюць імкненні да падробкі пад дарагія і высакародныя металы.

У творчасці беларускіх мастакоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва мы бачым спрыяльны ўплыў лепшых народных традыцый: своеасаблівае адраджэнне многіх, вядомых са старажытных часоў матэрыялаў, такіх, як дрэва, метал, шкло, кераміка, а таксама традыцыйных беларускіх матэрыялаў — бяросты, рогу, моранага дубу, саломкі, янтару і інш. Ужыванне разнастайных матэрыялаў дазваляе ствараць розныя па форме і дэкаратыўнаму вырашэнню ўпрыгожанні, у якіх «старыя» матэрыялы і




Рыс. 25. Сучасныя здымныя ўпрыгожанні жаночага касцюма:

*а* — з дрэва, металу (вырабы народных умельцаў); *б*, *в* — кулоны з янтару і сінтэтычных смол у спалучэнні з бронзай — «ложная скань» (вырабы народных умельцаў)

тэхніка перажываюць другое нараджэнне і арганічна ўваходзяць у сучаснасць (рыс. 25).

Здымныя ўпрыгожанні ў сучасным адзенні выконваюць дваякую функцыю — утылітарную і эстэтычную ці тую і другую разам. Так, дэкаратыўныя гузікі, брошкі, запінкі, спражкі і іншыя побач з чыста утылітарнымі функцыямі нясуць і немалую долю эстэтычнай нагрузкі. У той жа час вядомы цэлы рад здымных упрыгожанняў, якія выконваюць чыста эстэтычную функцыю,— кулоны, брошкі, падвескі, бранзалеты, завушніцы, пацеркі і г. д.

У залежнасці ад вобразнага рашэння таго ці іншага касцюма здымныя ўпрыгожанні могуць

адыгрываць падпарадкаваную ці галоўную ролю. Так, часам у святочных сукенках дэкаратыўныя брошка, падвеска або каралі з'яўляюцца асноўным кампазіцыйным цэнтрам. Здымныя ўпрыгожанні шырока ўжываюцца і ў паўсядзённым адзенні, якому яны надаюць прыгожы выгляд.

Ужыванне здымных упрыгожанняў неадздзельна ад густу, ведання асноўных правіл іх нашэння, таму ў залежнасці ад умоў эксплуатацыі адзення і яго прызначэння змяняецца і характар ужывання ўпрыгожанняў. Упрыгожанні, якія падыходзяць да ўрачыстых або святочных абставін і вылучаюцца прыгажосцю і багаццем матэрыялу, у рабочых дзелавых абставінах будуць выглядаць крыклівымі і выпадаць з агульнага настрою.

У гэтых адносінах добры прыклад для пераймання мы знаходзім у народным быце. Простая сялянка ніколі не надзене яркага адзення ці ўпрыгожання, калі яна ідзе на работу ў поле або занята ў дамашняй гаспадарцы. І ў той жа час як яна змяняецца ў святочныя дні! Асабліва моцнае ўражанне пакідае беларускае народнае вясельнае адзенне, калі простая сялянка паказвае ва ўсёй прыгажосці сваё рукадзелле, уменне ствараць прыгажосць падручнымі сродкамі, з простых матэрыялаў.

Для сучаснай сацыялістычнай эпохі характэрны стыль адзення, агульны для ўсіх слаёў грамадства. У дзяржаве, дзе ўсё падначалена інтарэсам працоўных класаў, стыль адзення вызначаецца гэтымі ж інтарэсамі. Адным з асноўных патрабаванняў нашага стылю з'яўляецца прастата і зручнасць адзення, як рабочага, так і святочнага. Хістанні ў відах крою (ад шырокага да вузкага, ад доўгага да кароткага) і расфарбоўцы тканін (ад яркіх каляровых да пастэльных аднатонных) не кранулі асноўнага патрабавання, якое прад'яўляецца да савецкіх мадэльераў,— зручнасці адзення. Гэта ў роўнай меры адносіцца да формы абутку, галаўных убораў і г. д. Сучасная мода прапануе лёгкія, дынамічныя і зручныя формы мужчынскага, жаночага і дзіцячага адзення, якія адпавядаюць нашаму спартыўнаму і касмічнаму веку.

Адзінства адзення сельскага і гарадскога насельніцтва абумоўліваецца агульнасцю інтарэсаў двух працоўных класаў нашай краіны. Рост культурнага ўзроўню ў адзіных рамках і нормах для ўсёй дзяржавы, палітычнае раўнапраўе, аднолькавае забеспячэнне ўсяго насельніцтва прамысловымі таварамі айчыннай і замежнай вытворчасці — вось той трывалы падмурак, на якім базіруецца адзінства адзення вёскі і горада.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

На падставе матэрыялаў, сабраных для «Рэгіянальнага гісторыка-этнаграфічнага атласа Украіны, Беларусі і Малдавіі» па Беларусі, якія апісаны і прааналізаваны ў дадзенай працы, выразна прасочваецца эвалюцыя многіх з'яў, звязаных з народным адзеннем. Выходзячы з гэтага, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што ў беларускага сялянства к сярэдзіне XIX ст. скλаліся даволі ўстойлівыя і характэрныя комплексы мужчынскага і жаночага адзення, асобныя часткі і элементы якога бяруць пачатак у розныя гістарычныя эпохі.

Этнаграфічнае картаграфаванне дае наглядную карціну распаўсюджання тыпаў адзення, крою, арнаменту і да т. п. на тэрыторыі Беларусі, дазваляе высветліць этнаграфічныя асаблівасці беларускага адзення наогул і адзення асобных раёнаў Беларусі ў прыватнасці.

Беларускі мужчынскі і жаночы касцюм характарызуецца значным адзінствам на ўсёй тэрыторыі. Фарміравалася гэта асаблівасць пад непасрэдным уплывам пэўных сацыяльных і палітычных фактараў.

У перыяд сярэдневякоўя пад уплывам пануючай польска-літоўскай вярхушкі ў комплексе беларускага жаночага адзення трывала засвойваюцца пашытая паясная спадніца і безрукаўнае адзенне тыпу гарсэта. Гэтыя новыя прадметы вызначылі своеасаблівасць беларускага жаночага касцюма, якая адрознівае яго ад комплексу адзення іншых усходнеславянскіх народаў і збліжае з адзеннем палякаў і літоўцаў. Новыя прадметы адзення арганічна спалучаліся са старадаўнімі, якія мелі адзіныя гнасеалагічныя карэнні з рускімі і ўкраінскімі, што ў сваю чаргу адрознівала беларускі комплекс ад заходніх суседзяў — палякаў і літоўцаў.

Захоўваючы ў сваёй аснове адзіныя рысы, народнае беларускае адзенне ў XIX — пачатку XX ст., як паказвае картаграфаванне, не было аднародным на ўсёй беларускай тэрыторыі. Многімі асаблівасцямі касцюма выдзяляюцца вялікая тэрыторыя на паўднёвым захадзе — Палессе, раёны Падняпроўя з усходняй Віцебшчынай і тэрыторыя, якая ахоплівае сучасную заходнюю Віцебшчыну і поўнач Гродзеншчыны.

У адзенні кожнай з пералічаных абласцей спалучаюцца і старажытныя, і больш сучасныя рысы.

Лакалізацыя асаблівасцей у адзенні пэўных раёнаў гавораць аб тым, што яны не былі выпадковай з'явай, а маюць пэўную гістарычную і этнічную аснову.

На фарміраванне комплексаў жаночага і мужчынскага адзення ўплывалі сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё грамадства і сувязі з іншымі народамі.

Значныя змены ў беларускім народным адзенні адбыліся ў канцы XIX — пачатку XX ст., што было выклікана пранікненнем у беларускую вёску капіталістычных адносін.

Масавае адыходніцтва, рост класавай дыферэнцыяцыі ўнеслі значныя змены ў матэрыял, у крой адзення, у тыпы галаўных убораў і абутку. Гэтыя змены раней за ўсё праяўляліся ў адзенні маладога пакалення, тады як старыя доўга прытрымліваліся архаікі.

Афарбоўка і набойка тканін хатняга вырабу, каляровыя ўзорыстыя куплёныя тканіны значна змянілі каляровую гаму народнага беларускага адзення. Побач з белым традыцыйным колерам шырока вядомым становіцца чырвоны розных адценняў. Белыя нядубленыя кажухі выцясняюцца дубленымі паўкажушкамі чырванаватага колеру. Выходзяць са штодзённага ўжытку белыя ручніковыя галаўныя ўборы. На змену ім прыходзяць хусткі рознага памеру, якасці і расфарбоўкі. Знікаюць мужчынскія лямцаватыя шапкі-магеркі, суконныя белыя світы з фалдамі і г. д.

Змены ў традыцыйным сялянскім адзенні ў дарэвалюцыйны перыяд не атрымалі маса-

вага пашырэння і не мелі прынцыповага характару, таму што адбыліся ў асноўным у месцах масавага адыходніцтва і раёнах, размешчаных недалёка ад гарадоў і чыгуначных станцый. Паўнатуральны характар велізарнай большасці сялянскіх гаспадарак доўгі час садзейнічаў захаванню даматканіны і, значыць, традыцыйнага адзення.

Вялікія змены ў адзенні беларускага селяніна адбыліся пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, якая карэнным чынам змяніла яго жыццё. Знікненне з ужытку даматканіны прывяло да поўнай замены матэрыялу, відаў адзення і тыпаў яго крою, абутку і галаўных убораў.

Сучаснае адзенне сельскага насельніцтва мала чым адрозніваецца ад гарадскога. Рост культурнага ўзроўню сяла, забеспячэнне вёскі аднолькавымі з горадам прамысловымі таварамі стварае адзінства ў адзенні двух раўнапраўных класаў нашай краіны.

У той жа час гарадскі касцюм засвойвае некаторыя традыцыйныя рысы сялянскага касцюма, чаму садзейнічае праца мастакоў-мадэльераў і розных устаноў, якія звязаны з вырабам гатовага адзення. У выніку такога ўзаемаўплыву ствараецца сучасны касцюм, які задавальняе ўсе слаі насельніцтва. Лепшыя ўзоры адзення, выкананыя па народных традыцыях, выкарыстоўваюцца прафесійнымі і самадзейнымі артыстычнымі калектывамі, становяцца вядомымі далёка за межамі нашай краіны і аказваюць пэўны ўплыў на культуры іншых народаў.

Далейшае вывучэнне народнага адзення звязана з параўнаўчым аналізам картаграфаванага матэрыялу па цэламу рэгіёну, які ўключае народы рознага паходжання. Такі аналіз дазволіць зрабіць больш глыбокія вывады этнагенетычнага плана, пралье святло на многія, зараз яшчэ спрэчныя і незразумелыя пытанні паходжання асобных відаў адзення, яго крою і назваў.

Важную ролю ў рашэнні пытанняў старажытных культурных узаемасувязей розных народаў павінны адыграць матэрыялы па каларыстыцы і структурна-мастацкіх асаблівасцях адзення.

Тэксты напісалі: Л. А. Малчанава — Уводзіны, раздзелы «Жаночы касцюм» (параграфы «Характарыстыка агульнага комплексу і яго састаўных частак», «Асноўныя лакальныя асаблівасці жаночага адзення»), «Адзенне іншых нацыянальнасцей Беларусі», Заключэнне; Л. А. Малчанава і Ю. Г. Сяргеенка — «Сучаснае адзенне сельскага насельніцтва Беларусі»; Г. М. Курыловіч і Г. І. Дулеба — раздзел «Мужчынскі касцюм»; Г. М. Курыловіч і В. М. Бялявіна—раздзел «Верхняе адзенне і абутак» (Г. М. Курыловіч — верхняе адзенне, В. М. Бялявіна — абутак); В. М. Бялявіна — параграф «Галаўныя ўборы» ў раздзеле «Жаночы касцюм».

Карты падрыхтавалі: па жаночаму касцюму — Л. А. Малчанава, па жаночых галаўных уборах і абутку — В. М. Бялявіна, па мужчынскаму — Г. І. Дулеба, па верхняму адзенню— Г. М. Курыловіч.

Малюнкі зроблены С. Ц. Гунько, Ф. А. Есаковай, фотаздымкі — Д. І. Мазанікам, В. П. Жырко, Ю. Г. Сяргеенкам.



I. Сяляне ў традыцыйных касцюмах (Пінскі п. Мінскай губ.)



II. Сялянкі ў традыцыйных касцюмах (Слуцкі п. Мінскай губ.)



III. Сялянкі ў традыцыйных касцюмах:

злева — в. Ванялевічы Капыльскага р-на Мінскай вобл.; справа — Бабруйскі п. Магілёўскай губ.



IV. Сялянкі ў традыцыйных касцюмах:

злева — Слуцкі п. Мінскай губ.; справа — Пінскі п. Мінскай губ.



V. Сялянкі ў традыцыйных касцюмах:

злева — в. Масток Магілёўскай губ.; справа — Клімавіцкі п. Магілёўскай губ.



VI. Сялянка ў традыцыйным касцюме з наміткай
(в. Азярніца Лунінецкага р-на Мінскай вобл.)



VII. Сялянка ў традыцыйным касцюме з панёвай
(в. Неглюбка Веткаўскага р-на Гомельскай вобл.)



VIII. Сялянкі ў традыцыйных касцюмах:

злева — в. Рудня Бабруйскага п.; справа — хутар Завашчага Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл.



IX. Традыцыйныя тыпы беларускай жаночай кашулі:

*а, б, в* — в. Покаць Чачэрскага р-на Гомельскай вобл.; *г* — в. Морач Клецкага р-на Мінскай вобл.




X. Традыцыйныя тыпы беларускай жаночай кашулі:

*а* — в. Аніскавічы Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.; *б* — в. Акропна Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл.; *в* — Віцебская вобл.; *г* — Полацкі р-н Віцебскай вобл.




XI. Жаночае плечавое адзенне 30-х гадоў XX ст.:

*а* — «плечніца», в. Мілаславічы Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.; *б* — «чэхлік», в. Старыя Дзятлавічы Гомельскага р-на Гомельскай вобл.; *в* — «кофтачка», в. Бродніца Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.; *г* — «каптан», в. Морач Клецкага р-на Мінскай вобл.

*а*



*б*



*в*



*г*



XII. Тыпы паяснога жаночага адзення:

*а* — бурка, в. Ляхаўцы Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл.; *б* — андарак, в. Юндзілавічы Пружанскага р-на Брэсцкай вобл.; *в, г* — андаракі, в. Хідры Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.




XIII. Тыпы паяснога жаночага адзення:

*а* — андарак, в. Забалацце Дзяржынскага р-на Мінскай вобл.; *б* — андарак, в. Покаць Чачэрскага р-на Гомельскай вобл.; *в* — андарак, в. Сорагі Слуцкага р-на Мінскай вобл.; *г* — пасаманнік, в. Радзеж Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл.




XIV. Тыпы паяснога жаночага адзення:

*а, б* — андаракі, в. Засецце Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.; *в, г* — андаракі, в. Асташын Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.




XV. Тыпы паяснога жаночага адзення:

*а* — фартух парцяны, в. Рагозна Брэсцкага р-на Брэсцкай вобл.; *б* — спадніца ў ладкі, в. Морач Клецкага р-на Мінскай вобл.; *в* — спадніца суконная, в. Юндзілавічы Пружанскага р-на Брэсцкай вобл.; *г* — спадніца, в. Морач Клецкага р-на Мінскай вобл.



XVI. Тыпы паяснога жаночага адзення:

*а* — андарак, в. Родня Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.; *б* — андарак, в. Званец Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.; *в, г, д, е* — андаракі, в. Валынцава Горацкага р-на Магілёўскай вобл.




XVII. Тыпы андаракаў з прышыўным кабатам:

*а* — в. Казусеўка Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.; *б* — в. Купяцічы Пінскага п. Мінскай губ.; *в*, *г* — с. Лабанаўка Чэрыкаўскага п. Магілёўскай губ.




XVIII. Тыпы палатняных фартухоў:

*а, б* — фартухі, Аршанскі р-н Віцебскай вобл.; *в, г* — фартухі, в. Мазалава Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл.




XIX. Тыпы палатняных фартухоў:

*а, б* — в. Аніскавічы Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.; *в, г* — в. Хідры Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.




XX. Тыпы палатняных фартухоў:

*а, б* — фартухі, в. Хідры Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.; *в, г, д* — фартухі, в. Мілаславічы Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.



XXI. Тыпы жаночых безрукавак:

зверху — кабат, в. Чудзін Слуцкага п. Мінскай губ.; знізу — гарсэт, Ігуменскі п. Мінскай губ.




XXII. Тыпы жаночых безрукавак:

*а* — гарсэт з чырвонага сукна, в. Старое Сяло Рагачоўскага р-на Магілёўскай вобл.; *б*, *в*, *г* — шнуроўка, в. Азярніца Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.




XXIII. Тыпы жаночых безрукавак:

*а, б* — каптан, в. Славень Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.; *в, г* — гарсэт з чырвонага палатна, в. Пагост Салігорскага р-на Мінскай вобл.




XXIV. Тыпы мужчынскіх сарочак:

*а* — Дзісенскі п. Віленскай губ.; *б* — в. Бабцы, Барысаўскі п.; *в* — гімнасцёрка з даматканага палатна, Мазырскі п. Мінскай губ.; *г* — Магілёўская губ.




XXV. Тыпы мужчынскіх сарочак:

*а* — Мазырскі п. Мінскай губ.; *б* — Слуцкі п. Мінскай губ.; *в* — Брэсцкі п. Гродзенскай губ.; *г* — Магілёўская губ.



XXVI. Сяляне ў традыцыйных касцюмах (Мазырскі п. Мінскай губ.)



XXVII. Сялянкі ў традыцыйных касцюмах:

злева — Слуцкі п. Мінскай губ.; справа — в. Радзеж Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл.




XXVIII. Тыпы світ:

*а* — латуха, в. Арэхава Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл.; *б* — з «фалдамі», в. Яроміна Гомельскага р-на Гомельскай вобл.




XXIX. Тыпы світ:

*а* — з падразнымі бачкамі, в. Пагост Салігорскага р-на Мінскай вобл.; *б* — бурка, в. Пескі Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл.




XXX. Тыпы кажухоў:

*а* — з «вусам», в. Загор'е Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.; *б* — «казачына», в. Чудзенічы Лагойскага р-на Мінскай вобл.




XXXI. Тыпы кажухоў:

*а* — в. Забалацце Чавускага р-на Магілёўскай вобл.; *б* — в. Красін Браслаўскага р-на Віцебскай вобл.; *в* — в. Навасёлкі Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.; *г* — в. Плёсы Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл.




XXXII. Тыпы паясоў:

*а* — тканы, Слуцкі п. Мінскай губ.; *б* — тканы, Мазырскі п. Мінскай губ.; *в* — тканы, Кобрынскі п. Гродзенскай губ.; *г* — вязаны, Мазырскі п. Мінскай губ.; *д* — плецены, Дзісенскі п. Віленскай губ.; *е* — тканы, Брэсцкі п. Гродзенскай губ.; *ж* — тканы, Пінскі п. Мінскай губ.; *з* — тканыя, Быхаўскі п. Магілёўскай губ.





XXXIII. Сучасныя жаночыя касцюмы з выкарыстаннем народнага арнаменту. Мінская фабрыка мастацкіх вырабаў




XXXIV. Сучаснае жаночае адзенне з выкарыстаннем народных традыцый:

*а, б, в* — Мінскі дом мадэлей; *г* — Гродзенская фабрыка мастацкіх вырабаў

а



б



в



г



XXXV. Сучасныя жаночыя касцюмы з выкарыстаннем традыцыйнага матэрыялу і арнаменту:

*а, б* — Мінскі дом мадэлей; *в* — Мінская фабрыка мастацкіх вырабаў; *г* — Слуцкая фабрыка мастацкіх вырабаў



а



б

XXXVI. Сучасныя жаночыя касцюмы з выкарыстаннем традыцыйнага матэрыялу і арнаменту:

*а* — Мінскі дом мадэлей; *б* — распрацавана мастаком Л. І. Багачовай

а



б



в



г



XXXVII. Сучасныя жаночыя касцюмы з выкарыстаннем традыцыйнага крою (палікі) і арнаменту:

*а* — Мінская фабрыка мастацкіх вырабаў; *б* — Гродзенская фабрыка мастацкіх вырабаў; *в* — Гродзенская фабрыка мастацкіх вырабаў; *г* — Бабруйская фабрыка мастацкіх вырабаў





XXXVIII. Сучасныя жаночыя касцюмы. Гродзенская фабрыка мастацкіх вырабаў





XXXIX. Сучасныя мужчынскія касцюмы. Мінскі дом мадэлей

# ЗМЕСТ


УВОДЗІНЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

ЖАНОЧЫ КАСЦЮМ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7

ХАРАКТАРЫСТЫКА АГУЛЬНАГА КОМПЛЕКСУ І ЯГО САСТАЎНЫХ ЧАСТАК 7

ГАЛАЎНЫЯ ЎБОРЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29

АСНОЎНЫЯ ЛАКАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЖАНОЧАГА АДЗЕННЯ . . . . . . 38

МУЖЧЫНСКІ КАСЦЮМ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45

АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА . . . . . . . . . . . . . . . . 45

ГАЛАЎНЫЯ ЎБОРЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54

ВЕРХНЯЕ АДЗЕННЕ І АБУТАК . . . . . . . . . . . . . . . . 59

АДЗЕННЕ ІНШЫХ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ У БЕЛАРУСІ . . . . . . . 74

СУЧАСНАЕ АДЗЕННЕ СЕЛЬСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ 79

ЗАКЛЮЧЭННЕ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94



На белорусском языке. БЕЛОРУССКАЯ НАРОДНАЯ ОДЕЖДА. Издательство «Наука и техника». Минск, Ленинский проспект, 68.

Рэдактар Л. А. Шрубок. Мастак Я. Ф. Леўчанка. Мастацкі рэдактар Л. І. Усачоў. Тэхнічны рэдактар І. В. Валахановіч. Карэктар Н. М. Тарасевіч.

Друкуецца па пастанове РВС АН БССР. АТ 11136. Здадзена ў набор 21.IX-74 г. Падпісана да друку 10.VII-75 г. Фармат 84×108$^1/_{16}$. Папера друк. мел. Друк. арк. 6,0+2,5 (каляровыя ілюстрацыі). Ум. друк. арк. 10,08+4,2 (каляровыя ілюстрацыі). Уч.-выд. арк. 14,1. Выд. зак. 132. Друк. зак. 1153. Тыраж 10 000 экз. Цана 2 р. 57 к. на двунітцы, 2 р. 17 к. на каленкоры. Друкарня імя Францыска (Георгія) Скарыны выдавецтва «Навука і тэхніка» АН БССР і Дзяржкамітэта СМ БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Ленінскі праспект, 68. Каляровыя ілюстрацыі надрукаваны на Мінскім паліграфкамбінаце імя Я. Коласа Дзяржкамітэта СМ БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Красная, 23.

2 р. 57 к.

БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ АДЗЕННЕ